WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

9 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
СУБОТА
№ 198
(26806)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

Дапамогі, пенсіі, паслугі

Адрасная сацыяльная дапамога і варыянты сацыяльных паслуг, асаблівасці вылічэння стажу і індывідуальнага каэфіцыента, пенсійныя надбаўкі і павышэнні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны Каралёвай.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 13 кастрычніка** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 92 і 232 38 21**. Нумар для папярэдніх пытанняў — **287 17 57**.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АДЗНАЧАЕ ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАЙ І КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВОЙ

Паміж дзяржавай і каталіцкай царквой склаліся добрыя адносіны, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы з папскім легатам кардыналам Ёзафам Томкам.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь выбудоўвае добрыя адносіны з каталіцкай царквой. «Не помню, каб у нас былі супярэчнасці паміж канфесіямі, дзяржавай і канфесіямі. Мы стараемся падтрымліваць мір, таму што гэта аснова стабільнасці дзяржавы. А без стабільнасці не можа быць ні дабрабыту, ні працвітання. У гэтым сэнс усёй нашай палітыкі і ўзаемаадносін нашага кіраўніцтва, уладаў, у тым ліку і з каталіцкай царквой». Прэзідэнт запэўніў папскага легата, што каталіцкая царква можа не хвалявацца за сітуацыю, якая складваецца вакол яе ў Беларусі. «Мая палітыка абсалютна адкрытая ў адносінах да каталіцкай царквы».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў перадаць падзяку Папу Рымскаму Бенядыкту XVI за тое, што ён прыслаў у Беларусь «свайго бліжэйшага паплечніка і саратніка». «Спадзяюся, што ў вас застануцца добрыя ўражанні аб нашай краіне і нашым народзе, — адзначыў ён. — Хацеў бы пажадаць працвітання вашай царкве, і каб мы ніколі не мелі ніякіх праблем, як не маем іх і цяпер з каталіцкай царквой, таму што сотні тысяч нашых суайчыннікаў належаць да гэтай канфесіі». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на тэрыторыі былога Савецкага Саюза Беларусь займае другое месца пасля Літвы па колькасці вернікаў-католікаў. «Гэта аб многім сведчыць, таму што сотні тысяч нашых людзей — вернікі. Нашы католікі вельмі прынцыповыя, сумленныя і вельмі веруючыя людзі. Урад і я абавязаны ўлічваць гэты фактар», — сказаў ён, дадаўшы, што дзяржава выбудоўвае добрыя адносіны з каталіцкай царквой. Звяртаючыся да Ёзафа Томкі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Прашу перадаць майму добраму, я спадзяюся, сябру, Папу Рымскаму Бенядыкту XVI самыя лепшыя пажаданні. Я вельмі добра помню ўсе моманты нашай сустрэчы і нашу размову. Усе падарункі Папы Бенядыкта XVI знаходзяцца на самым бачным месцы, і хто б ні заходзіў да мяне ў дом, яны бачаць гэтыя падарункі».

У сваю чаргу папскі легат перадаў найлепшыя пажаданні Папы Рымскага Прэзідэнту Беларусі і ўсяму беларускаму народу. «Адчуваю, што прыехаў у цудоўную сям'ю», — сказаў ён. Ёзаф Томка адзначыў, што ў яго вельмі добрая нагода для паездкі — святкаванне 300-годдзя асвячэння Мінскага кафедральнага сабора імя Прасвятой Дзевы Марыі. Гэта мерапрыемства запланавана на 9 кастрычніка. «Я вельмі задаволены тым, што знаходжуся тут у якасці спецыяльнага прадстаўніка Папы Рымскага».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прыхаджан Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь з 300-годдзем асвячэння мінскага Архікафедральнага касцёла ў гонар Прасвятой Дзевы Марыі

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння гэты выдатны гісторыка-культурны помнік дзякуючы сумесным намаганням дзяржавы і Рымска-каталіцкай царквы адрадзіўся ва ўсёй прыгажосці, уражвае цудоўнымі архітэктурнымі формамі і ўнікальнымі фрэскамі.

У віншаванні падкрэсліваецца, што касцёл стаў сапраўдным культурным цэнтрам, дзе актыўна ажыццяўляецца дабрачынная і асветніцкая дзейнасць, штогод адбываецца шмат цікавых падзей. Яго свяшчэнна-служыцелі і прыхаджане робяць важкі ўнёсак ў абагачэнне духоўных традыцый нашага народа, праводзяць вялікую сацыяльную работу.

«Няхай і надалей Архікафедральны касцёл дапамагае людзям усведамляць сваю сутнасць, выхоўваць пачуцці міласэрнасці і любові, захвочвае іх самааддана служыць нашай Радзіме», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім прыхаджанам Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь здароўя, шчасця, дабрабыту і поспехаў ва ўсіх справах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«СЛУХАЙ, ШТО Я ТАБЕ СКАЖУ, МАЛАДАЯ...»

Вяселле ў Хойніках.

З ПАНЯДЗЕЛКА ЯШЧЭ ПАХАЛАДАЕ І ПРОЙДЗЕ ПЕРШЫ МОКРЫ СНЕГ

У выхадныя на тэрыторыі Беларусі захаваецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

У суботу і нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны ўначы замаразкі да мінус 5 градусаў, месцамі — 1—3 цяпла, удзень — 8—13. Ужо з панядзелка надвор'е сапсуецца. Праз тэрыторыю Беларусі пачнуць рухацца актыўныя атмасферныя франты, услед за якімі да нас будзе паступаць больш халоднае арктычнае паветра. Тэмпература ўначы ў панядзелак ад плюс 3 да мінус 3, удзень — 3—10 цяпла. Уначы на поўначы краіны, а ўдзень месцамі кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, магчымы мокры снег.

У аўторак, сераду і чацвер стане яшчэ халадней. Уначы будзе падмарожваць да 0 — мінус 5, удзень — толькі 0—7 цяпла. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галаледзіца, месцамі слабы галалёд. Як пажартаваў Дзмітрый Рабаў: «Калі да гэтага часу нехта з аўтааматараў не памяняе на сваіх машынах «гумавы абутак» на зімовы фасон — мы невінаватыя».

Сяргей КУРКАЧ.

Даты

«ХУТКАСЦЬ, НАДЗЕЙНАСЦЬ, ДАСТУПНАСЦЬ» — ГЭТА НЕ ПРОСТА СЛОВЫ

Сёння, 9 кастрычніка, Сусветны дзень пошты. Да таго ж якраз у гэтыя дні рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» адзначае сваё 15-годдзе. Узрост не такі ўжо і сур'ёзны. Усё ж астатняе...

РУП «Белпошта» — вытворча-тэхналагічны комплекс з 6 абласных філіялаў, філіяла «Вузел спецсувязі», вытворчасці «Мінская пошта» і аўтатранспартнага прадпрыемства, 117 раённых вузлоў паштовай сувязі, 3744 аддзяленняў, амаль 3000 з якіх знаходзяцца ў вёсках. Для забеспячэння іх бесперабойнай работы функцыянуюць міжабласныя, міжраённыя і ўнутрыгарадскія маршруты, па якіх курсіруе каля 1300 аўтамабіляў. Агульная колькасць працаўнікоў — каля 30 тысяч чалавек.

СТАР. 3

Віншаванне з канверта

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВА УКРАІНЕ ВЫРАШЫЛІ ПАДОЎЖЫЦЬ ПАЎНАМОЦТВЫ ДЭПУТАТАЎ І ПРЭЗІДЭНТА

Дэпутаты ад Партыі рэгіёнаў, Блока Літвіна і Камуністычнай партыі зарэгістравалі ў Вярхоўнай Радзе праект зменаў канстытуцыі Украіны, паведамляе «Украінская праўда».

Паводле прапанаваных паправак, тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў Вярхоўнай Рады і мясцовых радаў, а таксама прэзідэнта краіны будзе павялічаны да пяці гадоў. Пад дзеянне паправак патрапяць і дзейныя дэпутаты і чыноўнікі. Датай правядзення чарговых парламенцкіх выбараў аўтары законапраекта прапануюць прызначыць апошнюю нядзелю кастрычніка пятага года паўнамоцтваў Вярхоўнай Рады. Датай правядзення выбараў прэзідэнцкіх — апошнюю нядзелю сакавіка пятага года паўнамоцтваў прэзідэнта.

ЛАТВІЙСКУЮ ТЭЛЕКАМПАНІЮ АШТРАФАВАЛІ ЗА ІНТЭРВ'Ю НА РУСКАЙ МОВЕ

У Латвіі Нацыянальная рада па электронных СМІ вырашыла аштрафаваць тэлекампанію LNT за спробу ўзяць у міністра інтэрв'ю на рускай мове. Пра гэта паведамляе DELFI.

Прадстаўнікі рады прыйшлі да высновы, што было парушана права чыноўніка вольна выкарыстоўваць латышскую мову, якое гарантавана Законам пра дзяржаўную мову. Тэлекампаніі прызначылі максімальна магчымы штраф — 1500 латаў (каля трох тысяч долараў).

Інцыдэнт з удзелам міністра транспарту Каспара Герхардса, нагадаем, адбыўся 31 жніўня. Чыноўнік быў запрошаны на здымкі праграмы «Без цэнзуры». На пачатку перадачы вядучы Андрэй Мамыкін папрасіў госця перайсці на рускую мову. Той адмовіўся.

ВІЦЭ-СПІКЕР ПАРЛАМЕНТА КНДР УПЕРШЫНЮ АФІЦЫЙНА РАСКРЫЎ ТАЯМНІЦУ СПАДЧЫННІКА

Высокапастаўлены паўночнакарэйскі чыноўнік у пятніцу пацвердзіў АР Television News, што малодшы сын лідара КНДР Кім Чэн Іра неўзабаве зойме яго месца. Як адзначыў у інтэрв'ю намеснік старшыні Вярхоўнага Народнага сходу Ян Хен Соб, жыхары Паўночнай Карэі з гонарам будуць служыць «маладому генералу» Кім Чэн Уну як свайму лідару.

«Наш народ ганарыцца тым, што вялікія лідары з пакалення ў пакаленне робяць яго шчаслівым... Нашаму народу выпаў гонар служыць вялікаму старшыні Кім Чэн Іру і вялікаму лідару Кім Ір Сэну. Цяпер мы будзем мець гонар служыць маладому генералу Кім Чэн Уну», — цытуе чыноўніка АР. Такім чынам, 28-гадовы Кім Чэн Ун стане трэцім прадстаўніком сям'і, якая кіруе Паўночнай Карэяй — краінай з насельніцтвам 24 млн чалавек. Яго дзед — Кім Ір Сэн — прыйшоў да ўлады ў 1948 годзе. Паводле існуючай у КНДР ідэалогіі, рэвалюцыю нельга завяршыць на працягу аднаго пакалення, таму кіраўніцтва краінай павінна перадавацца ў спадчыну.

РАСІЯ ЗАБАРАНІЛА ЎВОЗ МЯСА З БОЛЬШАСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ УКРАІНЫ

Рассельгаснагляд рашэннем ад 7 кастрычніка забараніў увоз на тэрыторыю Расіі прадукцыі з чатырох украінскіх заводаў: «Балцкага малакаканцэрвавага камбіната дзіцячых прадуктаў», а таксама Шэпетаўскага, Трасцянецкага і Ватуцінскага мясакамбінатаў. Пра гэта паведамляецца на сайце ведамства.

Як адзначае «Інтэрфакс», зараз у Расію забаронены ўвоз прадукцыі 12 з 15 мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў Украіны, якім раней быў дазволены экспарт у краіну. З малочных прадпрыемстваў увоз прадукцыі дазволены 10 з 14.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА Ў ЧАС ВІЗІТУ Ў КНР НАВЕДАЕ ЭКСПАЗІЦЫІ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ НА СУСВЕТНАЙ ВЫСТАЎЦЫ «ЭКСПА-2010»

Напярэдадні рабочага візіту ў Кітайскую Народную Рэспубліку, які адбудзецца 9—11 кастрычніка, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю прадстаўнікам цэнтральных сродкаў масавай інфармацыі Кітая.

Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з журналістамі Цэнтральнага тэлебачання Кітая, Дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва «Сіньхуа» і газеты «Жэньмінь жыбаа».

Аляксандр Лукашэнка адказаў амаль на паўтара дзясятка пытанняў, у тым ліку асабістыя. Пытанні датычыліся як розных аспектаў беларуска-кітайскіх адносін, так і ў цэлым знешняй і ўнутранай палітыкі ў Беларусі.

Адказваючы на пытанне аб сваіх чаканнях ад маючага адбыцца візіту, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Вельмі чакаю, што Кітай пасля гэтага хутчэй пачне інвеставаць, у большым аб'ёме ісці ў нашу краіну, у нашу эканоміку, і, думаю, ад гэтага мы выйграем». Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што перагаворы са Старшынёй КНР Ху Цзіньтаа паслужаць замацаванню станоўчай тэндэнцыі ў развіцці беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. «Каб замацаваць гэту тэндэнцыю, зрабіць яе пастаяннай, выключыць усялякае вяртанне, мы павінны правесці гэту сустрэчу. Я вельмі шмат чакаю ад перагавораў са Старшынёй КНР Ху Цзіньтаа, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Лічу, што мы будзем сустракацца з сябрам беларускага народа».

Закранаючы ў інтэрв'ю беларуска-расійскую тэматыку і, у прыватнасці, працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Крыху, вядома, мы прытармазілі тут з-за вядомых прычын. Але мне здаецца — гэта пераадольна. Не трэба гэта дэманізаваць, гіпербалізаваць. Мы наладзім адносіны з Расіяй і знойдзем такія шляхі. Не можа Расія без Беларусі, як і Беларусь не можа без Расіі. Нам будзе цяжка без Расіі, Расіі будзе таксама вельмі цяжка і складана без Беларусі. У нас павінны быць нармальныя адносіны». «Таму ўсе гэтыя рознагаласці, незразумелыя недамоўкі — гэта адыдзе ў мінулае», — упэўнены беларускі лідар.

У ходзе маючага адбыцца візіту ў КНР Аляксандр Лукашэнка наведае нацыянальныя экспазіцыі Беларусі і Кітая на Сусветнай выстаўцы «ЭКСПА-2010» у Шанхаі, сустрэнецца са Старшынёй КНР Ху Цзіньтаа, а таксама азнаёміцца з рэалізацыяй сумесных беларуска-кітайскіх праектаў, у прыватнасці па вытворчасці і сэрвісным абслугоўванні на тэрыторыі Кітая кар'ерных самазвалаў БелАЗ.

У БЕЛАРУСІ ЗАХАВАНЫ І ПРЫМНОЖАНЫ ЛЕПШЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАЙ ШКОЛЫ ПРАЦОЎНЫХ РЭЗЕРВАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 70-годдзем з дня заснавання сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі навучэнцаў, выкладчыкаў, майстроў вытворчага навучання і ветэранаў прафтэхадукацыі.

Як адзначыў Прэзідэнт, Беларусь па праву можа ганарыцца дасягненнямі ў падрыхтоўцы прадстаўнікоў самых масавых і запатрабаваных прафесій, ад якіх у многім залежаць поспехі айчыннай эканомікі. У краіне захаваны і прымножаны лепшыя традыцыі савецкай школы працоўных рэзерваў. Штогод у эканоміку краіны ўліваецца каля пяцідзесяці тысяч маладых рабочых, якія паспяхова працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі. Многія з іх сталі перадавікамі вытворчасці, адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. «Сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі не толькі з'яўляецца кузняй рабочых кадраў, але і паспяхова вырашае грамадска значныя задачы маральнага і патрыятычнага выхавання моладзі. За гэтым стаіць вялікая праца выкладчыкаў і майстроў вытворчага навучання. Дзякую вам за адданасць справе і вялікі ўклад ва ўмацаванне эканамічнай магутнасці роднай краіны», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.10.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲1 долар ЗША	2 997,00	1 чэшская крона	170,05	USD	29,9086
▼1 еўра	4 176,92	1 польскі злоты	1045,76	10 UAH	37,6455
1 латвійскі лат	5 882,81	▼1 расійскі рубель	100,21	1000 BYR	9,9962
1 літоўскі літ	1 208,10	1 украінская грыўня	377,38	EUR	41,6717

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 15 ОКТЯБРЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О безвозмездной передаче в республиканскую собственность принадлежащих открытому акционерному обществу «Сберегательный банк Беларусбанк» на праве собственности акций открытого акционерного общества «Элитпаркет».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 12 октября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 15 октября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 12 октября 2010 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.

УНП 100325912.

«...І ЎСІХ ПАШТАВІКОЎ — СА СВЯТАМ!»

У маёй мамы Наталлі Сундуковай 9 кастрычніка свята — Сусветны дзень пошты!

Мая мама — паштальён. Я хачу павіншаваць яе, пажадаць здароўя, удачы і творчых поспехаў. А яшчэ хачу шчыра павіншаваць увесь калектыў аддзялення паштовай сувязі № 28, дзе яна працуе. І наогул усіх-усіх паштавікоў.

Са святам вас!

Ігар СУНДУКОЎ, 10 год, г. Мінск

P.S. А гэта — мая мама.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО В СООТВЕТСТВИИ С РЕШЕНИЕМ НАБЛЮДАТЕЛЬНОГО СОВЕТА БАНКА СОЗЫВАЕТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

Дата проведения Общего собрания акционеров: 15 октября 2010 года.
Адрес проведения Общего собрания акционеров: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 8 октября 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 13 октября 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 21 октября 2010 года.

Телефоны для справок: 8(017) 229 64 54, 229 64 51.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Андрэй АРАМНАЎ: Эксклюзіў

«З МЯНЕ ЗРАБІЛІ ПАСМЕШЫШЧА, АЛЕ Я ЗНОЎ ПЕРАМАГУ НА АЛІМПІЯДЗЕ!»

Яўген ВАЛОШЫН



Фота Аляксандра АБУХОВІЧА.

Ці праўда, што Андрэя Арамнава ў трэці раз затрымалі нецвярозым за рулём? Няўжо лепшы штангіст свету ўжывае марыхуану і з-за гэтага не паедзе на Алімпіяду ў Лондан?

Такімі загалоўкамі ў верасні стрэлілі першыя палосы газет і папулярныя інтэрнэт-сайты.

Сам Андрэй пакрыўдзіўся на газеты і аб'явіў байкот. Але днямі ўсё ж пагадзіўся распавесці сваю праўду журналісту «Звязды».

Даўно цікаўлюся лёсам Андрэя Арамнава і рабіў з ім не адно інтэрв'ю. Таму калі інтэрнэт выбухнуў сенсацыяй «Арамнаў паліць марыхуану», папросту не мог у гэта паверыць...

І вось нарэшце сустракаемся з атлетам у алімпійскім комплексе «Стайкі» (сюды яго на машыне прывёз барысаўскі сябар Саша).

— *Прычоска — усё, што ад мяне засталося без штангі,* — ці то жартуе, ці то проста кажа Андрэй, пакуль мы падымаемся ў трэнажорную залу цяжкаатлетычнага корпуса. Заўважаю, што штангіст і сапраўды страціў вагу. Уключаю дыктафон і папярэджваю Андрэя Арамнава, што размова будзе жорсткай.

СТАР. 4

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению Логойского райпо (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания животноводческой фермы**, об. пл. 1489,7 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Логойский район, д. Слаговище.**

Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 190 529 400 бел. руб.

Площадь земельного участка **2,8144 га.**

Задаток 50 000 000 бел. руб.

Подробные извещения опубликованы в газете «Звязда» от 19.02.2010; 06.08.2010.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **21.10.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 20.10.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ISSN 1990 - 763X

РУБЛЁВЫЯ ДЭПАЗІТЫ ПРЫРАСТАЮЦЬ ЗНАЧНА ХУТЧЭЙ ЗА ВАЛЮТНЫЯ

За студзень—верасень гэтага года рублёвыя і валютныя ўклады насельніцтва павялічыліся больш як на 4,3 трыльёна Br (на 23,8 працэнта) і склалі амаль 22,5 трыльёна рублёў.

За гэты час банкаўскія ўклады ў нацыянальнай валюце выраслі на 35,4 працэнта, дэпазіты ў замежнай валюце — на 9 працэнтаў. Рост дэпазітаў працягнуўся і ў верасні: на 81,5 млрд Br і 179,7 млн долараў ЗША ў эквіваленце.

Папулярнасць рублёвых дэпазітаў у Нацыянальным банку патлумачылі прывабнымі працэнтнымі стаўкамі, якія істотна перавышаюць узровень інфляцыі, і даверам да банкаўскай сістэмы. Як вядома, у Беларусі Дэкрэтам Прэзідэнта гарантавана поўная захаванасць зберажэнняў насельніцтва ва ўсіх банках.

Ул. інф.

Аляксандр Лукашэнка адобрыў план пашырэння вытворчых плошчаў СТАА «Мідэа-Гарызонт»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў прапанову аб пашырэнні вытворчых плошчаў СТАА «Мідэа-Гарызонт» для стварэння буйнога прадпрыемства па выпуску бытавой тэхнікі, у тым ліку ЗВЧ-печаў. Гэта тэма абмяркоўвалася ўчора ў ходзе наведвання кіраўніком дзяржавы гэтага прадпрыемства, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб паспяховай рэалізацыі пілотнага праекта па выпуску сумесна з Кітаем ЗВЧ-печаў. Першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка сказаў, што ў бліжэйшы час плануецца падпісаць з Кітаем дакумент, у адпаведнасці з якім кітайскі бок прадаставіць інвестыцыі для стварэння буйнога прадпрыемства па выпуску бытавой тэхнікі. У прыватнасці, вытворчасць ЗВЧ-печаў будзе павялічана з 800 тыс. да 2,5 млн штук у 2012 годзе. Прэзідэнт запатрабаваў, каб практычна з заўтрашняга дня была пачата работа па падрыхтоўцы плошчаў для прадпрыемства. «Рашэнне прынята. Заўтра пачынайце працаваць». Пры гэтым ён сказаў, што ўсё павінна быць выканана ідэальна як на самім прадпрыемстве, так і што датычыцца дарожнай інфраструктуры — аўтамабільных і чыгуначных пад'ездаў. Як праінфармаваў кіраўніка дзяржавы прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, беларускі бок дасканала працуе над заключэннем новых кантрактаў.

ПАСТАНОВА Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

АБ ЗАЯВЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІХ АДНОСІНАХ

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прыняць Заяву Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб беларуска-расійскіх адносінах (прыкладаецца).

2. Накіраваць гэту Заяву Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А.Р., ва Урад Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Мядзведзеву Д.А., у Дзяржаўную Думу і Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі, Міжпарламенцкую Асамблею дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міжпарламенцкую Асамблею Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Парламенцкую Асамблею Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі.

3. Апублікаваць гэту Заяву ў сродках масавай інфармацыі.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ

7 кастрычніка 2010 года, г. Мінск.
№ 321 — СР4/V

ПАСТАНОВА Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

АБ ЗАЯВЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІХ АДНОСІНАХ

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прыняць Заяву Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб беларуска-расійскіх адносінах (прыкладаецца).

2. Накіраваць гэту Заяву Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А.Р., ва Урад Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Мядзведзеву Д.А., у Дзяржаўную Думу і Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі, Міжпарламенцкую Асамблею дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міжпарламенцкую Асамблею Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Парламенцкую Асамблею Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі.

3. Апублікаваць гэту Заяву ў сродках масавай інфармацыі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. АНДРЭЙЧАНКА.

7 кастрычніка 2010 г., г. Мінск.
№ 430 — П4/VI

Заява Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб беларуска-расійскіх адносінах

Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь выказвае занепакоенасць у сувязі з некаторымі тэндэнцыямі, якія апошнім часам праяўляюцца ў адносінах паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Мы высока цэнім нашы саюзніцкія адносіны, заўсёды лічылі і лічым нашы народы брацкімі. Цеснае гандлёвае, эканамічнае, фінансавае, культурнае, ваеннае супрацоўніцтва, устаноўленае паміж Беларуссю і Расіяй, садзейнічае росту ўзроўню жыцця нашых народаў і забеспячэнню эканамічнай стабільнасці абедзвюх краін. Мы перакананы ў неабходнасці і перспектыўнасці пабудовы Саюзнай дзяржавы.

Разам з тым выклікае непрыманне кампанія па дыскрэдытацыі Кіраўніка беларускай дзяржавы, разгорнутая ў цэнтральных сродках масавай інфармацыі Расіі. Такія дзеянні наносяць шкоду развіццю дружалюбных адносін паміж нашымі краінамі і нашымі брацкімі народамі.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь заклікаюць дэпутатаў Дзяржаўнай Думы і членаў Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі аб'яднаць намаганні і зрабіць усё магчымае для таго, каб узаемаадносіны паміж нашымі краінамі не выйшлі з канструктыўнага рэчышча. Мы не маем права дапусціць нават самай малой магчымасці страціць усё тое, што было дасягнута ў будаўніцтве нашага агульнага дому намаганнямі абодвух народаў.

Прэм'ера рубрыкі «Жыллёшча»

СЁННЯ Ў КВАТЭРАХ МОЖНА БУДЗЕ ХАДЗІЦЬ БЕЗ ШАРСЦЯНЫХ ШКАРПЭТАК

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Асноўнае пытанне, якое хвалюе нашых чытачоў — цяпло. Камусьці не хапае сардэчнага, камусьці душэўнага цяпла. Аднак ва ўсіх пытанне — калі яно, тое цяпло, пойдзе па трубах? «Калі ўжо я перастану мерзнуць? Сяджу на працы ў паліто, а дома ў шарсцяных шкарпэтках», — пытаецца **спадар Андрэй** *з Мінска.*

У Міністэрстве ЖКГ адказваюць, што шкарпэткі Андрэй зможа зняць сёння.

Як запэўніў начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Анатоль Шагун, да 9 кастрычніка па рэспубліцы будзе ўключана ацяпленне ў кватэрах. Праца па падключэнні цяпла ў сталіцы працягнецца да панядзелка. Гэта звязана, па словах спадара Анатоля, з тым, што сталічная сістэма ацяплення досыць складаная. У адміністрацыйных будынках пачынае з 12 кастрычніка.

Так што ў паліто на працы, спадар Андрэй, давядзецца пацярпець да ауторка.

Ці адключаць ацяпленне, калі будуць анамальна высокія тэмпературы?

Наталля Мікалаеўна,
г. Бяроза Брэсцкай вобл.

— Такі варыянт не выключаны, — кажа Анатоль Шагун. — Аднак для гэтага патрэбна досыць цёплае і ўстойлівае надвор'е, а таксама добры прагноз. Уключаць і выключаць катлы нескладана для невялікіх кацельных. У абласных жа гарадах і сталіцы такое зрабіць досыць складана. Пры высокіх дзённых тэмпературах магчымы варыянт проста паніжэння тэмпературы энерганосьбітаў. Напрыклад, пераключэнне катлоў на простую цыркуляцыю.

Але, Наталля Мікалаеўна, прагнозы сіноптыкаў сведчаць, што ў бліжэйшы час анамальнай цеплыні не прадбачыцца.

Кажуць, што сёлетняя зіма будзе халаднейшая за мінулую. Ці гатовыя нашы камунальнікі да такіх маразоў?

Мікалай Іванавіч, *г. Жодзіна.*

Па словах Анатоля Шагуна, экстрэмальных сітуацый з ацяпленнем міністэрства не чакае.

— Мы някепска падрыхтаваныя. Усе работы выкананыя ў тэрмін, — гаворыць спадар Анатоль. — У нас дастатковыя запасы паліва.

У Беларусі на сёння маецца 23,5 тыс. тон мазуту (на 18 працэнтаў больш за план), больш за мільён кубаметраў дроў (83 працэнты ад плана), ёсць паліўныя трэскі, драўнінныя адходы і торф. Запас рэзервовага паліва ў выпадку аварый, перабояў ці абмежаванняў паставак з Расіі хопіць на 10 дзён працы газавых кацельных. У дадатак да ацяпляльнага сезона было заменена 587 кіламетраў цепласетак (83 працэнты ад гадавога плана). Сталі выкарыстоўвацца цеплаізаляцыйныя трубы, што дазваляе эканоміць электраэнергію.

Будзем спадзявацца, што астатнія 17 працэнтаў не лопнуць на працягу зімы.

Якая тэмпература павінна быць у кватэры? І куды скардзіцца, калі ў кватэры холадна?

Яніна, *г.п. Парычы, Светлагорскі раён.*

— Згодна з сістэмай дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі, тэмпература ў кватэры не павінна быць ніжэйшай за +18 градусаў.

— Калі тэмпература ў кватэры ніжэй за гэты паказчык, — паведамілі ў дыспетчарскай службе Міністэрства ЖКГ — то першапачаткова патрэбна звярнуцца ў свае ЖЭУ. Спецыяльная камісія прыйдзе і зробіць замеры. Вядома ж, што пры гэтым усе абагравальнікі павінны быць адключаныя. Пасля камісія вызначыць, з-за чаго ў вас холадна. З-за таго, што вы вокны не ўцяплілі альбо таму, што ў кацельнай праблемы.

Калі на вашу скаргу не адрэагавалі, то варта патэлефанаваць на «гарачую лінію».

Гарачыя лініі ўпраўленняў ЖКГ у Беларусі:

Мінская вобласць — тэл.: (017) 328 67 72
Брэсцкая вобласць — тэл. (0162) 21 82 27
Віцебская вобласць — тэл. (0212) 47 31 63
Гомельская вобласць — тэл. (0232) 74 47 52
Гродненская вобласць — тэл. (0152) 74 39 26
Магілёўская вобласць — тэл. (0222) 22 57 24
Дыспетчарская служба Міністэрства ЖКГ — тэл. (017) 200 28 42 (кругласутачна)

Калі ў вас ёсць што спытаць ці падзяліцца праблемай, пытанні можна дасылаць на электронную скрыню info@zyazda.minsk.by з паметкай «Жыллёшча» альбо пакідаць па тэлефоне 287 18 64.

Настасся ЗАНЬКО.

«ДАРОГА Ў АЎТАМАБІЛЬНУЮ БУДУЧЫНЮ»

пракладзена і ў Беларусі. Пад такім дэвізам упершыню ў нашай краіне праведзены Міжнародны аўтамабільны кангрэс, які арганізавала Міжнародная федэрацыя аўтамабільных таварыстваў «Фісіта». Яна аб'ядноўвае інжынераў, навукоўцаў, даследчыкаў з 38 краін свету і кожны год выстаўляецца ў розных краінах. Сёлета была абрана Беларусь. Савет Міністраў прапанаваў прымеркаваць мерапрыемства да 90-годдзя БНТУ і даручыў яго правядзенне гэтай установе.

На кангрэс прыбылі дэлегацыі з 24 краін свету. На трох пляцоўках на тэрыторыі БНТУ былі прадстаўлены ўзоры тэхнікі ўсіх вытворцаў нашай краіны, а таксама легкавыя аўтамабілі самых папулярных марак. Выстаўляліся і дробнасерыйныя, і аматарскія канструкцыі, доследныя мадэлі. Усяго было паказана больш за 150 транспартных сродкаў — ад вялізных аўтамабіляў МЗКТ і МАЗ да мота-, велатэхнікі. У скверы аўтатрактарнага факультэта была разгорнутая экспазіцыя рэтрамабіляў, прадстаўлена каля 30-ці спартыўных машын, у асноўным для ралі і трофі-дысцыплін. Было два аўтамабілі МАЗ-ралі, якія прыехалі сюды адразу з міжнароднага ралі-рэйду «Шаўковы шлях». Сёння дзея пазіцыяную сябе як галоўная аўтамабільная выстава года.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Завочная прамая лінія

КАЛІ ВЫБІЛІСЯ З РАЎНАВАГІ...

Што ёсць неўроз, якія псіхатропныя прэпараты здольныя выклікаць залежнасць — на гэтыя і іншыя пытанні адказа **загадчык амбулаторнага аддзялення памежных станаў № 1, урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Вольга Генадзьеўна ПРАКОПЬЕВА**.

Пытанні можна пакінуць па нумары рэдакцыі: **8 (029) 287 18 29 да 15 кастрычніка**. Адказы будуць надрукаваныя ў газеце.

Па чутках і аўтарытэтна

Уладзімір ДАРАПІЕВІЧ:

«У СТАЛІЦЫ БУДУЕЦЦА 80 ПРАЦЭНТАЎ ЖЫЛЛЯ МЕНАВІТА ДЛЯ ЧАРГАВІКОЎ»

Ужо на працягу месяца ў інтэрнэце і сярод мінчан гуляе пагалоска пра тое, што ў бліжэйшыя гады ў Мінску будуць будаваць жыллё па дзяржаўных расцэнках толькі для льготнікаў (шматдзетных сем'яў, перспектыўных спартсменаў, музыкантаў, навуковых работнікаў і г.д.), па свабодных цэнах будзе будавацца камерцыйнае жыллё для багатых, а сярэднестатыстычнаму звычайнаму чаргавіку пачнуць прапаноўваць толькі жыллё ў гарадах спадарожніках...

— Гэтыя чуткі нічым не абгрунтаваныя, — паведаміў рэдакцыі **намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Уладзімір ДАРАПІЕВІЧ**. — На ўсіх пустых тэрыторыях побач з кальцавой дарогай і на незабудаваных плямах горада будуць рыхтавацца будаўнічыя пляцоўкі для ўзвядзення шматкватэрных шматпавярховых дамоў менавіта для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Толькі на тэрыторыях старой сядзібнай забудовы, дзе прагназуецца знос, будуць падрыхтаваны будпляцоўкі, якія на пэўных умовах перадаюцца інвестарам. Там, на выбар, можа весціся будаўніцтва сапраўды дарагіх дамоў, а таксама ўзвядзенне звычайных панэльных дамоў па лініі долевага будаўніцтва. У долевым будаўніцтве ўсё часцей прымаюць удзел менавіта чаргавікі.

Сёлета ў Мінску будзе пабудавана 1 млн 200 тысяч квадратных метраў жылля. План на наступны год яшчэ не зацверджаны, але аб'ём жыллёвых «квадратаў» будзе не меншы. Акрамя таго, дадаткова плануецца будаваць жыллё для сталічных чаргавікоў у Смалявічах. Уладзімір Дарапіевіч спецыяльна ўдакладніў, што сілком прымушаць будаваць жыллё ў гарадах-спадарожніках нікога не будуць.

Як адзначыў днямі журналістам дырэктар праектна-даследчага КУП «Мінскграда» Аляксандр Пятроў, у сталіцы ёсць рэзервовая тэрыторыя плошчай каля 24 тысяч гектараў. Да 2015 года будзе асвоена 3,5 тысячы гектараў. Згодна з новым генеральным планам развіцця Мінска, да 2015 года ў сталіцы будуць жыць 1,9 млн чалавек, да 2030 года — ужо каля 2 мільёнаў. Прагназуецца, што да гэтага часу плошча жыллёвага фонду галоўнага мегаполіса краіны падвоіцца і будзе каля 62 млн квадратных метраў. Аляксандр Пятроў лічыць, што Мінск з'яўляецца самым кампактным горадам сярод іншых еўрапейскіх сталіц. Сёння яго плошча складае 308 квадратных кіламетраў.

Сяргей КУРКАЧ.

Абзац

Буйны скарб старажытных манетаў знойдзены ў Верхнядзвінску. Вяртаючыся з экскурсіі па горадзе, група ваеннаслужачых праходзіла міма каталіцкага касцёла Нараджэння прасвятой Багародзіцы, дзе зараз вядуцца земляныя работы. Адзін з салдатаў заўважыў торбачку, у якой аказаліся манеты. Усяго было налічана 392 манеты розната наміналу, датаваных 1557—1564 гадамі. Скарб перадалі ў міліцыю для ўстанаўлення яго гістарычнай і культурнай каштоўнасці.

Партыю нічыйнага алкаголю коштам 63 млн рублёў выявіла міліцыя ў гарадскім пасёлку Станькава Дзяржынскага раёна. На адным са складаў знаходзілася 8080 бутэлек віна па 0,5 л, 5192 бутэлькі віна па 0,7 літра, 320 бутэлек лікёру, больш за паўтары тысячы бутэлек гарэлкі. Уласнік прадукцыі не ўстаноўлены.

Няўдачай скончылася спроба двух расіян незаконна вывезці з Беларусі 21 т бульбы. У в. Сталовічы Баранавіцкага раёна міліцыя спыніла аўтамабіль МАН, якім кіраваў індывідуальны прадпрымальнік з Тульскай вобласці. Суправаджальных дакументаў на груз у яго не аказалася. Тавар канфіскаваны, яго папярэдні кошт — Br21 млн. Вядзецца праверка супрацоўнікамі падатковых органаў.

У Малдове ініцыявалі працэдуру банкруцтва адзінага ў краіне вытворцы херасных вінаў — АТ «Вінур Ялавень». Эканамічная апеляцыйная палата Кішынёва распачала адпаведны працэс. На тэрыторыі былога СССР херас у прамысловых маштабах (каля 21 млн дал штогод) вырабляў толькі Ялавенскі вінзавод. Віно (херас) тут вырабляецца па класічнай іспанскай тэхналогіі.

Поўны абзац

Каля ста тысячаў гарбузоў, сабраных на ферме ў Вермонце (ЗША), змыла ў раку Канэкцікут. Як расказала гаспадыня фермы Маргарэт Глэдстоўн, гарбузы былі сабраныя і чакалі транспарту, які павінен быў развезці іх заказчыкам. Аднак дачакацца транспарту сабранаму ўраджаю так і не ўдалося — гарбузы знесла ў раку ў выніку праліўных дажджоў, што прайшлі некалькі дзён таму. Частку змытага ўраджаю ўдалося сабраць у 25 км унізе па рацэ. Каля 4 тыс. гарбузоў вылавілі з вады і склалі на пляжы. Двое з тых, хто лавіў гарбузы, прыслалі Маргарэт грошы за гародніну. Акрамя таго, яе калегі з іншых фермаў прапанавалі кампенсаваць страты са сваіх уласных запасаў гарбузоў. Аднак на ферме ў Вермонце ўпэўненыя, што змогуць і самі выканаць усе ранейшыя замовы, нягледзячы на страты.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Выбары-2010

«ПЕРШЫ ПАЙШОЎ...»

Лідар ЛДП Сяргей Гайдукевіч заявіў пра спыненне свайго ўдзелу ў прэзідэнцкай кампаніі

Навіна сама па сабе дзіўная. Такога выходу, здаецца, нішто не прадвяшчала. Палітык ці не першым заявіў пра свае прэзідэнцкія амбіцыі — раз. Сабраў самую грандыёзную групу падтрымкі (у яго ініцыятыўнай групе было амаль 10,5 тысячы чалавек) — два. Электаральны рэкорд у беларускай гісторыі, між іншым! І раптам такое. Пасля ўсіх яго гучных прамоў! Заява аб зняцці ўласнай кандыдатуры выглядае сама меней непаслядоўна.

Аднак яна патрапіла ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў учора. Паводле слоў **сакратара ЦВК Мікалая ЛАЗАВІКА**, які, здаецца яшчэ нядаўна паўтараў каронны выраз самога палітыка «Якія выбары без Гайдукевіча?!», аб прычынах такога рашэння ў заяве не паведамляецца. Ён таксама патлумачыў, што юрыдычных перашкод для падобных дзеянняў няма — прэтэндэнт можа адмовіцца ад удзелу на любым этапе выбарчай кампаніі. Сітуацыя не выклікае цяжкасцяў яшчэ і таму, што Гайдукевіч дасюль не быў зарэгістраваны ў якасці кандыдата (як і ўсе астатнія ўдзельнікі гонкі — рэгістрацыя пачнецца толькі з 14 лістапада). А значыць, не атрымліваў бюджэтных грошай на агітацыю (у такім выпадку іх бы давялося вяртаць). Як акцэнтуе спадар Лазавік, С. Гайдукевіч на гэтым этапе ўвогуле «мог бы і не пісаць ніякіх заяў». Яму дастаткова было проста не вылучацца ў далейшым. Маўляў, ЦВК рэгіструе ініцыятыўную групу, а збірае яна подпісы ці не, будзе іх падаваць патэнцыйны кандыдат ці не будзе — гэта ўжо іх асабістая справа...

Пра сыход з дыстанцыі заяўляў і яшчэ адзін прэтэндэнт — **пенсіянер Пётр БАРЫСАЎ**. Але ж, як кажуць у Цэнтрвыбаркаме, «пакуль толькі ў прэсу». Бо ў самой Цэнтральнай камісіі ягонай заявы дасюль не бачылі.

— Хацеў бы толькі ў яго выступленнях звярнуць увагу на такі аспект: члены яго ініцыятыўнай групы нібыта будуць збіраць подпісы на карысць Віталя РЫМАШЭЎСКАГА, — адзначае сакратар Цэнтрвыбаркама. — Гэта будзе незаконна. Пакольку пасведчанні ўдзельнікам ініцыятыўнай групы Барысава даюць ім права збіраць подпісы выключна ў падтрымку Барысава. Патэнцыйны кандыдат нават пры зняцці не можа перанацэліць сваю групу на іншага патэнцыйнага кандыдата.

Прайшоў усяго тыдзень збору подпісаў, а ў палку прэтэндэнтаў паменшала ўжо. Так і напрошваецца: колькі ж прэтэндэнтаў дацягне да фіналу?.. Хацелася б, каб канкурэнтнасць і спаборнасць выбараў былі максімальныя.

Тым часам распачынаецца маніторынг электаральнай кампаніі. Акрэдытавана ўжо 12 міжнародных назіральнікаў. Усё гэта прадстаўнікі місіі СНД, якую ўзначальвае Сяргей Лебедзеў. Заяўка ад місіі АБСЕ пакуль не паступала.

За дзейнасцю тэрытарыяльных выбаркамаў будуць пільна сачыць як мінімум 66 мясцовых назіральнікаў. Ва ўсякім разе столькі ўжо скіравана. Аднак нішто не перашкаджае дэлегаваць іх і пасля, на любым этапе выбарчай кампаніі. Прадстаўнікоў партый — літаральна на вагу золата: адзін ад партыі БНФ, трое — ад КПБ. Трэба разумець такую пасіўнасць, як ашчаднасць — з мэтай «стрэліць» колькасцю на ўчастках. Там, дзе будзе весціся падлік галасоў.

Рабіліся спробы аспрэчыць рашэнні адносна фарміравання саміх выбаркамаў. 27 скаргаў паступіла ў суд. 12 засталіся без разгляду як пратэрмінаваныя. Астатнія не былі задаволеныя. З пункту гледжання Мікалая Лазавіка, гэта цалкам натуральна: парушэнняў не было, проста калі на ўключэнне ў склад камісіі прэтэндавала, скажам, 20 чалавек, а максімальна дапушчальная колькасць — 13, зразумела, нехта туды не патрапіць...

Пакуль прэтэндэнты ўзважваюць, ці станавіцца ім кандыдатамі, Цэнтрвыбаркам прадумвае, як арганізаваць агітацыю для тых, хто будзе зарэгістраваны. На чарговым пасяджэнні, якое мае адбыцца 14 кастрычніка, плануецца вызначыць парадак скарыстання дзяржаўных масмедыя ў выбарчай кампаніі. І, натуральна ж, удакладніць усе нюансы па самай цікавай частцы — правядзенні тэледэбатаў.

Зоя ВАРАНЦОВА.

БАЯВАЯ КАЛЕКЦЫЯ — КРЫМІНАЛЬНАЯ

Супрацоўнікі Упраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці атрымалі інфармацыю пра тое, што 50-гадовы беспрацоўны жыхар Брэста досыць працяглы час праводзіць несанкцыянаваныя раскопкі ў месцах баёў Вялікай Айчыннай вайны, знойдзеную зброю і боепрыпасы захоўвае ў розных месцах горада. Падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў опергрупа выявіла і канфіскавала стралковую зброю, тры ручныя гранаты і супрацьпяхотную міну.

Экспанаты хатняй калекцыі — аўтамат Шмайсера StG-44, самазарадную вінтоўку Токарава 7,62 мм, фаўст-патрон, кулямёт MG-34, чатырохствольны пісталет 1820 года чэшскай вытворчасці і іншае, — брастаўчанін захоўваў у двух кватэрах і падвале жылога дома ў цэнтры горада. Боепрыпасы абяшкодзіла сапёрна-піратэхнічная група в/ч 5526 ВВ МУС. Знойдзены арсенал перададзены для правядзення судова-крыміналістычнай экспертызы, па выніках якой следчым аддзелам УКДБ будзе прынятае рашэнне аб узбуджэнні крымінальнай справы па арт. 295 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў».


Фота Артура СТРЭХА.

Варта нагадаць, што асоба, якая добраахвотна здае агнястрэльную зброю, боепрыпасы да яе, выбуховыя рэчывы і прылады, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за іх выраб, набыццё, перадачу, захоўванне, перасылку, перавозку або нашэнне (за выключэннем выпадкаў збыту).

Святлана БАРЫСЕНКА.

Міні-расследаванне

У паэта Сяргея Панізьніка скралі 25-гадовы «Мерседэс» з платнага гаража!

ПАЭТ ЛІЧЫЦЬ, ШТО САМ ДАЎ НАВОДКУ ЗЛАЧЫНЦАМ, А МІЛІЦЫЯ НЕ МОЖА ЗНАЙСЦІ СЛЯДЫ

23 сакавіка паэт Сяргей Панізьнік прыйшоў на сваю «Аўтастаянку гаражнага тыпу №49» (так афіцыйна называецца гаражны масіў) па вуліцы Гурскага, каб заплаціць за 4 месяцы наперад — перад адлётам да дачкі ў Канаду. Заплаціў, пракаціўся па навакольных вуліцах на сваім 25-гадовым «Мерседэсе», каб праверыць спраўнасць аўто, зняў клему з акумулятара — і са спакойнай душой адляцеў.

— Пазней ужо я скумекаў, што фактычна сам даў наводку — ускосна паказаў, што мяне не будзе некалькі месяцаў, да таго ж прадэманстраваў, што беленькі «Мерседэс» добра ездзіць... — сумуе спадар Сяргей.

Прыкладна 8 жніўня, вярнуўшыся з Канады, спадар Панізьнік накіраваўся ў гараж, каб праверыць, як маецца ягоны верны конь. Карціна адкрылася вусцішная для любога аўтааматара — замкі на гаражы былі зрэзаныя, а машына знікла.

Дакладна такі 25-гадовы «Мэрсэдэс-Бэнц 190» скралі злачынцы.

— Я пабег да вартаўніка!.. Ён мне на гэта: «А мы не ходзім глядзець па начах усе гаражы — мы баімся, раптам хто нам па галаве дасць». Я кажу: а яна ж выязджала, як вы маглі яе без пропуска выпусціць?! Кажуць: «Мы не ведаем, як так адбылося».

Паэт напісаў заяву, міліцыя ўзялася расследаваць справу. Мінула два месяцы — а вынікаў няма.

— Сышоў тэрмін у адзін месяц, адведзены законам для падобнага расследавання, — кажа **дазнавальнік Маскоўскага РАУС Іван ШЭМЧОНАК**. — У цяперашні час справа прыпыненая, праводзяцца аператыўна-пошукавыя мерапрыемствы. У гэтых гаражах мы выявілі шматлікія парушэнні, ім вынесена прадстаўленне.

— Якога плана былі гэтыя парушэнні?

— Разумееце, як і ў любым гаражным масіве, вартаўнікі такія людзі, што часткова злоўжываюць спіртным, ведаюць у твар многіх уладальнікаў аўто і выпускаюць іх з парушэннем правілаў...

— Ці ўдалося высветліць, уначы ці ўдзень была скрадзеная машына?

— Гэта цяжка сказаць, бо перыяд часу, пра які ідзе гаворка, вельмі вялікі — некалькі месяцаў. Ніхто з вартаўнікоў нічога патлумачыць не можа.

— На вашай практыцы з гаражоў, якія ахоўваюцца, кралі аўтамабілі?

— Такіх спраў у мяне не было.

— Сяргей Панізьнік лічыць, што сам мог даць наводку: заплаціў вартаўніку наперад за 4 месяцы, паказаў, што машына на хаду... Вы працавалі з тым вартаўніком?

— Так, ён пацвярджае, што гаспадар заплаціў наперад за некалькі месяцаў — але ці ездзіў на машыне ў той дзень, не памятае. Гэты вартаўнік праходзіць у нас па справе як сведка.

Сяргей Панізьнік дадае, што ў міліцыі яму паведамілі і такую інфармацыю:

— Сказалі: «Мы падазраём аднаго чалавека, але ён сядзіць у турме і не прызнаецца». Я так зразумеў, што знайшлі нейкага ахвярнага казла...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Пропуск у гараж так і застаўся ў паэта — як сведчанне, што машына павінна быць на месцы.

Выпрабавана на сабе

КАРЭСПАНДЭНТ «ЗВЯЗДЫ» ТАКСАМА ВЫЕХАЎ З ГЭТЫХ ГАРАЖОЎ БЕЗ ПРОПУСКА!

Рынкавы кошт такога «Мерседэса» складае цяпер каля 2 тысяч долараў — не самая вялікая сума для зламыснікаў, каб рызыкаваць сесці на некалькі гадоў за краты. Машыну паэт прыдбаў гадоў дзесяць таму — з іх гадоў 8 захоўваў у гэтым гаражы. Увесь гэты час спраўна плаціў унёскі — на цяперашні момант яны складаюць 45 тысяч у месяц (Панізьніку як інваліду другой групы даецца зніжка ў 4 тысячы). Але нашто такі гараж з аховай, калі машына спакойна выехала з яго без уладальніка і без дакументаў? З такой радасцю яе можна было трымаць і пад акном...

Едучы аглядаць гараж паэта, я вырашыў правесці эксперымент — паспрабаваць заехаць і выехаць з гаража без пропуска. Пад'язджаем да шлагбаума... Чаканне секунд 20... І шлагбаум адчыняецца!

Сфатаграфаваўшы апусцелы гараж, кіруюся да выезду. 30 секунд ля шлагбаума... Пасля з будкі выходзіць вартаўнік, пытаецца, дзе мой пропуск.

— Дык я гэта... Да сябра прыехаў!.. — найграна лыпаю я вачыма і для натуральнасці дадаю: — Трэба было пакрышкі яму пакінуць!..

Вартаўнік нешта бухціць, але... адчыняе шлагбаум!..

— Вось так і мой «Мерседэсік» адсюль выехаў... — сумна ўздыхае Сяргей Панізьнік.

Цяпер у апусцелым гаражы паэт захоўвае старыя часопісы і газеты...

Каментар гаражнага кіраўніцтва

«КАЛІ МІЛІЦЫЯ ПРЫЗНАЕ НАШУ ВІНУ — КАМПЕНСУЕМ ГАСПАДАРУ СТРАТЫ БЕЗ СУДА»

Валерый ПЯТРОВІЧ, намеснік генеральнага дырэктара УП «Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі» кажа, што за апошнія 10 гадоў гэта першы выпадак крадзяжу аўто з іх гаражоў.

— Я не ведаю, як так сталася... — паціскае плячыма Валерый Аркадзевіч. — Ідзе расследаванне. Калі будзе прызнана, што тут віна нашага боку, то гаспадару будзе кампенсаваны кошт транспартнага сродку за кошт арганізацыі. А ўжо пасля мы будзем разбірацца, ці вінаватыя канкрэтныя кантралёры — і спаганяць грошы з іх. Зразумела адно — машыну выпусцілі з тэрыторыі без пропуска — бо пакідаючы стаянку, гаспадар павінен здаць пропуск на захаванне дзяжурнаму кантралёру.

— Якраз пра гэта я і хацеў у вас запытацца. Каб выехаць з гаража на машыне, трэба абавязкова здаць пропуск?

— Так.

— 10 хвілін таму я заехаў і выехаў у гэтыя гаражы без ніякіх дакументаў. Чаму нават пасля такога выпадку дысцыпліна не ўзмоцненая?

— Значыць, будзем разбірацца, наводзіць парадак. Прыцягнем кантралёра да адказнасці за тое, што вас запусціў і выпусціў.

— Увогуле, ці часта з вашых гаражоў крадуць машыны?

— За апошнія 10 гадоў гэта першы выпадак.

— Калі я правільна зразумеў, калі міліцыя прызнае вашу віну, вы гатовыя кампенсаваць гаспадару страты без суда?

— Так, бо на час захоўвання машыны ў гаражы мы нясём за яе адказнасць. У нас быў нядаўна выпадак, калі працаўнікі фарбавалі з пульверызатараў сетку на плоце і запэцкалі «Порш Каен», які стаяў каля плота (такая машына каштуе да 75 тысяч даляраў — **Г. Л.**). Мы кампенсавалі гаспадару страты — больш за 5 мільёнаў рублёў, а цяпер судзімся з арганізацыяй, якая фарбавала плот, каб спагнаць з іх грошы.

— У міліцыі кажуць: апроч таго, што машыны выпускаюць без пропускаў, дык яшчэ і вартаўнікі бываюць нападпітку...

— А вось гэта ўжо поўная хлусня! Калі б міліцыя пабачыла кантралёра нападпітку, яны б яго адлучылі ад нясення службы — і паведамілі нам. Тое самае — гаспадары аўто. Там навідавоку вісяць тэлефоны нашых кругласутачных дзяжурных. Думаю, многія гаспадары, якія клапоцяцца пра свае аўто, скарысталіся б гэтым. Калі мне з міліцыі напішуць такое — я асабіста пайду да начальніка РАУС, і хай мне давядзе гэта. Гэта — паклёп!

Званок юрысту

«ГАСПАДАР МАШЫНЫ МОЖА ПРАЗ СУД СПАГНАЦЬ З ГАРАЖОЎ ГРОШЫ ЗА АЎТО»

Якія павінны быць дзеянні гаспадара машыны ў такой сітуацыі? Пра гэта мы спыталіся ў Юрыдычнай кансультацыі Маскоўскага раёна сталіцы.

— Па-першае, гаспадар можа абскардзіць пракурору рашэнне следчага пра перапыненне справы — хай шукаюць! — **гаворыць Алена ЦІТОВА, загадчыца Юрыдычнай кансультацыі Маскоўскага раёна сталіцы**. — Калі ж яму дадуць адказ, што справу раскрыць немагчыма, немагчыма высветліць асобаў, якія скралі аўтамабіль, то ён можа ў парадку грамадзянскай судавытворчасці звярнуцца да прадпрыемства, якое валодае гэтымі гаражамі. Зразумела, што ў дамове на захоўванне машыны будзе прапісана, што яны нясуць адказнасць за машыну на час знаходжання ў гаражы. Ён можа запатрабаваць ад гаражоў кампенсацыю кошта машы

«ХУТКАСЦЬ, НАДЗЕЙНАСЦЬ, ДАСТУПНАСЦЬ» — ГЭТА НЕ ПРОСТА СЛОВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для таго, каб расказаць і паказаць сваю работу, РУП «Белпошта» арганізавала спецыяльны прэс-тур.

...Як і трэба было чакаць, знаёмства з прадпрыемствам пачалося з «Гібрыднай пошты» — паслугі, прэзентаванай зусім нядаўна, літаральна месяц таму. Як адзначыў вядучы інжынер тэхаддзела Вячаслаў Тамілін, яна найперш для карпаратыўных кліентаў, якія цяпер могуць пазбавіцца ад неўласцівай ім работы па раздрукоўцы, канвертаванню і рассылцы інфармацыі.

Працэс, што называецца, уражваў: інфармацыя з электроннага носьбіта пасля пэўнай апрацоўкі аўтаматычна паступала на кантролер прынтара; ён, што называецца, на вачах «выдаваў» патрэбную колькасць экзэмпляраў, кожны з якіх, зноў жа аўтаматычна і імгненна, трапляў у асобны і ўжо заклены канверт.

А далей — справа для пошты звыклая: даставіць адрасатам у любы куточак краіны, на што пойдзе максімум два дні. І ўсё — па даступных коштах, з гарантыяй тайны перапіскі.

— Гібрыдная пошта, — патлумачыў намеснік дырэктара РУП «Белпошта» Мікалай Новікаў, — гэта наша новая, нераскручаная пакуль паслуга, у якой вялікая будучыня. Для яе развіцця да канца года мы павінны ўстанавіць дадатковае абсталяванне. Пакуль жа адным з першых буйных заказчыкаў стаў аператар мабільнай сувязі Велком. Раней рассылкай інфармацыі для сваіх кліентаў ён займаўся сам. Цяпер — атрымаў магчымасць знізіць расходы на апрацоўку выходзячай карэспандэнцыі, забяспечыць хуткасць і гарантыю дастаўкі, што, безумоўна ж, выгадна — і для заказчыкаў, і для нас.

Каму падалася «выгаднай» новая паслуга «Гібрыдная пошта», дык гэта фотакарэспандэнтам: камп'ютары, тэхніка... Ні табе калектыву людзей, ні дынамікі рухаў...

Цэх пісьмовай карэспандэнцыі — месца, дзе ўсё гэта засталося. Ён адзін з буйнейшых на вытворчасці «Мінская пошта». Менавіта тут прымаюцца, апрацоўваюцца і сартуюцца нашы простыя і заказныя лісты, якія звозяцца сюды з паштовых скрынак, усталяваных на вуліцах сталіцы, і 110 аддзяленняў паштовай сувязі.

— Наш цэх — гэта 216 чалавек, 10 брыгад. Працуем кругласутачна. У суткі апрацоўваем каля 2 тысяч кілаграмаў карэспандэнцыі: 160 тысяч простых адпраўленняў, каля 50 тысяч заказных, — не без гонару распавядала намеснік начальніка цэха Юлія Грэк. — Усяго за мінулы год праз нашы рукі прайшло іх каля 105 мільёнаў... У пазамінулы — 98 мільёнаў. Цяпер прыкладна 85 адсоткаў ад агульнай колькасці паштовых адпраўленняў складае дзелавая карэспандэнцыя. За заказнымі адпраўленнямі налажана аўтаматызаваная сістэма яе адсочвання.

Святлана ЗІНЕВІЧ – адна з пераможцаў іжнароднага эпісталярнага конкурсу.

Наогул жа словы «аўтаматызацыя» (ёю ахопленыя ўсе аддзяленні паштовай сувязі), «лакальныя сеткі», «інтэрнэт», «камп'ютарна-касавыя сістэмы», «плацежна-касавыя тэрміналы» і да іх падобныя гучалі ці не на кожным кроку.

— Адна з важнейшых задач пошты — ісці насустрач сваім кліентам: і, так бы мовіць, прыватным асобам, і дзелавому сектару эканомікі, — распавядала начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Алена Трубач. — Каб паспяхова выканаць яе, сёння ў любым аддзяленні паштовай сувязі можна не толькі падпісацца на газеты, адправіць лісты, электронныя грашовыя пераводы альбо пасылкі, купіць паштоўкі ды атрымаць пенсіі... Можна заплаціць за камунальныя паслугі і тэлефоны, кабельнае і спадарожнікавае тэлебачанне, за ахову кватэры, аформіць пакет дакументаў на атрыманне крэдыту, аплаціць страхоўкі, купіць газеты і часопісы, тавары спажывецкага попыту... У 20 аддзяленнях сувязі вылучаны спецыяльныя месцы для абслугоўвання карпаратыўных кліентаў. У выніку аб'ёмы па адпраўленнях пісьмовай карэспандэнцыі і грашовых пераводаў за апошнія 10 гадоў павялічыліся ў паўтара раза, па пасылках і адпраўленнях унутранай паскоранай пошты «Экспрэс» — больш чым у чатыры, міжнароднай паскоранай пошты EMS у 1,3 раза.

Гэтую паслугу РУП «Белпошта» ўкаранілa яшчэ ў 1993 годзе, і спачатку яна працавала толькі ў 20 буйнейшых гарадах краіны. Потым падрыхтавалі спецыялістаў, распрацавалі лагістыку, з'явіліся адрасныя ярлыкі і канверты (для таго, каб паслуга была пазнавальнай), і...

— Зараз ідзе апрацоўка каля 65 тысяч адпраўленняў, выходных, скажам так, з нашай краіны і каля 40 тысяч уваходных, — расказвае начальнік службы EMS «Белпошты» Наталля Парфёнава. — Паслуга прапаноўваецца на камерцыйнай аснове, тарыфы перавышаюць звычайныя, але тут гарантаваны высокі сэрвіс. Наш кліент можа адсочваць увесь шлях свайго адпраўлення — з моманту здачы ў любым паштовым аддзяленні да ўручэння атрымальніку — і можа быць упэўнены ў самай аператыўнай яго дастаўцы.

Паслугу «Заказ тавараў беларускіх вытворцаў па каталогах» прэзентавала намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірына САКСОНАВА.

Што падобным чынам адпраўляецца? Усё, што пажадае кліент (апроч, зразумела ж забароненых гаручых матэрыялаў, наркотыкаў і пад.)... Апошнім часам, як расказвала Наталля Аляксандраўна, усё часцей падарункі, нават жывыя кветкі. А чаму б і не — тэрміны сціслыя , а значыць, кліент, мае ўсе шанцы падараваць букет ва ўсёй яго прыгажосці.

Сярод параўнальна новых паслуг «Белпошты» і заказ тавараў беларускіх вытворцаў па каталогах (каб нешта замовіць, жыхару хоць сталіцы, хоць самага далёкага хутара дастаткова запоўніць адпаведную заяўку і пры атрыманні аплаціць кошт і перасылку).

Іншымі словамі, тое, як насамрэч далёка зайшла беларуская пошта з часоў першага згадвання (а яно датуецца 885-м годам), добра бачна ў музеі, які створаны намаганнямі сапраўдных патрыётаў, ветэранаў прадпрыемства. Цяпер у ім каля пяці тысяч экспанатаў, сярод якіх нямала ўнікальных — дарэвалюцыйныя паштоўкі і маркі, арыгінальны ліст 1870 года, тарыфы на паштовыя паслугі і аналіз скаргаў, планы паштовых станцый, набор паштовых скрынак...

У гэты музей, па словах загадчыцы Лідзіі Туміловіч, любяць прыходзіць школьнікі, навучэнцы каледжа сувязі: зусім магчыма — будучыя кадры.

Сярод якіх (а раптам?) будзе і вучаніца Залужскай сярэдняй школы, што на Стаўбцоўшчыне, — Святлана Зіневіч. Пакуль яна, як прызналася, не думала ўсур'ёз, кім будзе. Аднак да пошты дачыненне ўжо мае — заняла другое месца ў 39-м міжнародным (!) моладзевым эпісталярным конкурсе — атрымала ад бюро Сусветнага паштовага Міжнароднага саюза (Берн, Швейцарыя) адпаведны дыплом, медаль, швейцарскі гадзіннік і каштоўны падарунак ад «Белпошты», якая працуе пад дэвізам: «Хуткасць, надзейнасць, даступнасць».

І для яе гэта не проста словы.

Валянціна ДОЎНАР.

Цэх пісьмовай карэспандэнцыі працуе кругласутачна.

BFW: СУПРАЦЬ і ЗА

...У павільёне людна і душна. Апошнія пяць дзён зранку да вечара тут кіпіць праца.

Першы ў Беларусі Belorussian Fashion Week (BWF) — падзея, трапіць на якую для многіх — адпаведнасць статусу, жаданы падарунак, а часам і проста месца, дзе зручна завесці знаёмства. А яшчэ складваецца ўражанне, што там — у глядацкай зале, рыхтуецца нешта забароненае. Тое, што прымушае людзей размаўляць шэптам і ліслява ўсміхацца — паказ першых эратычных фільмаў ці адкрыццё першага клуба, дзе танцуюць рок-н-рол. Дарэчы, без скандалу ўсё ж не абышлося.

ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ

Адразу пасля адкрыцця Тыдня моды ў Беларусі беларускі інтэрнэт узарваўся: на адным з блогаў быў змешчаны аповед адной з мадэляў, якая працавала на адкрыцці BFW:

«...Пасля таго, як паказы скончыліся, на гадзінніку было 21:00... Ніхто нас не пакарміў, не выпускаў... І тут навіна: ідзём у «Белэкспа» на рэпетыцыю калекцыі замежнага дызайнера. Без каментарыяў! Мы з 22 да 23:30 паўголыя мералі калекцыю басанож на голай ХАЛОДНАЙ падлозе. У замежных дызайнераў нават абутку не было. Хацелася плакаць.

Пакуль гэта дызайнер на сваёй незразумелай мове спрабавала ўсунуць тым, у каго 36-ы памер, цэлы 38, і пры тым, адыходзячы хвілін на 10, пакідала стаяць на холадзе... А пасля мы даведаліся, што заўтрашні паказ абутку не аплачваецца (астатнія паказы па 10 долараў)...

Атрымліваецца, што ўвесь дзень мы працавалі задарма, елі за свае грошы, ехалі дадому за свае грошы і яшчэ павінны былі выслухваць незадаволеныя каментары дызайнера: што ж гэта мы, свалата, без эмоцый ходзім? Ну як можна так арганізоўваць, чаму нам так мала плацяць за такую колькасць страчанага часу, чаму людзі, якія нічога не ведаюць пра дэфіле, указваюць нам, колькі пазіраваць?! Чаму ўсё не так?..»

СКАЖЫ, НЕ МАЎЧЫ

Калі стала вядома, што вядучыя беларускія мадэльеры **Саша ВАРЛАМАЎ і Іван АЙПЛАТАЎ** у BFW не ўдзельнічаюць, пытанняў стала яшчэ больш. Айплатаў сказаў, што не паспявае з калекцыямі, бо рыхтуецца да такога ж Тыдня моды ў Маскве. Варламаў быў больш пераканаўчым і заявіў, што не стане ўдзельнічаць у мерапрыемстве, якое арганізуе тая ж несур'ёзная каманда, якая некалі ладзіла забег дзяўчат на абцасах. Дызайнер не пайшоў і сваіх мадэляў не пусціў.

А вось кіраўнік школы мадэлінгу **Наталля МАКЕЙ** усё зрабіла з дакладнасцю наадварот:

— Мы, хутчэй за ўсё, аказаліся адзіным агенцтвам, якое падтрымала гэты Тыдзень моды і аддала сваіх мадэляў на паказы. Якому агенцтву не хочацца, каб іх мадэлі прайшліся ў Славы Зайцава? Гэта вялікая практыка, здымкі з гэтай калекцыі стануць самымі каштоўнымі ў партфоліа мадэлі. Чаму мы павінны адмаўляцца ад Fashion Week? Што такога падобнага ў нас арганізоўвалася апошнім часам? Людзі арганізавалі, прыдумалі — вядома, з часам усе недапрацоўкі будуць выпраўленыя.

ХТО ДБАЕ, ТОЙ МАЕ?

Пры стварэнні Belorussian Fashion Week арганізатары казалі: мэта праекта — прасоўванне дызайнераў і іх адзення на гандлёвыя рынкі. Вядома, такой магчымасці заявіць пра сябе найперш узрадаваліся маладыя дызайнеры.

— Мяне як маладога дызайнера прапанова ўзяць удзел у Belorussian Fashion Week зацікавіла адразу, — гаворыць **Юлія ЛАТУШКІНА**. — Трэба развіваць нашу краіну і сябе. Мы, дызайнеры, хочам супрацоўнічаць і развівацца.

— Да таго часу, пакуль у праекта будуць перспектывы, да таго часу перспектывы будуць і ў нас, дызайнераў, — упэўненая **Таццяна МАРЫНІЧ**. — Будзе крыўдна, калі гэтай магчымасці нас пазбавяць.

На прэс-канферэнцыі ўсе дызайнеры, паказы якіх прэзентаваліся на Belorussian Fashion Week, збольшага былі аднагалоснымі ў думцы: не варта ад першага Fashion Week у Беларусі патрабаваць чагосьці звыш. Маўляў, гэта толькі першы сур'ёзны крок, галоўнае — у нас ёсць каго паказваць...

Менеджар моднага дома «МОНА» з Сербіі Алена МРКІЧ таксама лічыць, што беларускія дызайнеры, ідучы за сусветнымі тэндэнцыямі, свой почырк не губляюць.

— Ужо дваццаць гадоў мы працуем на рынку моды і маем вопыт выступлення ва ўсім свеце (сваю калекцыю паказвалі ў Мілане, Парыжы і Дубаі). Мы бачым, што мерапрыемстваў такога класа ў Беларусі раней не было і што гэтае — першае. Тым не менш, ад'язджаем з пазітыўнымі развагамі і ўражаннямі. Спадзяёмся, што ў будучыні ўсё будзе нашмат лепш і арганізатары ўлічаць першы вопыт.

Паводле слоў прэс-сакратара BFW **Вікторыі НАВУМАВАЙ**, на ўсе паказы запрашаліся т.зв. баеры — эксперты з замежных і айчынных гандлёвых цэнтраў, якія пры жаданні маглі выбраць калекцыю для свайго магазіна. Але пытанне, ці выбралі яны што ў свой магазін, застаецца адкрытым. Ды і ці бачыў іх хто, гэтых «баераў»?

ЯК СПЕЦКАР «ЗВЯЗДЫ» ЛЕДЗЬ НЕ ТРАПІЎ У ПАКАЗ УКРАІНСКАГА ДЫЗАЙНЕРА...

...Паразважаўшы раты, мы не маглі адарвацца ад подыума — мадэлі заварожвалі. І хоць не заўсёды яны выражалі сваімі тварамі тое, што нам — гледачам — хацелася б бачыць, тым не менш нейкі магнетызм у іх быў...

— Прабачце, а вы не мадэль? — звярнуўся да мяне хлопец за кулісамі.

— Ды не, я журналіст.

— А прыняць удзел у паказе не хочаце? А то ў нас дызайнер вельмі строгая да падборы мадэляў, а ў вас якраз неабходны тыпаж.

— А калі ў мяне няма адпаведнай адукацыі?

— Гэта неабавязкова. Скажаце, што даўно займаліся.

— А колькі я змагу зарабіць?

— Калі Вас выберуць, атрымаеце 10 долараў за паказ. Сам паказ (а дзявятай вечара ў суботу) украінскай маркі SOSNOVSKA. Ваш паказ закрывае Тыдзень моды.

На маё шчасце, дызайнер Сасноўская мяне не выбрала — былі ўпадабаныя хлопцы маладзейшыя і худзейшыя. Некаторыя пасля казалі, што вучацца ў школе і на паказ Тыдня моды трапілі выпадкова...

Ілья ЛАПАТО.

Чаму беларускаму дызайнеру цяжка прабіцца на беларускі рынак?

Вопытная дызайнер Людміла Лабкова ўпэўненая, што працаваць беларускім дызайнерам на радзіме перашкаджае... густ беларускага спажыўца:

— Мне вельмі цяжка працаваць з беларускім рынкам, бо людзі чакаюць, калі спачатку такія рэчы прывязуць з Турцыі. Але лёгкая прамысловасць у нас заўсёды была моцная. У Расіі наша прадукцыя мае вялікую рэпутацыю — многія прыватныя фірмы вагонамі адпраўляюць туды беларускае адзенне. Мы на гэтым трымаемся і будуем свой бізнэс. Дзякаваць Богу, але з нядаўняга часу на беларускім рынку пачалі больш цягнуцца да айчыннага вытворцы. Але многія напрамкі гандлю ўсё яшчэ прыглядаюцца да Турцыі і Кітая. Стэрэатып: турэцкае — добра, наша — не.

ПАДАРУНАК КЛІЕНТАМ ПОШТЫ

УСВАЁ прафесійнае свята паштавікі робяць падарункі кліентам. На галоўным паштамце ў Магілёве 8 кастрычніка адкрыўся пункт абслугоўвання карпаратыўных кліентаў.

Напярэдадні Сусветнага дня пошты наведнікаў 30-га аддзялення сувязі ў абласным цэнтры на прыступках будынка вітаў паштальён Печкін і яго сябры. Казачныя персанажы раздавалі людзям рэкламкі аб паштовых паслугах і віншавалі з надыходным святам.

Супрацоўніцы пункта абслугоўвання карпаратыўных кліентаў гатовыя да працы.

У гонар свята на прыступках Магілёўскага паштамта кліентаў сустракаў сам паштальён Печкін.

У гонар свята пошты пункт абслугоўвання карпаратыўных кліентаў на вуліцы Першамайскай, 28 адкрыўся ва ўрачыстай абстаноўцы.

— Гэта ўжо другі такі пункт у Магілёве, — пракаментавала **дырэктар Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Алена КОТАВА**. — Мы робім гэта для камфорту прадпрыемстваў і устаноў, якія з'яўляюцца нашымі кліентамі. Каб ім не трэба было губляць час у чэргах, каб зручна было карыстацца ўсімі нашымі паслугамі — усё сканцэнтравана ў адным месцы.

Пункт абслугоўвання карпаратыўных кліентаў прапануе ўвесь спектр паштовых паслуг юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам за безнаяўны разлік. У тым ліку прыём і апрацоўку усіх відаў паштовых адпраўленняў, рэалізацыю марак, канвертаў і бланкаў строгай справаздачнасці, а таксама і новую цікавую паслугу «Электронная марка». Дэвіз паштовай службы застаецца нязменным — хуткасць, надзейнасць і даступнасць.

У Магілёўскім філіяле РУП «Белпошта» паведамілі, што ў бліжэйшай перспектыве падобныя пункты абслугоўвання карпаратыўных кліентаў адкрыюцца ў іншых гарадах вобласці — Горках, Крычаве, Асіповічах, але найперш — у Бабруйску. Гэта выгадныя праекты, таму што дзясяткі карпаратыўных кліентаў паспяхова супрацоўнічаюць з поштай і, са свайго боку, паштавікі імкнуцца дагадзіць ім.

— Віншую ўсіх з Сусветным днём пошты, — сказала Алена Котава. — Зычу працвітання нашай галіне, стабільнасці нашым кліентам і дабрабыту ўсім супрацоўнікам пошты!

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

НЯМЕЦКІ ФОНД ВЫДАТКОЎВАЕ БЕЛАРУСІ 300 ТЫСЯЧ ЕЎРА НА ПРАЕКТЫ ДЛЯ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

Трэці конкурс праектаў, накіраваных на стварэнне ўмоў для рэалізацыі патэнцыялу пажылых людзей, аб'яўлены ў Беларусі 1 кастрычніка ў рамках праграмы «Месца сустрэчы — дыялог». На рэалізацыю гэтай праграмы германскі фонд «Памяць, адказнасць і будучыня (Фонд EVZ) выдаткоўвае 300 тысяч еўра, а яе каардынатарам у нас з'яўляецца міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемаразуменне».

— Мэта нашай праграмы, на якую мы штогод выдаткоўваем каля 300 тысяч еўра ў вашай краіне, — падтрыманне праектаў, якія дадуць пажылым людзям, у першую чаргу тым, хто пацярпеў ад фашызму, магчымасць сустрэцца ва ўтульнай абстаноўцы з прадстаўнікамі маладога пакалення, падзяліцца сваім жыццёвым вопытам, — кажа **Элькэ БРАЎН, кіраўнік гуманітарных праграм германскага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня»**. — Мы глядзім на пажылых людзей не толькі як на тых, хто мае патрэбу у дапамозе, але і як на тых, хто мае багаты жыццёвы вопыт і хоча падзяліцца ім.

Удзельнікамі конкурсу на атрыманне грашовага гранта могуць быць не толькі грамадскія арганізацыі, але і дзяржаўныя ўстановы — тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага забеспячэння насельніцтва, школы, пасялковыя выканкамы, бібліятэкі, аддзелы культуры выканкамаў і гэтак далей. Як расказала **Анжаліка АНОШКА, старшыня праўлення ГА «Узаемаразуменне»**, заявы на ўдзел у конкурсе трэба падаць да 30 снежня 2010 года, пасля чаго незалежнае журы іх разгледзіць і дасць рэкамендацыі наконт праектаў. Але канчатковае рашэнне пра выдзяленне сродкаў ці пра адмову будзе прымаць германскі фонд. Асноўныя крытэрыі, па якіх будуць ацэньвацца праекты, — адпаведнасць мэтам праграмы, ахоп мэтавай групы (пажылыя людзі, у першую чаргу — былыя вязні нацызму і ахвяры сталінізму), удзел у праекце моладзі, эканамічная абгрунтаванасць праекта і ўдзел валанцёраў. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у ГА «Узаемаразуменне» ці паглядзець на сайце **www.moov.by**.

У папярэдніх двух конкурсах праектаў удзельнічала каля 40 арганізацый, але пераможцамі сталі толькі 14 у кожным з конкурсаў — у першым яны разам атрымалі 300 тысяч еўра, а ў другім агульная сума грантаў склала 360 тысяч еўра.

— Мы працуем з людзьмі 1935-1940-х гадоў нараджэння, у якіх практычна не было дзяцінства, — расказвае **Наталля ПАРЭЧЫНА, каардынатар адукацыйных праектаў ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны»**, пра праект «Птушкам усе ўзросты пакорныя», які ў свой час выйграў грант на арганізацыю творчых майстэрняў, экалагічных экскурсій і практычных заняткаў з пажылымі людзьмі. — І калі мы пачынаем займацца з імі прыкладной творчасцю — у іх загараюцца вочы. Напрыклад, мы з бабулямі і дзядулямі рабілі дамкі для птушак і кармушкі. І сказалі: «Бабулі, вы, напэўна, пасядзіце, гарбаты папіце, а мужчыны хай малаткамі стукаюць». Яны не пагадзіліся — таксама ўзялі малаткі ды пілы, і ўсе бабулі будавалі кармушкі. Наогул, яны з кожным заняткам становяцца ўсё больш свабоднымі, жыццярадаснымі, актыўнымі і, што самае галоўнае — гаваркімі. Мы спачатку не ставілі мэты збіраць успаміны, але зараз бачым, як людзям хочацца імі падзяліцца. Яны ж таксама ў дзіцячым узросце перажылі вайну, ім ёсць што расказаць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Падпіска-2010

ЗВЯЗДОЎСКІМ ПРЫЗАМ — ШЫРОКУЮ ГЕАГРАФІЮ

Як мы і абяцалі, паважаныя звяздоўцы, сёння мы друкуем спісы пераможцаў па выніках падпіскі на 4-ы квартал 2010 года, а таксама дзелімся некаторымі падрабязнасцямі чарговага розыгрышу.

Адразу скажам, што гэты розыгрыш, як і ўсе папярэднія, быў надзвычай «празрыстым», паколькі ўсе «шчаслівыя» купоны выцягвалі нашы незалежныя эксперты. Не сумняваемся, што прызы для кожнага з нашых падпісчыкаў аказаліся «заслужанымі», паколькі многія звяздоўцы ніколі не змяняюць старэйшаму беларускамоўнаму выданню. А самае галоўнае, што гэты прызавы фонд значна пашырыць геаграфію нашых паездак, бо, напрыклад, у Буда-Кашалёўскі раён Гомельшчыны, Круглянскі альбо Хоцімскі раён Магілёўшчыны, Жабінкаўскі раён Брэстчыны далёка не заўсёды даводзіцца наведаць з паўнацэнным візітам. А тут з'явілася нагода.

Прыносім прабачэнні, калі раптам у спісы пераможцаў укралася недакладнасць, бо не ўсе купоны запоўненыя разборліва.

Свае прызы, за выключэннем тэлевізараў «Віцязь» і мікрахвалевай печкі, можна будзе атрымаць у рэдакцыі, пачынаючы з панядзелка, 11 кастрычніка. А вось тэлевізары і печ мы ўручым падчас новай падпісной кампаніі на месцы пражывання нашых падпісчыкаў у прысутнасці адказных работнікаў раённай «вертыкалі» і супрацоўнікаў Белпошты. Акрамя таго, калі вам не будзе магчымасці самастойна забраць больш дробныя прызы, мы іх таксама пастараемся прывезці і ўручыць да канца гэтага года.

Заставайцеся са «Звяздой»! Гуляйце і выйгравайце!

Кар. «Звязды».

7 кастрычніка 2010 года адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўлялася ўстанова «Рэдакцыя газеты «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: г.Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 27 жніўня 2010 года (пасведчанне № 1754) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 верасня па 31 снежня 2010 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» чацвёртага квартала або другога паўгоддзя 2010 года.

Удзел у гульні прыняло 626 падпісчыкаў газеты «Звязда». Прызавы фонд гульні разыграны поўнасцю.

Прызы сярод ўдзельнікаў гульні размеркаваліся наступным чынам:

міксеры SCARLETT SC-049 выйгралі:

Гатоўчыц Ірына Вячаславаўна, в. Крывошын Ляхавіцкага раёна;

Драздова Ніна Фамінічна, Дуброўна;

Кузняцова Праскоўя Ануфрыеўна, в. Лучын Рагачоўскага раёна;

Грынь Валерый Міхайлавіч, г. Навагрудак;

Сімановіч Марыя Міхайлаўна, в. Усціж Асіповіцкага раёна;

Сташэўская Зінаіда Канстанцінаўна, в. Калінаўка-2 Капыльскага раёна;

Шуцько Алена Іосіфаўна, г. Мінск;

машыны кухонныя электрычныя «Белвар» КЭМ-36/220-4-24 выйгралі:

Папко Валянціна Антонаўна, в. Навасёлкі Ляхавіцкага раёна;

Глушкевіч Галіна Зофірынаўна, в. Віржы Докшыцкага раёна;

Новікава Валянціна Аляксандраўна, в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна;

Бабарыка Мікалай Пятровіч, в. Загор'е Карэліцкага раёна;

Коржыч Любоў Аляксандраўна, г. Хоцімск;

Крывец Анатоль Ігнатавіч, г.п. Івянец;

Зуева Ніна Іванаўна, г. Мінск;

тэлевізары «Віцязь» 54 CTV 760-3 выйгралі:

Хвясюк Валянціна Сяргееўна, в. Хмелева Жабінкаўскага раёна;

Карбоўскі Іван Максімавіч, в. Стаі Лепельскага раёна;

Парашчанка Любоў Віктараўна, г. Жлобін;

Андрукевіч Зінаіда Іосіфаўна, пас. Гезгалы Дзятлаўскага раёна;

Альшэўская Ганна Мікалаеўна, в. Елькаўшчына Круглянскага раёна;

Ганчарэвіч Мікалай Нікіфаравіч, в. Міхейкі, Слуцкі раён;

Паваротная Алена Адамаўна, г. Мінск;

печ ЗВЧ «Віцязь» 1378-МП 17-700-2 выйграла:

Цэван Ірына Мікалаеўна, г.п. Смілавічы.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні: (017) 287 19 68.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Саша ВАРЛАМАЎ, мадэльер, куратар праекта «Млын Моды»:

«Я СКАЗАЎ СВАІМ МАДЭЛЯМ: КАЛІ ВЫ СА МНОЙ — ЗНАЧЫЦЬ, СА МНОЙ; КАЛІ ВЫ ТАМ — ЗНАЧЫЦЬ, ВЫ ЧУЖЫЯ»

— Першыя ўражанні ад Belorussian Fashion Week (BWF)?

— Уражанні ад таго, што вы назвалі — гэты Week, не проста ўражанні, а сталае меркаванне чалавека, які з 1980-га працуе ў модзе. Напэўна, усё ж я быў першым, хто падняў на годны ўзровень усё тое, што мы маем сёння. А цяпер атрымліваецца, што якаясьці дзяўчынка, падключыўшы адміністратыўны рэсурс, раптам уявіла сябе чымсьці і кімсьці. Мне смешна. Невыпадкова ўсе больш-менш сур'ёзныя арганізацыі адмовіліся ад супрацоўніцтва з ёй — за яе спіной ніхто не стаіць. І сёння яна паказвае тых дызайнераў, каго вырасціў я — Галсцян, Голікава, Латушкіна, Лабкова. Паказала — добра, але для каго? Мэта паказу? Калі гэта для продажу адзення, то няводнага ж браера няма! У нас нават ніводнай крамы няма, каб прадаваць дызайнерскае адзенне!

— Хадзілі чуткі пра тое, што сваім мадэлям Вы забаранілі браць удзел у BFW.

— Вядома, забараніў. Ведаеце, усе, хто са мной — са мной і застаўся. Разумееце, я не ведаю, што робіцца там і якія ўмовы стварающца для мадэляў. Я сказаў: «Дзяўчаты і хлопцы, я з вамі ездзіў па ўсім свеце і вам давяраю. Калі вы са мной — значыць, са мной, калі вы там — значыць, вы чужыя».

— Значыць, той, хто хацеў, свой выбар зрабіў?

— Так. Ды і няма ў мяне прыгоннага права. Ёсць аўтарытэт і ёсць школа. Са мной лічацца. Бо я — вучань Славы Зайцава, Галіны Мяшковай, Уладзіміра і Іны Булгакавых...

— Ці патрэбны Fashion Week у Беларусі?

— Увесь свет сёння перайшоў на новы ўзровень. Fashion Week — гэта пройдзены этап XX стагоддзя. Вядома, ёсць паняцце FW у Нью-Ёрку, Мілане і Парыжы. Але, выбачайце, каб Мінск, якому няма і ста гадоў, як стаў сталіцай, заяўляў пра сваю Fashion Week — смешна!

Fashion Week закліканы прадаваць адзенне. Каму яго прадаваць у нас? Якім крамам?!

— Як адрэагавалі на BWF вашыя замежныя сябры і калегі?

— Мае замежныя сябры і калегі сказалі, што Беларусь з'ехала з глузду. У Беларусі «дзяўчынцы з двара» дазволена махаць шашкай — нават у каралеўстве гэтага не можа быць. Так і напішыце!

Яніна ГАНЧАРОВА, кіраўнік цэнтра моды і прыгажосці «Хрустальная німфа», арганізатар Belorussian Fashion Week:

«НЕ ПАДТРЫМАЦЬ, А ЗНЯСЛАВІЦЬ — АСАБЛІВАСЦЬ НЕКАТОРЫХ БЕЛАРУСАЎ»

— Як прыйшла ідэя правядзення ў Беларусі свайго Fashion Week?

— Гэта неабходнасць. Мы да гэтага не ішлі, мы ў гэтым працуем. Працуем прафесійна. Усё жыццё я займаюся модай: пачынаючы з мадэлі і заканчваючы рэжысёрам-пастаноўшчыкам паказаў і дырэктарам цэнтра моды. Наведаўшы Тыдні моды іншых краін — Капенгаген, Стакгольм, Парыж, Мілан, Нью-Ёрк, Берлін, Львоў, Санкт-Пецярбург, я зрабіла для сябе пэўны аналіз і разлікі — як трэба рабіць Тыдзень моды. Праект падтрымалі ўсе супрацоўнікі нашага дома моды. Гэта наша заданне і гэта наш праект, рыхтавацца да якога мы пачалі з мая.

— Ці Беларусь сапраўды ўжо «саспела» да свайго Тыдня моды?

— Калі вы задасцё пытанне, ці будзем мы далей праводзіць BWF, то будзем глядзець. Калі гэта будзе патрэбна людзям, калі яны будуць насіць адзенне беларускіх дызайнераў, калі дызайнеры будуць працягваць шыць адзенне ў Беларусі і калі партнёры будуць нас падтрымліваць — то так. Я хачу рабіць Тыдзень моды. Як асоба, як прафесіянал, як рэжысёр я хачу яго рабіць і магу зрабіць Тыдзень моды ў любой краіне — ці то ў Германіі, ці то ў Італіі. Той, хто працуе са мной, ведае.

— Як Вы ацэньваеце негатыўныя выказванні вашых калег у дачыненні да BWF?

— Ніяк не ацэньваю. Напэўна, у мяне няма на гэта часу. У мяне ёсць мая праца і я ведаю, што раблю яе якасна і прафесійна. Сумненняў у мяне няма. У кожнага чалавека ёсць права на сваё ўласнае меркаванне.

— Некаторыя мадэлі скардзіліся на ўмовы працы, асабліва падчас першага дня BWF...

— Я гэтага непасрэдна ад мадэляў не чула. А тое, што хтосьці сядзіць за рагом і нешта кажа: маўляў, нам там не спадабалася, нам там было дрэнна — падыдзіце і скажыце непасрэдна арганізатарам. А выліваць бруд у інтэрнэт — подла. У гэтым, відаць, асаблівасць некаторых беларусаў — не падтрымаць, а зняславіць. Я насамрэч вельмі самакрытычны чалавек, і самы вялікі крытык для мяне і маёй каманды — я сама. Хто з дызайнераў, што прымалі ўдзел у Тыдні моды, сказаў, што гэта дрэнна? Хто? Бо для каго мы робім BWF — для тусоўкі? Для мясцовага гламуру, якому не налілі? Хто з нашых партнёраў сказаў, што гэта дрэнна і яны не будуць з намі працаваць? Мы не перажываем наконт таго, што пра нас гаворыць прэса. Дванаццаць месяцаў у годзе — дванаццаць розных думак. У нас — свае мэты і задачы.

Андрэй АРАМНАЎ:

«З МЯНЕ ЗРАБІЛІ ПАСМЕШЫШЧА, АЛЕ Я ЗНОЎ ПЕРАМАГУ НА АЛІМПІЯДЗЕ!»

Фота Аляксандра АБУХОВІЧА.

У ЧЫМ УНІКАЛЬНАСЦЬ АНДРЭЯ АРАМНАВА?

Наш штангіст узрушыў увесь спартовы свет сенсацыяй на Алімпіядзе 2008 года ў Пекіне (тады яму было 20, сёння — 22). Зафіксаваў сусветны рэкорд у рыўку (200 кг) і сусветны рэкорд па суме рыўка і штуршка (436 кг). Цікава, што сам Арамнаў не вылучаецца грэнадзёрскай камплекцыяй: значна ніжэйшы за сваіх супернікаў (рост каля 174 см). Па так званай табліцы Сінклера (улічваецца вынік атлета і яго асабістая вага) Арамнава пасля Алімпіяды прызналі найлепшым штангістам свету.

Галоўныя спаборніцтвы чатырохгоддзя прайшлі, а імя Андрэя Арамнава працягвала грымець. Двойчы атлета спынялі супрацоўнікі ДАІ ў стане алкагольнага ап'янення. Забралі правы, прыцягнулі да крымінальнай адказнасці, далі штраф. І вось у пачатку жніўня гэтага года — чарговая бомба, трэцяе затрыманне нецвярозым падчас кіравання аўто. На гэты раз Арамнаву далі 10,5 мільёна рублёў штрафу. Калі чытаюцца гэта навіны ў інтэрнэце, падаецца што Арамнаў — самаўпэўнены хуліган, які мае зорную хваробу.

Распавяду вам толькі пра свае назіранні. Чалавек не лаецца мацюкамі. У дзверы ўваходзіць апошнім. У алімпійскім комплексе «Стайкі» вітаецца з усімі людзьмі. Жанчыны ўсе як адна называюць Арамнава Андрушам і спыняюцца паразмаўляць. Цягам гутаркі я знянацку задаў атлету пытанне: «Якую кніжку ты зараз чытаеш?» Андрэй адказаў: «Дыянэтыку» Рона Хабарта. Кніга пра методыку працы з розумам».

тэтычных канабіноідаў, якія ўтрымліваюцца ў наркатычных мікстах спайс. Як такое магло здарыцца?

— Чаму ўсе пра гэта пішуць, не ведаючы абставін? Спачатку нахлусілі, што я курыў марыхуану. Я што, на наркамана падобны?

Адкуль мне было ведаць, што ў гэтым каляровым пакеціку — небяспечнае рэчыва? На той момант яно было дазволена і свабодна прадавалася. На пакеціку што было напісана? Духмяныя травы. Што гэта за бардак, калі такое без праблем прадаюць? *(Тут Андрэй Арамнаў мае рацыю. З-за някемлівасці кампетэнтных ведамстваў большасць наркатычных курыльных мікстаў дагэтуль не ўнесеныя ў пералік псіхатропных сродкаў.* — **«Звязда»**). Сказалі, што я ўвогуле першы спартсмен, якога дыскваліфікавалі за ўжыванне такога рэчыва.

Пасля гэтага мне пра спайсы ўвогуле думаць страшна. А з мяне зрабілі наркамана. Пасля кожнага такога артыкула ў мяне страшэнны стрэс.

— Ніхто не ведае дакладна, але пішуць, што з-за дыскваліфікацыі твой удзел у лонданскай Алімпіядзе 2012 года пад пытаннем.

— Нядаўна зборная прыехала з чэмпіянату свету. Старшыня Міжнародная федэрацыі цяжкай атлетыкі Тамаш Аян сказаў, што я ў любым разе выступлю на Алімпіядзе ў Лондане. Шостага снежня скончыцца мая дыскваліфікацыя. У красавіку — першынство Еўропы. Паеду забіраць свой тытул. Потым — чэмпіянат свету, дзе я павінен зарабіць алімпійскую ліцэнзію.

— Навошта ты ўжываў духмяныя травы? Няхай сабе яны былі дазволеныя і свабодна прадаваліся?

— На чэмпіянаце Еўропы я выступаў на нервах. Для таго, каб паказаць вынік, я павінен адчуваць ураўнаважанасць і супакаенне. А я ўвесь час думаў пра нейкую лухту. Не мог заснуць, не мог знайсці адказы, ледзь не траўмаваўся.

— У чым была праблема?

— Перад чэмпіянатам Еўропы я прасіў у людзей падтрымкі. Каб дрэнна пра мяне не казалі. Гэта самае важнае для мяне. Здавалася, што ўсе праблемы ў мінулым. Але за тыдзень да старту прыйшлі з Міністэрства спорту і сказалі, што я сябе дрэнна паводжу, і падтрымка будзе толькі ў выпадку перамогі. Такі псіхалагічны ціск мяне ўзрушыў, не хацелася падымаць штангу. Усе паганыя думкі зноў абрынуліся на мяне. Быў моцны стрэс. Я павінен быў нейкім чынам супакоіцца перад стартам, вось і параілі купіць гэтыя духмяныя травы...

«ЁН ТАК ПАКРЫЎДЗІЎСЯ, ШТО ПАЙШОЎ СУПРАЦЬ...»

— І сапраўды, пасля трэцяга затрымання нецвярозым за рулём людзі думаюць, што ты рэгулярна закладаеш за каўнер. Раскажы, як здарылася, што ты папаўся на алкаголі?

— Мяне спынілі, хоць правілаў я не парушаў. Я нармальна, культурна з імі (інспектарамі ДАІ, — **«Звязда»**) пагаварыў. Пасадзілі мяне ў сваю машыну. Быў пік спякоты, кандыцыянера ў іх няма. Папрасіў падняцца, другі даішнік упёрся пузам і не пусціў. Узялі маю машыну, завалаклі на эвакуатар, дротам падрапалі бампер. Павезлі на экспертызу. Апарат паказаў 0,52 праміле, а потым 0,57 праміле алкаголю ў крыві (зусім нязначнае перавышэнне магчымай нормы, якая складае 0,44 праміле, — **«Звязда»**). І кожны раз у мяне было вось такое мінімальнае перавышэнне. Сам не разумею... Можа, я і праўда няўдачнік? Больш за паўтара літра піва я не выпіваю, а арганізм успрымае яго так, што апарат паказвае перавышэнне нормы.

— Навошта кіраваць аўтамабілем пасля таго, як выпіў?

— Я за трэніроўку магу падняць трыццаць тон. І канкрэтна мне піва дапамагае аднаўляцца. Я — прафесійны спартсмен і ведаю ўсе асаблівасці майго арганізма. П'ю я толькі піва. Бутэлечку раніцай, у абед, пазней яшчэ адну. Не болей за паўтара літра. Гэтага хапала, каб перавысіць норму. Але гэта не робіць з мяне п'яніцу.

Як, па-вашаму, можна перамагчы на чэмпіянаце Еўропы? П'яным, ці што? Я ўжываю толькі піва, да гарэлкі не дакранаюся.

Заўважу, што ў сваім жыцці я не меў ніводнай аварыі. Ніколі такога не здаралася, што з машыны выпадаў. Увогуле лічу сябе асцярожным і разважлівым кіроўцам.

— Андрэй, у мяне ў галаве не ўкладаецца, чаму ты раз за разам наступаеш на тыя ж граблі? Не кожны ўмудрыцца тройчы папасціся нецвярозым падчас кіравання аўтамабілем.

— Ведаеце, калі я папёр супраць законаў і навязванняў? Упершыню мяне злавілі, калі я пасля Алімпіяды атрымліваў кватэру ў Мінску. Самі ж частавалі шампанскім. Там прапанавалі, а на дварэ ўжо даішнікі чакаюць...

Калі б пасля гэтага мяне шчыра выбачылі, падтрымалі, я ніколі б не пераступіў парог аўто нецвярозым. І цяпер я піва п'ю, а яны мяне душаць! Калісьці я пайшоў супраць усіх правілаў. А як інакш, калі аднялі магчымасць нармальна трэніравацца? Я пратэставаў!

> **Я ўжываю толькі піва, да гарэлкі не дакранаюся. Не меў ніводнай аварыі. Увогуле лічу сябе асцярожным і разважлівым кіроўцам.**

Саша, сябар Андрэя Арамнава, які прывёз атлета ў Стайкі, зрабіў сваю рэмарку да слоў атлета: «Ён так пакрыўдзіўся на тую першую сітуацыю, што пайшоў супраць... Андрэй — як непарушная сцяна. І паўплываць на яго ў гэтым пытанні складана. Малады яшчэ».

«СТОЛЬКІ ЛЮДЗЕЙ ЗАГУБІЛІ — І ЎСЁ НАРМАЛЬНА. АДЗІН АРАМНАЎ ВІНАВАТЫ»

— Я ўвогуле магу адмовіцца ад ужывання піва. Ведаеце, у мяне вялізныя амбіцыі. Я хачу стаць наймацнейшым чалавекам планеты ў гісторыі. Хачу зафіксаваць такія вынікі, якія яшчэ ніхто не фіксаваў. Мая мара — пабіць рэкорд Юрыя Захарэвіча. Гэта 210 кг у рыўку і 250 кг у штуршку. Але Захарэвіч выступаў у катэгорыі 110 кг, а я — у 105 кг. Толькі магчымасці здзейсніць гэты план пакуль няма. У зборнай няма ўсіх неабходных умоў для трэніровак прафесійнага спартсмена. Амаль усе дарослыя хлопцы сышлі ці ім сказалі завязаць. Хачу ісці на сусветны рэкорд, а апроч штангі, нармальнага абсталявання няма. Вось зірніце на трэнажоры, імі ніхто не карыстаецца — ганяеш паветра такімі трэнажорамі ды і ўсё. Харчаванне такое, што ў мяне ўжо не лезе. Вітамінаў належных я не атрымліваю. Калі падымаю штангу, на мяне падае 200 кг. А масаж нармальны зрабіць не могуць. Трэніруюць часам без ведання справы. Калі б я дакладна выконваў план у зборнай, то не перамог бы на Алімпіядзе ў Пекіне. Таму што план быў зроблены пад Рыбакова, а я — атлет іншай катэгорыі. І з-за гэтага былі ўвесь час канфлікты.

Мне для дасягнення выніку неабходна развіццё — фізічнае, псіхалагічнае, маральнае. Мне трэба ўвесь час знаёміцца з людзьмі, развівацца, навучацца. А мяне запіхнулі ў гэтыя «Стайкі», дзе абсалютна няма ніякага развіцця. Пяць гадоў тут сяджу, у гэтым лесе. У нумары толькі тэлевізар з трыма каналамі — халадзільніка нават няма. У выніку я раблюся загружаным. Адзіная магчымасць разгрузіцца была — выпіць піва.

Пасля інтэрв'ю з Андрэем Арамнавым я звярнуўся да спецыялістаў у галіне медыцыны і біяхіміі з пытаннем: «Няўжо штангіст можа «разгрузіцца» півам?» Аказалася, што і сапраўды, ужыванне гэтага напою ў невялікай колькасці можа быць для штангіста карысным: вітамін В, рост мышцаў і гэтак далей... Увага! Пэўную карысць можа атрымаць толькі прафесійны атлет, які валодае самакантролем і дакладна адчувае патрэбы свайго арганізма. Для звычайнага мужчыны ўжыванне піва колькасцю большай за адзін кухаль — шкоднае.

— Няўжо ў зборнай няма трэнераў, якія маглі б табой займацца?

— Мой асабісты трэнер, Міхаіл Саладар, увесь час са мной, не прапускае ніводнага майго падыходу, кантралюе. Да яго прэтэнзій няма. Але ёсць трэнеры больш высокага статусу, якія, тым не менш, недастаткова ведаюць сваю справу. Зборная выступае ўсё горш і горш. У 2004 годзе ў нас пяць чалавек рыхтавалася ў катэгорыі 85 кг, у катэгорыі 94 кг — чатыры чалавекі, і ўсе былі дарослыя. У катэгорыі 105 кг рыхтаваліся тры чалавекі, у цяжах — два. Было вельмі шмат таленавітых спартсменаў. Але колькі хлопцаў «паламалася» з таго часу! Кагосьці проста спісваюць, у некаторых рвуцца калені, мышцы, плечы... І гэта — трэнерскія памылкі, папярэдзіць траўмы яны проста не могуць. Я сам падыходжу да маладых і кажу: тут трэба пацярпець, а тут — прытрымацца. Дык падыходзіць адзін трэнер і з насмешкай: «Ну што, паказаў майстар-клас?» Яшчэ ў 2007 годзе адзін з такіх «спецыялістаў» мне сказаў: «Калі ты, га...юк, будзеш выпендрывацца, я табе пакажу!» Але я стаяў на сваім і перамог на Алімпіядзе.

— А каго з перспектыўных атлетаў, ты лічыш, несправядліва спісалі з рахункаў?

— Напрыклад, таленавітага штангіста Мікалая Патоцкага. Ён і цяпер мог бы трэніравацца. Быў чэмпіёнам свету сярод юніёраў. Выступаючы ў катэгорыі 94 кг, рваў аж 200 кг, як я, уяўляеце? Але навучыць яго штурхаць ад грудзей паспросту не змаглі, не хапала трэнерскай кваліфікацыі. І ў выніку такога таленавітага чалавека адправілі дадому. Перакананы, калі б у яго ўклалі душу, быў бы заўсёды прызёрам топ-спаборніцтваў. Але сёння гэты чалавек — звычайны рабочы. Такіх выпадкаў магу прывесці шмат. Столькі людзей загубілі — і ўсё нармальна, адзін Арамнаў ва ўсім вінаваты.

Аднаго нашага кадэта, 16-гадовага хлопца, злавілі на допінгу. Як вынік — чатырохгадовая дыскваліфікацыя. А гэта былі б стабільныя медалі. Колькі людзей папаліся на допінгу! І гэта — памылкі ў трэніровачным працэсе. Каманда імкліва ідзе ўніз. І па выніках, і па кантынгенце спартсменаў. Хутка мы станем зборнай юніёраў. А раней у нас была такая каманда, што магла прыносіць больш медалёў, чым уся лёгкая атлетыка — усе 18 відаў.

> **Адкуль мне было ведаць, што ў гэтым каляровым пакеціку — небяспечнае рэчыва? На той момант яно было дазволена і свабодна прадавалася.**

У гэты ж час сапраўды добрыя трэнеры жывуць на здымных кватэрах. Напрыклад, Уладзімір Барздакоў, які трэніруе мяне, калі я знаходжуся ў Барысаве. А гэта ён знайшоў мяне і вывеў на міжнародную арэну.

— Блукаюць чуткі, што цябе пераманьваюць у ЗША...

— Я не хачу ад'язджаць, хачу жыць тут. Мару ажаніцца, дзяцей хачу, набыць дом. Але калі такое стаўленне будзе працягвацца пасля Лондана, вазьму ды і сыду са спорту.

— Хацелася б, Андрэй, каб твае праблемы мінулі, каб ты зноў быў у найлепшай форме. Але твой упарты характар — гэта жах!!!

— Хачу, каб да мяне пачалі нармальна, па-чалавечы, ставіцца. І я тут жа змяню сваё меркаванне наконт пэўных рэчаў. Я прафесійны спартсмен, але мой талент увогуле не запатрабаваны. Няма ніякай увагі. Такое адчуванне, што восьвось пра цябе ўвогуле забудуцца. Журналісты ўзгадваюць толькі тады, калі здараецца нешта дрэннае. Вось у апошні раз мяне даймала адна карэспандэнтка. Прыехала, падпільнавала маю маці, якая напрацавалася ў начную змену. Да ночы бегала і трэсла суседзяў, фатаграфавала машыны. Пільнавала мяне, разоў дваццаць патэлефанавала, хоць я сказаў, што інтэрв'ю даваць не буду, што сам яшчэ не ведаю, як мае справы...

Сёння людзі выцягваюць з мяне зарад важных эмоцый. Ж у такім стане выходзіць на памост? Хацелася б, вядома, каб людзі зразумелі, што я не такі, як пра мяне кажуць.

— Ты згодны, што часам робіш істотныя памылкі, што нешта трэба мяняць у жыцці?

— Я гэта разумею. Хацелася б, каб наступнае пакаленне не паўтарала маіх памылак. Паверце, больш за ўсё ў жыцці мне б хацелася прынесці карысць нашай краіне, нашым дзецям. Я перакананы, што магу так трэніраваць людзей, што яны будуць падымаць штангу правільна і не застануцца пры гэтым інвалідамі. Будуць пры гэтым нармальнымі, разумнымі і годнымі людзьмі.

ЖАНОЧЫ чэмпіянат свету па баскетболе закрануў нават далёкіх ад спорту беларусаў. За нашых дзяўчат перажывалі многія, бо іх гульня захапляла. Нават выпадкова ўключыўшы тэлевізар, адарвацца ад трансляцыі было немагчыма. Дэбют удаўся — беларускі занялі чацвёртае месца. Гэта неверагодны поспех, якога не ведае гісторыя суверэннага беларускага спорту ні ў якім іншым гульнявым відзе спорту. Праўда, нашы дзяўчаты маглі прайсці і далей. У фінал іх не пусцілі гаспадыні спаборніцтваў — чэшкі, прычым незаслужана. Якім стаў гэты дэбют на турніры найвышэйшага ўзроўню, расказалі баскетбалісткі, капітан каманды Наталля Трафімава і абаронца Наталля Марчанка.

Фота БЕЛТА.

Наталля МАРЧАНКА (злева) і Наталля ТРАФІМАВА (справа) на ўшанаванні нацыянальнай каманды ў Міністэрстве спорту і турызму (у цэнтры — Алена ЛЕЎЧАНКА).

Наталля ТРАФІМАВА:

«Настрой трапіць на Алімпіяду ў нас агульны»

— НАТАЛЛЯ, якія ўражанні пакінуў чэмпіянат свету?

— Станоўчыя. Гэта наш дэбют — першы раз у першы клас. Размяшчалі нас нядрэнна. З ежай было крыху горш — не вельмі смачна кармілі.

— А графік гульняў задавальняў?

— Нам не вельмі спадабалася, што нам перастаўлялі час гульняў. Папярэдне мы рыхтаваліся гуляць у адзін час, потым нашы матчы былі нявыгадна для нас перастаўленыя. Так атрымалася, таму што тэлебачанне Францыі выкупіла ўсе тэлевізійныя правы, і яны выбіралі зручны для сябе час трансляцый.

— Удалося справіцца з непрыемнымі эмоцыямі ад паражэння гаспадынямі чэмпіянату?

— Мяркую, застанецца гэта на ўсё жыццё. Самае крыўднае месца — чацвёртае, і яно, на жаль, будзе з намі заўсёды. Мы разумеем, чаму так атрымалася з чэшкамі, але ад гэтага не лягчэй. Гэта спорт, дзе ўсё залежыць не толькі ад нас, гульцоў, але ад іншых нюансаў, на якія мы не ў сілах паўплываць.

— Як капітан вы нешта асаблівае казалі камандзе, каб настроіць дзяўчат перад тым жа матчам з Расіяй?

— Нічога асаблівага. Проста перад матчам з Расіяй мы адчувалі, што можам перамагчы. Прычым у такі час, калі гуляеш за чацвёрку на чэмпіянаце свету, дадаткова нікога настройваць не трэба. Мы даўно адна адну ведаем, і я заўсёды буду казаць, што гуляць у такой камандзе, дзе ўсе адзін за аднаго, прыемна.

— Некаторыя супернікі нашу каманду паранейшаму недаацэньваюць...

— Я б сказала, што нас большасць супернікаў пабойваецца. За столькі гадоў мы дакзалі, што можам з кожным гуляць і ў кожнага выйграць. Баскетбол — даволі вузкае кола, хтосьці з кімсьці ў клубе разам гуляе, мы ўсе нармальна кантактуем. І з размоў мы ведаем, што нас пабойваюцца. З такай пярэдняй лініяй, як у нас, супернікам цяжкавата прыходзіцца.

— У нашай камандзе ёсць гулец, якога найбольш апасаюцца супернікі?

— У нас самая прыгожая каманда, ніхто з нашых баскетбалістак жах ні ў каго не выклікае. *(Смяецца)*. Адметнасць нашай каманды ў тым, што кожная можа стрэліць у той момант, калі гэта патрэбна.

— Якія каманды здзівілі вас на турніры?

— Мы не першы год гуляем на высокім узроўні і маем уяўленне пра большасць зборных. Ведаем іх сілы і нашы. Прайграўшы камандзе Кітая на Алімпіядзе, мы ведалі, што спакойна можам у іх выйграць на нейтральным полі. Так і атрымаліся. З камандай Канады мы некалькі разоў гулялі. Перамагалі і ведалі, што мы проста мацней. Тая ж сітуацыя з Грэцыяй. Напэўна, з нечаканых нашых перамог можна вылучыць толькі гульню з Расіяй. На працягу доўгага часу мы да іх падкрадаліся, але ўвесь час не хапала літаральна крышачку. Калі ўзгадваць таварыскія гульні напярэдадні чэмпіянату свету, то гэта не той паказчык, на які трэба глядзець і параўноўваць каманды. Там трэнер правярае склад, глядзіць усіх гульцоў, шукае звязкі, узаемадзеянні. На чэмпіянаце свету, калі заўважылі, гуляў абмежаваны склад.

— Той склад, які трэнер правяраў у таварыскіх гульнях, здольны стаць вартай вашай зменай у зборнай?

— Мяркую, што прыйдзе іх час, і пабачым, ці змогуць яны трымаць нашу планку.

— Яшчэ як мага даўжэй хацелася б бачыць зборную ў такім складзе...

— У нашых размовах мы настройваемся на тое, што трэба дацягнуць да Алімпіяды, калі дазволіць здароўе і сямейныя абставіны. Зразумела, гэта кожны вырашае індывідуальна. Але думаю, настрой трапіць на Алімпіяду ў нас агульны.

— ЧАЦВЁРТАЕ месца на чэмпіянаце свету можна лічыць пікам для нашай каманды?

— Вядома, не. З года ў год задачы становяцца больш сур'ёзнымі — апетыт прыходзіць падчас яды. Наступная «Еўропа» будзе трамплінам для Лондана-2012, і мы будзем рыхтавацца. Трапіць на Алімпіяду ў нашых сілах.

— Вынік на чэмпіянаце свету больш важкі, чым шостае месца на Алімпіядзе ў Пекіне?

— Так, гэта ж чыста баскетбольныя спаборніцтвы. На Алімпіядзе іншая атмасфера, прадстаўленыя ўсе віды спорту. Там можна пасядзець у сталоўцы побач з Кобі Браянам, сфатаграфавацца з Ражэ Федэрэрам... А чэмпіянат свету — гэта тое наша, дзеля чаго трэба трэніравацца, гуляць і жыць.

— Самы вялікі сюрпрыз на гэтым чэмпіянаце, акрамя самой гульні і чацвёртага месца?

— Судзейства.

— Сапраўды яно настолькі ўплывала на вынік?

— Не заўсёды, але моманты былі. На жаль, яны аказаліся ракавымі. Мы неаднаразова з дзяўчатамі гэта абмяркоўвалі, і прыйшлі да высновы, што патэнцыяльны фінал Беларусь — ЗША рэзаў камусьці слых. Чэхія праводзіць чэмпіянат свету, укладвае вялізныя сродкі, і яны не спыніліся ні перад чым, каб абыграць дэбютанта спаборніцтваў — Беларусь. Тут нічога дзіўнага няма, мяркую, гэта ёсць у любым відзе спорту.

— На ваш погляд, такое размеркаванне месцаў — ЗША, Чэхія, Іспанія — справядлівае?

— Каманда ЗША — гэта машына. Баскетбалісткі ў неверагоднай форме, склад у каманды выдатны. А прадстаўнікі еўрапейскага баскетбола маглі размеркавацца і па-іншаму.

— Судзейства ў матчы з Чэхіяй стала тым момантам, які надламаў каманду і яна не змагла прыйсці ў сябе?

— Пасля такога авертайма з чэшкамі ачухацца не магчыма. Знайсці ў сабе сілы і згуляць на наступны дзень, як нічога ніякага, не атрымаецца. Неяк сябе матывуеш, але гэта тонкая псіхалагічная праца — меней чым за 24 гадзіны знайсці ў сабе сілы і эмоцыі, каб выйсці і згуляць за бронзу.

— Якой была ваша рэакцыя пасля гэтага матчу з гаспадынямі турніру? Плакалі?

— Слёзы былі. Асабіста для мяне гэта адзін з самых складаных момантаў у кар'еры. Але дзякуй балельшчыкам, якія не кінулі нас у цяжкую хвіліну.

— Да матчу з Іспаніяй, акрамя псіхалагічнай, накапілася яшчэ і фізічная стома?

— Графік, вядома, неверагодны на турніры. Але ўсё ж галоўнае не фізічная стома, а недахоп эмоцый, эмацыйны голад — усё пакінулі ў матчы напярэдадні. У будучыні, магчыма, будзем браць з сабой псіхолага, як гэта робяць многія каманды. Бо тут мы зразумелі, што патрэбна знешняя дапамога, каб справіцца з такімі сітуацыямі.

Наталля МАРЧАНКА:

«Такое ўражанне, што чацвёртае месца на чэмпіянаце свету мы займаем кожны тыдзень»

— Што цяпер пераважае: радасць ад выніку ці крыўда ад несправядлівасці ў матчы з Чэхіяй?

— Зразумела, ёсць вялізная задаволенасць і радасць ад нашага дэбюту на чэмпіянаце. Але дзесьці ў глыбіні душы ў мяне застаецца прыкрасць за тое, што маглі зрабіць і больш.

— Як ставіліся на чэмпіянаце да нашай незаслужана пакрыўджанай каманды?

— Нават на сайце чэшскай федэрацыі 800 чалавек павіншавала чэшак з выхадам у фінал, а шэсць тысяч прагаласавала за тое, што яны трапілі туды незаслужана. Мяркую, гэтыя лічбы кажуць самі за сябе.

— Прэміяльныя за чацвёртае месца каманда атрымае?

— Мы атрымалі іх ад Міністэрства спорту і турызму. Так было і пасля чэмпіянатаў Еўропы. Федэрацыя пакуль ніяк не адзначыла наша выступленне. Такое ўражанне, што кожны тыдзень мы займаем чацвёртае месца на чэмпіянаце свету.

— Усе гэтыя перажыванні на чэмпіянаце, пасля турніру таго вартыя?

— Гэта, магчыма, не трэба казаць для чыноўнікаў, але зборная важная для нас. Мы ў камандзе паважаем адна адну, любім, і гуляем адна за адну. Кожнае лета мы збіраемся, каб убачыцца, падтрымаць сяброўак. Чыноўнікі, магчыма, гэтым і карыстаюцца, бо ведаюць, што выступаць мы ні пры якіх абставінах за зборную не адмовімся.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 19 октября 2010 г. в 15.00 СОСТОИТСЯ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН (повторный) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЛИКВИДИРУЕМОГО ПРЕДПРИЯТИЯ, РАСПОЛОЖЕННОГО ПО АДРЕСУ: г. БОБРУЙСК, ул. РАБОЧАЯ, 23, принадлежащего на праве собственности (продавец) – ОАО «Бобруйская мебельная фабрика им. П. Осипенко»

Лот № 1	Кап. строение с инв. номером 710/С-53735 (административное здание) общ. пл. 1130,0 кв.м с подвалом, сходом в подвал, крыльцом и прилегающими сооружениями: забор № 1 – ж/бет. пл. 18,1 кв.м, мощение асф.-бет. пл. 455,0 кв.м, мощение ж/бет. плиты пл. 33,8 кв.м, бордюрный камень, в том числе оборудование: телефонная станция «Кристалл» (инв. № 156), прилавок холодильный 2 ед. (инв. № 71001,71004), холодильная камера (инв. № 71003), вертушка (инв. № 70048), сейф метал. (инв. № 70053), сейф метал. 3 ед. (инв. № 70050), кабинетная мебель (инв. № 70005), прилавок закрытый (инв. № 70067), прилавок под стекло 2 ед. (инв. № 70068)
Лот № 2	Кап. строение с инв. номером 710/С-53732 (мебельный цех 1 (участок 1, участок 2) общ. пл. 3727,0 кв.м. с двумя пристройками, эстакадой бетонной пл. 233 кв.м, рампой бетонной пл. 39 кв.м и прилегающими сооружениями: забор № 1 – ж/бетонный пл. 197,7 кв.м, забор № 2 – кирпичный пл. 10,5 кв.м, мощение ж/бетонные плиты пл. 511,2 кв.м, в том числе оборудование: шкаф электрический 5 ед. (инв. № 46088, 46089, 46061, 46090, 46091), циклон (инв. № 46058), пресс гидравлический (инв. № 41101), установка для пропитки бумаги (инв. № 41105), шахтный подъемник 2 ед. (инв. № 41069, 41071), водопроводная сеть (инв. № 53928)
Лот № 3	Кап. строение с инв. номером 710/С-53713 (цех 3 участок Иглица) общ. пл. 303,0 кв.м с холодной пристройкой, мастерской и прилегающими сооружениями: забор № 1 – кирпичный пл. 10,6 кв.м, забор № 2 – ж/бетонный пл. 84,0 кв.м, ворота металлические пл. 14,6 кв.м, мощение асфальтобетонное площадью 128,9 кв.м
Лот № 4	Кап. строение с инв. номером 710/С-53716 (склад) общ. пл. 422,0 кв.м с прилегающими сооружениями: забор № 1 – ж/бет. пл. 29,6 кв.м, забор № 2 – кирпич. пл. 66,3 кв.м, мощение ж/бет. плиты пл. 196,0 кв.м, в том числе оборудование: кран-балка (инв. № 5004)
Лот № 5	Кап. строение с инв. номером 710/С-53715 (склад ГСМ) общ. пл. 177,0 кв.м. с гаражом и прилегающим мощением асфальтобетонным площадью 643,9 кв.м, в том числе оборудование: выпрямитель (инв. № 46012)
Лот № 6	Кап. строение с инв.номером 710/С-53740 (склад 1) общ. пл. 343,0 кв.м с прилегающими сооружениями: забор № 1 – ж/бетонный пл. 32,3 кв.м, забор № 2 – кирпичный пл. 13,9 кв.м, мощение асфальтобетонное площадью 200,3 кв.м

Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»** (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509)					
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация»					
Общие сведения	**Лот № 1**	**Лот № 2**	**Лот № 3**	**Лот № 4**	**Лот № 5**	**Лот № 6**
Начальная цена продажи, рублей без учета НДС	**367 086 426**	**963 611 359**	**37 740 866**	**117 911 198**	**110 418 450**	**33 392 021**
Размер задатка, рублей	**36 708 640**	**96 361 140**	**3 774 090**	**11 791 120**	**11 041 850**	**3 339 200**
Площадь земельного участка	**0,2294 га,** кадастровый № 741000000008002847	**0,4708 га,** кадастровый № 741000000008002849	**0,1033 га,** кадастровый № 741000000008002851	**0,0726 га,** кадастровый № 741000000008002852	**0,0859 га,** кадастровый № 741000000008002848	**0,0909 га,** кадастровый № 741000000008002850
	правовой режим – постоянное пользование					
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа – Открытое акционерное общество «Бобруйская мебельная фабрика им. П. Осипенко»: р/счет 3012000380018 в Первомайском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Бобруйска, код 329, УНП 700092349**					
Условия продажи	Аукцион без условий					
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона					
Срок и условия оплаты	Определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи					
Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра объекта и внесения задатка						**по 18.10.2010 включительно**

*Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Рэспубліка» № 132 (5044) от 16.07.2010 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

БІЛІ РЫБУ ВАСЦЯМІ

За гэтым заняткам работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі на Сожы ў Чэрыкаўскім раёне заспелі трох мясцовых жыхароў. На «рыбалку» тыя выправіліся ў цёмны час сутак на плавальным сродку, таму выкарыстоўвалі асвятляльнае прыстасаванне — карбідную гарэлку.

Затрыманне адбылося падчас выгрузкі «улову» паблізу прыватнага падворка, дзе браканьеры паспелі схаваць частку незаконна здабытай рыбы. Усяго было канфіскавана 40 кілаграмаў. На асобінах былі сляды ад колючай прылады лоўлі. Шкода прыродзе ацэненая ў больш чым 2,5 мільёна рублёў. Магчымае таксама ўзбуджэнне крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У МІНСК ЕДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ

За 8 месяцаў гэтага года Упраўленнем па грамадзянстве і міграцыі (УГІМ) ГУУС Мінгарвыканкама аформленыя 2450 спецдазволаў іншаземцам на права займацца працоўнай дзейнасцю ў беларускай сталіцы. Як паведаміў начальнік аддзела знешняй працоўнай міграцыі, бежанцаў і прытулку УГІМ Уладзімір Дземчанка, у 2007 годзе такіх дазволаў было выдадзена 604, у 2008-м — 1278, у 2009-м — 3140. Больш за ўсё працоўных-мігрантаў прыязджае ў Мінск з Украіны, краін Прыбалтыкі, Турцыі, В'етнама і Кітая.

Любоў ЯГОРАНКАВА, *«Мінск-Навіны»*.

Лепшая сяброўка маёй мамы паехала жыць у Канаду і напісала, што спачатку суседзі лічылі іх ненармальнымі. Наш чалавек першай справай на прысядзібным участку павінен зрабіць агарод. Пасадзілі яны перчык, памідорчыкі, зяленіва, морквачку. А ў суседзяў толькі газонная траўка ды альпійскія горкі — агароды ў іх высаджваць не прынята. Цяпер вось гэтыя суседзі ходзяць да мамінай сяброўкі па расаду, таму што многія з іх упершыню ў жыцці пакаштавалі сапраўдны памідор і зразумелі: тое, што яны купляюць у сваіх «маркетах», гароднінай назваць цяжка. Так што не заўсёды добра там, дзе нас няма.

САЛАТА «ВОСЕНЬСКІЯ ФАРБЫ»

Вазьміце *2 мясістыя балгарскія перцы, 1 кісла-салодкі яблык, сярэднюю цыбуліну, аліўкавы (ці слабенечнікавы) алей, соль, воцат — на смак.*

Цыбулю наразаем паўкольцамі, апарваем кіпенем, дадаём крыху воцату і даём крыху пастаяць хвілін 10, пасля чаго зліваем ваду. У гэты час рэжам у салатнік даволі буйнымі кавалкамі перац і яблык, дадаём цыбулю, запраўляем алеем, солім — і салата гатова. Атрымліваецца вельмі смачна, майго трохгадовага сына за вушы не адцягнуць ад талеркі.

КУРЫНАЕ ФІЛЕ ГАРАЧАГА ВЯЛЕННЯ

Вазьміце *2 курыныя філе (500 г) або 1 грудку, 0,5 ч. лыжкі солі, перац, воцат.*

Калі выкарыстоўваецца курыная грудка, то зняць з яе скуру і выразаць костку. Выразаць сухажыллі. Абедзве порцыі філе злёгку змазаць воцатам, пасыпаць соллю і буйнамолатым перцам. (2/3 ч. лыжкі солі — для вельмі моцнага пасолу. Калі трэба слабасалёнае філе, то солі класці менш.) Пакласці ў міску і паставіць у халадзільнік на 3—5 гадзін. Перыядычна грудку пераварочваць на іншы бок. Прасоленыя грудкі злёгку абсушыць папяровым ручніком (у выпадку, калі з іх выдзелілася вадкасць). Узяць рашотку з духоўкі і прасунуць паміж яе пруткоў краечак курынага філе. Пракалоць філе драўлянай палачкай, напрыклад, драўляным шампуром для шашлыкоў. Размясціць палачкі так, каб яны ляжалі ўпоперак пруткоў рашоткі. Рашотку паставіць на самы верхні ўзровень духоўкі, а на ніжні ўзровень падставіць пустую бляху — на той выпадак, калі з грудак будзе капаць сок. Духоўку

Краіна здароўя

Выпуск № 53 (222)

Карыснае харчаванне

СВЯТЛАФОР НА ТАЛЕРЦЫ

Па колеры можна даведацца, якія рэчывы ўтрымліваюцца ў прадуктах і стравах, прыгатаваных з іх. Чым больш колераў на талерцы, тым больш вітамінаў у страве.

Ёсць такое дыетычнае правіла — правіла святлафора. Паводле яго, у вас на талерцы заўсёды павінны быць натуральныя прадукты трох колераў — зялёнага, жоўтага і чырвонага. Колер павінен быць натуральным, а не атрыманым пры дапамозе фарбавальніка. Калі вы пастаянна трымаецеся гэтага правіла, можаце не турбавацца: у вашым рацыёне прысутнічае большасць вітамінаў, неабходных арганізму для нармальнай жыццядзейнасці.

Зразумела, правіла не выключае прысутнасці ў вашым меню прадуктаў іншых колераў. Яны не толькі зробяць ваш рацыён больш разнастайным, але і дададуць у яго новыя карысныя рэчывы.

Асабліва важна захоўваць «правіла святлафора» ў дзіцячым меню. Дарэчы, яно можа дапамагчы накарміць пераборлівае малое. Прапануйце дзіцяці самому скласці сваё меню так, каб на талерцы атрымаўся святлафор. Або папрасіце выбраць прадукты трох колераў і пры дапамозе іх «намаляваць» на талерцы якую-небудзь карцінку — траўку з зялёнай цыбулі, сонейка з праменьчыкамі з жоўтага перцу, божую кароўку з чырвонай памідоркі і гэтак далей. За ўдалы «малюнак» выдайце юнаму мастаку прыз, тым больш што малыя звычайна з вялікім задавальненнем з'ядаюць імі ж створаныя шэдэўры. Толькі ні ў якім разе не ўзнагароджвайце дзіця шкоднай ежай — чыпсамі, газіроўкай. Інакш вы зведзяце на нішто ўсе свае высілкі і замест звычкі да карыснай ежы прыўяце малому цягу да каларыйных і шкодных страў. Лепш узнагародзьце дзіця невялікай цацкай, новай кніжкай, мультфільмам або прагулкай у заапарк.

Чырвоны колер гаворыць пра наяўнасць у прадуктах лікапену — магутнага антыаксіляльніка, здольнага супрацьстаяць такому сур'ёзнаму захворванню, як рак. Лікапен утрымліваецца ў чырвоных памідорах, перцах, кавуне, ружовых грэйпфрутах.

Аранжавы колер — прыкмета наяўнасці ў ежы бэта-караціну (папярэднік вітаміну А). Бэта-каратін засцерагае наш арганізм ад дачаснага старэння, умацоўвае зрок, карысны для сэрца і сасудаў. Крыніцамі бэта-караціну з'яўляюцца: морква, аранжавы перац, хурма, гарбуз, манга, персікі, абрыкосы.

Жоўты колер сведчыць пра тое, што прадукт багаты на біяфлаваноіды — магутныя антыаксіданты. Яны ўмацоўваюць сценкі капіляраў, паляпшаюць функцыі печані, зніжаюць узровень халестэрыну ў крыві, дапамагаюць пры лячэнні алергічных захворванняў. Акрамя таго, флаваноіды валодаюць супрацьзапаленчымі і кроваспыняльнымі ўласцівасцямі. Часам біяфлаваноіды называюць «спадарожнікамі вітаміну С», паколькі яны дапамагаюць яго засваенню. На біяфлаваноіды багатыя алыча, бананы, цытрусавыя, жоўты перац, абляпіха, яблыкі, кукуруза, дыня. (Дарэчы, біяфлаваноіды-антацыяны надаюць агародніне і садавіне такія колеры, як малінавы, сіні, фіялетавы, амаль чорны... Прадукты, багатыя на антацыяны: маліны і суніцы, вішні і слівы, чырвоная капуста і чорны вінаград, а таксама буракі, баклажаны, чарніцы.)

Зялёны колер — гэта колер хларафілу (рэчыва, вельмі важнае для крывятворнай сістэмы). Акрамя таго, хларафіл падтрымлівае імунную сістэму, павышае жыццёвы тонус, спрыяе абнаўленню тканак. Уся агародніна і садавіна зялёнага колеру (агуркі, кабачкі, сельдэрэй, капуста, шпінат, ківі) багатая на хларафіл.



АЛЕРГІЮ НА ЯЙКІ Ў НЕМАЎЛЯТ МОЖНА ПАПЯРЭДЗІЦЬ

Каб у вашага дзіцяці небыло алергіі на курыныя яйкі, трэба ўводзіць іх у дзіцячы рацыён да паўгадовага ўзросту, раяць аўстралійскія навукоўцы.

Група даследчыкаў з Мельбурнскага ўніверсітэта і буйнейшага ў Аўстраліі даследчага цэнтра дзіцячага здароўя пры Універсітэце Мэрдака прааналізавалі меню больш як 2,5 тысяч дзяцей. У працэсе работы навукоўцы ўстанавілі адзін вельмі цікавы факт: з дзяцей, якія ўпершыню паспрабавалі яйкі ва ўзросце да паўгода, алергічная рэакцыя адзначалася толькі ў 5,5 працэнта. Між тым у дзяцей, якія ўпершыню пачаставаліся яйкамі пасля года, алергія назіралася ўжо ў 27,5 працэнта выпадкаў. Выходзіць, што немаўляты, у меню якіх яйкі з'яўляюцца да шасцімесячнага ўзросту, церпяць ад алергіі ў пяць раз радзей. «Спачатку мы думалі, што атрыманыя намі звесткі звязаныя са спадчыннасцю, — прызнаецца кіраўнік даследавання Кэці Ален. — Але потым выбралі для абследавання выключна дзяцей, у сем'ях якіх ніхто не цярпеў ад алергіі і экзэмы. І нашы высновы пацвердзіліся». Да нядаўняга часу дыетолагі рэкамендавалі не даваць дзецям яйкі да двух гадоў, калі ў іх ёсць спадчыннасць да алергіі.

Аўтары даследавання таксама лічаць, што ўзнікненне алергіі абумоўлена і тым, як яйкі прыгатаваныя. Пры правільным прыгатаванні алерген, які ўтрымліваецца ў яйку, становіцца бясшкодным. **Па словах навукоўцаў, калі яйка зварана ўкрутую, а не ўваходзіць у склад, напрыклад, пірага, то выпадкі дзіцячай алергіі назіраюцца радзей.**

Алергія на яйкі — адзін з самых распаўсюджаных відаў алергіі сярод немаўлят.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

11 кастрычніка — галоўны ўрач амбулаторыі № 1 г. Мінска Людміла Аляксееўна СЛАЙКОЎСКАЯ.

12 кастрычніка — галоўны ўрач 16-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена Іванаўна КУЛЬБЕДА.

13 кастрычніка — галоўны ўрач 3-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Дзмітрый Ігаравіч СТРАЗДЗІН.

14 кастрычніка — галоўны ўрач 30-й паліклінікі г. Мінска Мікалай Мікалаевіч СКАВАРОДКА.

15 кастрычніка — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Уладзімір Васільевіч ЗАЗЫБА.

«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220 20 25

11 кастрычніка — намеснік галоўна ўрача Мінскага абласнога процітуберкулёзнага дыспансера Вольга Леанідаўна ГАРЭНЮК.

12 кастрычніка — загадчык артапеда-траўматалагічнага аддзялення № 1 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Аляксей Пятровіч МАСЛАЎ.

13 кастрычніка — загадчык неўралагічнага аддзялення № 1 Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Віктар Іванавіч БЕЛАБОСАЎ.

14 кастрычніка — урач арганізацыйна-метадычнага кансультатыўнага аддзела Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансера Мікалай Сяргеевіч ІОНКІН.

15 кастрычніка — загадчык акушэрска-рэабілітацыйнага аддзялення Мінскага абласнога радзільнага дома Валерый Дзмітрыевіч БУЙНЕВІЧ.

Жаночыя сакрэты

Як перамагчы расцяжкі?

КАБ захаваць сваю чароўнасць, жанчыне, як правіла, даводзіцца прыкладваць нямала намаганняў — пастаянна сачыць за сваёй знешнасцю і весці здаровы лад жыцця. Але, нягледзячы на ўсе старанні, аднойчы вы са здзіўленнем можаце выявіць на скуры жывата, сцёгнаў, ягадзіц або грудзей бледна-ружовыя шрамападобныя палоскі — так званыя расцяжкі, або стрыі. Пасля цэлюліту гэта, мабыць, самая актуальная праблема прыгажосці. Што і зразумела: падобны малюнак наўрад ці ўпрыгожыць жанчыну.

У чым праблема?

Узнікненне расцяжак звязанае з глыбінным разбурэннем валокнаў калагену і эластыну. Апошнія забяспечваюць шчыльнасць і эластычнасць скурнага покрыва. Часцей за ўсё стрыі з'яўляюцца ў перыяд палавога сталення, пры моцным прыбаўленні вагі або падчас цяжарнасці, пры захворваннях эндакрыннай сістэмы. Звязана гэта з гарманальнай перабудовай арганізма. Гармоны-«разбуральнікі» скурных валокнаў выпрацоўваюцца ў наднырачніках, і паўплываць на працэс практычна немагчыма. Спецыялісты лічаць, што стрыі могуць узнікаць пры індывідуальнай схільнасці. Таму правільна харчавацца і даглядаць скуру жанчынам неабходна заўсёды, але асабліва актыўна — у «крытычныя» перыяды жыцця. Расцяжкі могуць з'яўляцца ўжо з 3-га месяца цяжарнасці, але найбольш адчувальная скура ў апошнім трыместры.

Што рабіць?

Цудаў не бывае. І можаце не спадзявацца, што расцяжкі, якія аднойчы з'явіліся, знікнуць самі па сабе. Як і з любой праблемай, з гэтай бядой трэба весці барацьбу. Трэба толькі добра спланаваць праграму. Пачнём знутры.

Першы пункт — харчаванне. Каб скура была эластычнай, неабходна на працягу дня выпіваць не менш як 2—2,5 л вады. Старайцеся ўжываць як мага менш прадуктаў, якія ўтрымліваюць канцэнтраты і кансерванты. Захоўвайце натрыева-каліевы баланс: менш натрыю, г.зн. солі, больш калію, якога шмат у грушах, куразе, разынках, абрыкосах. Уключайце ў штодзённы рацыён усе неабходныя вітаміны, мікраэлементы, бялкі і поліненасычаныя кіслоты, якія прысутнічаюць у алеях. Надзвычай важны для здароўя скуры вітамін А. Ён утрымліваецца ў малочных прадуктах, яйках, печані.

Другі пункт праграмы — разнастайныя хатнія гігіенічныя працэдуры. Прымаючы штодзённы душ, накіроўвайце струмені вады на жывот, сцёгны і грудзі. Не забывайце пра лёгкі масаж цвёрдай рукавічкай з крэмам для адлушчвання. Апошні ачысціць скуру ад адмерлых часціц, палепшыць яе кровазабеспячэнне і дыханне. Пасля душу разатрыце скуру сцёгнаў, ягадзіц і жывата махровым рушніком, а затым злёгку пашчыпайце (жывот — у кірунку па гадзіннікавай стрэлцы) указальным і вялікім пальцамі да лёгкага пачырвянення. Добры эфект дае масаж з араматычнымі алеямі. Аднак для цяжарных дазіроўка складае палову ад звычайнай дозы. Выкарыстоўвайце толькі прыродныя, а не сінтэтычныя алеі.

У чыстым неразведзеным выглядзе цяжарным нельга прымяняць кіпарысавы, кедравы, імбірны, піжмавы алей, а таксама алей мацярдушкі, мяты балотнай і чабору: яны могуць справакаваць выкідыш або аказаць таксічнае дзеянне на малое. Памятайце, калі вы схільныя да алергічных рэакцый, не варта праводзіць эксперыменты падчас цяжарнасці.

Такім чынам, масіруйце скуру далікатнымі пагладжвальнымі рухамі, папярэдне нанёсшы алей зародкаў пшаніцы, жажаба або рамонкавы алей. ***Можна прыгатаваць наступны гаючы склад: алей абрыкосавых костачак — 100 кропляў, рыцына — 60 кропляў, алей жажаба — 30 кропляў, лавандавы алей — 10 кропляў.*** Змяшайце і выкарыстоўвайце ў якасці масажнага сродку кожны дзень, злёгку ўціраючы ў скуру ў праблемных месцах.

Для змяншэння верагоднасці з'яўлення расцяжак, паляпшэння эластычнасці і вонкавага выгляду скуры падыдзе наступная сумесь алеяў: персікавы або мінданьны алей — 100 мл, ружавы алей — 10 кропляў, вітамін А — 10 кропляў, вітамін Е — 15 кропляў. Змяшайце алеі ў бутэлечцы з цёмнага шкла і захоўвайце яе ў халаднаватым месцы.

Да прафілактычных сродкаў адносяць ванны з дабаўленнем экстрактаў лекавых раслін. ***Наступны рэцэпт умацуе скуру і зробіць яе больш эластычнай. 500 г сумесі сухіх пялёсткаў шыпшыны, белай лілеі, лаванды і язміну, узятых роўнымі часткамі, заліце 4—5 л халоднай вады. На слабым агні давядзіце да кіпення, настойвайце на працягу гадзіны, працадзіце — і сродак гатовы. Дадавайце яго ў ванну, тэмпература вады якой не павінна перавышаць 35—36 градусаў; працягласць прыёму — 10 хвілін.***

Для згладжвання расцяжак, якія ўжо ўтварыліся, можна выкарыстоўваць кампрэсы з эфірнымі алеямі. Для гэтага намачыце марлевую сурвэтку або кавалачак мяккай тканіны ў сумесі з кефіру (1 ст. лыжка) і ружавага алею (4 кроплі) і прыкладзіце да праблемнага месца на 7—8 гадзін. Працэдуру рэкамендуецца праводзіць тры разы на тыдзень на працягу трох месяцаў. Вы ўбачыце, як скура паступова будзе разгладжвацца, а мудрагелісты малюнак — станавіцца менш прыкметным.

Пры вырашэнні праблемы расцяжак, вядома ж, не абысціся без прамысловых касметычных сродкаў, якія выпускаюцца ў выглядзе крэмаў, алеяў і геляў. Прысутныя ў іх раслінныя экстракты і бясшкодныя хімічныя рэчывы стымулююць сінтэз калагену і эластыну ў скуры, дзякуючы чаму яна становіцца больш пругкай, набывае здольнасць расцягвацца без непрыемных наступстваў. Пры своечасовым і правільным выкарыстанні касметычных сродкаў палоскі на целе становяцца больш светлымі і практычна непрыкметнымі.

Трэці пункт у плане барацьбы за прыгажосць — наведванне касметалагічнага салона. Самай эфектыўнай працэдурай спецыялісты лічаць мезатэрапію — падскурныя мікраін'екцыі кактэйляў з вітамінамі С і В, бурымі водарасцямі, экстрактам з лісця арэшніка. Курс складае 5—15 працэдур у залежнасці ад узросту і колькасці расцяжак. У выніку скура падцягваецца, змяншаецца глыбіня стрый і адбываецца іх максімальнае абяскколернне. Яшчэ адзін метад — пілінг фруктовымі кіслотамі, асноўнымі кампанентамі якога з'яўляюцца гліколевая і малочная кіслоты. Пры гэтым згладжваюцца няроўнасці скуры, паляпшаюцца яе колер і вонкавы выгляд. У салоне вам таксама прапануюць прайсці курсы грязевых і водарасцевых абгортванняў. Гэтыя працэдуры паляпшаюць кровазварот у праблемных зонах, узмацняючы тым самым кletкавае абнаўленне і дыхання скуры. Працэдура мікратокавай тэрапіі — уздзеянне імпульсными токамі на тканкі арганізма — уплывае непасрэдна на кletкі скуры. На месцы старой расцяжкі фарміруецца новая здаровая тканка. Курс — 5—15 працэдур. Трэба адзначыць, што маладым мамам падобныя салонныя працэдуры рэкамендуецца праходзіць пасля заканчэння грудного кармлення, каб пазбегнуць неспрыяльнага ўздзеяння на малога.

Чацвёрты, немалаважны, пункт уключае ў сябе рэгулярныя заняткі спортам, плаванне. Падобныя аздараўленчыя працэдуры паляпшаюць дастаўку пажыўных рэчываў да кletак і абмен рэчываў у цэлым, павялічваюць пругкасць і эластычнасць скуры.

Галоўнае — пры з'яўленні стрый нельга ўпускаць час! Ад застарэлых глыбокіх расцяжак пазбавіцца вельмі няпроста, а ад тых, якім не больш як паўтара года, — цалкам магчыма. «Маладыя» стрыі добра паддаюцца карэкцыі.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Да ведама

ХТО ТАМ ПЛАВАЕ?

ЧАГО толькі ні кажуць пра басейны: маўляў, і хламідыі там жывуць, і грыбкі, а ад хлоркі скура сохне і валасы цьмянеюць. Няўжо гэта праўда?

Неразумна лічыць, што ў вадзе басейна няма заразных мікробаў. Яны жывуць там, гэтаксама як і ў любым іншым водным асяродку, хай гэта водаправодная вада або рэчка ў вёсцы. Таму галоўнае ў басейне — гэта сістэма фільтрацыі, якая дазваляе ажыццяўляць няспынную ачыстку вады, што, уласна, і адрознівае басейн, як складанае гідратэхнічнае збудаванне, ад ванны. Вада ў ім не стаіць, а пастаянна цыркулюе на працягу сутак, шасціразова праходзячы ачыстку электролізам і фільтрамі. Некаторыя басейны дэзынфікуюць з дапамогай азону або ультрафіялету. Гэта працэдура — дарагая, таму і цана за білет у такі басейн у разы вышэйшая, чым у «звычайны», дзе ваду па-ранейшаму хларуюць, што значна танней. Але хлор забівае бактэрыі, якія трапляюць у ваду, не адразу, а толькі праз 45 хвілін. А вільготнае, цёплае асяроддзе душавых з'яўляецца ідэальнай умовай для перадачы грыбковых захворванняў.

Цяпер пра немачы, якія адносяцца да групы ЗППШ (захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам). Бытавы шлях перадачы гэтых інфекцый (праз ручнік, мачалку і г.д.) магчымы, але верагоднасць заражэння такім спосабам вельмі малая. Любы шкодны мікроб павінен патрапіць на слізістую абалонку палавых органаў або пранікнуць у кроў і — самае галоўнае — «прыжыцца» там. А для гэтага патрэбен час або сур'ёзная траўма.

Самыя ж частыя «пабочныя эфекты» басейна — гэта кан'юнктывіты (запаленне злучальнай абалонкі вока), атыты (запаленне сярэдняга вуха) і мікозы пазногцяў або ступняў (грыбковыя інфекцыйныя захворванні).

СЦЕРАЖЫЦЕСЯ!

Захоўваючы правілы асабістай гігіены, вы ніколі не зведаеце на сабе наступстваў гэтых дробных, але непрыемных хвароб. Такім чынам...

- Не глытайце ваду ў басейне! Гучыць смешна, але вельмі часта прычынай расстройства жывата якраз з'яўляецца хлараваная вада.
- Не наведвайце басейн у «крытычныя дні», нават калі рэклама сродкаў гігіены запэўнівае вас у адваротным.
- Калі вы толькі што перахварэлі на ВРЗ, грып або проста без прычыны адчуваеце слабасць ва ўсім целе, лепш прапусціць наведванне.
- Перад наведваннем басейна і пасля прымайце душ і карыстайцеся толькі індывідуальным купальнікам, гумавымі сланцамі і лазневымі прыладамі. Ніколі не перадавайце іх нават лепшаму сябру!
- Пасля басейна добра высушыце валасы.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Ватыкан асудзіў прысуджэнне Нобелеўскай прэміі аўтару тэхналогіі ЭКА

Ватыкан асудзіў рашэнне Нобелеўскага камітэта ўручыць прэмію ў галіне медыцыны брытанцу Роберту Эдвардсу за распрацоўку тэхналогіі экстракарпаральнага апладнення (ЭКА), паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на італьянскія СМІ.

Адпаведную заяву зрабіў кіраўнік Папскай акадэміі Pro Vita («За жыццё») Ігнасіа Караска дэ Паўла, які надзелены паўнамоцтвамі выказвацца ад імя Ватыкана па пытаннях медыцыны і этыкі.

Дэ Паўла назваў уручэнне Нобелеўскай прэміі за тэхналогію экстракарпаральнага апладнення вельмі няправільным.

Прадстаўнік каталіцкай царквы ўсклаў на Эдвардса адказнасць за тое, што ў свеце ўзнік рынак, на якім прадаюцца мільёны яйцаклетак. Яны захоўваюцца ў замарожаным выглядзе, пры гэтым толькі частка гэтых яйцаклетак у канчатковым выніку ператвараюцца ў дзяцей, а астатнія асуджаныя на пагібель. Менавіта па прычыне смерці вялікай колькасці эмбрыёнаў падчас прымянення тэхналогіі ЭКА Ватыкан лічыць апладненне in vito (з прабіркі) амаральным.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРИВАТИЗАЦИИ

Открытый конкурс по продаже объектов приватизации коммунальной собственности г. Минска состоится 10 ноября 2010 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. № 310.

Продавец и организатор конкурса: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

НА КОНКУРС ВЫСТАВЛЯЮТСЯ:

№ лота	лот № 1	лот № 2	лот № 3
Предмет конкурса	Структурное подразделение ПТ КУП «Чайка» (прачечная самообслуживания)	Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания)	Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания)
Место нахождения предмета конкурса	г. Минск, ул. Пожарского, 27	г. Минск, ул. Ташкентская, 7	г. Минск, ул. Московская, 20
Начальная цена предмета конкурса, руб.	1 196 734 676	27 232 021	64 711 877
Размер задатка (рублей), порядок и сроки его перечисления	119 673 468 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	2 723 200 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	6 471 200 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Сведения об объектах недвижимого имущества, входящих в состав объектов приватизации	Здание специализированное для бытового обслуживания населения (прачечная) с инвентарным номером 500/С – 30793, общая площадь – 702 м²; здание специализированное коммунального хозяйства (котельная) с инвентарным номером 500/С – 30792, общей площадь – 278 м².	Арендуемая площадь – 129,6 м².	Арендуемая площадь – 287,4 м².
Условия конкурса	1. Частичное сохранение профиля объекта приватизации. 2. Сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения). 3. Погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи	1. Частичное сохранение профиля объекта приватизации. 2. Сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения). 3. Погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи	1. Частичное сохранение профиля объекта приватизации. 2. Сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения). 3. Погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи
Приоритетное условие для определения победителя конкурса	Наивысшая цена предмета конкурса	Наивысшая цена предмета конкурса	Наивысшая цена предмета конкурса
Условия оплаты	Оплата за объект приватизации производится в бюджет г. Минска в рассрочку*	Оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска	Оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска
Численность работающих, человек	10	4	4
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий	нет	нет	нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов	нет	нет	нет
Финансовое состояние структурного подразделения: Активы по балансу, рублей	1 209 092 814	30 117 896	70 660 980
Финансовое состояние структурного подразделения: Задолженность кредиторская, рублей	12 358 138	2 885 875	5 949 103

* – порядок оплаты за объект приватизации в рассрочку установлен Инструкцией о порядке индексации платежей при продаже объектов приватизации в рассрочку, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 05.09.2006 № 36.

Порядок проведения конкурса определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Продавец (организатор конкурса) вправе отказаться от проведения конкурса в любое время, но не позднее чем за 30 дней до наступления даты его проведения.

Заявления на участие в конкурсе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 8 ноября 2010 года включительно.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения конкурса.

При поступлении заявления на участие в конкурсе от одного участника и соответствии его предложения условиям конкурса продажа предмета конкурса по решению комиссии производится этому лицу на предложенных им условиях.

Победитель конкурса в сроки, указанные в протоколе о результатах конкурса, обязан возместить организатору конкурса затраты, связанные с организацией и проведением конкурса, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом конкурса при заключительной регистрации под роспись.

Новым собственникам объектов приватизации (лоты №№ 2, 3) гарантируется право на заключение долгосрочного договора аренды занимаемых структурными подразделениями помещений, относящихся к коммунальной собственности г. Минска и не вошедших в состав приобретаемого имущества, сроком на 15 лет.

Осмотр предмета конкурса на местности участниками конкурса производится представителем Управления бытового обслуживания населения Мингорисполкома, **конт. тел. (8017) 227 21 60,** коммунального унитарного предприятия «Бытэкс», **конт. тел. (8017) 203 25 65**, коммунального унитарного предприятия «Чайка», **конт. тел. (8017) 281 12 58.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Открытый аукцион с условиями (далее – аукцион) по продаже объекта коммунальной собственности г. Минска состоится 11 ноября 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Продавец: Ремонтно-строительное коммунальное унитарное предприятие «МАФ», 220099, г. Минск, ул. Казинца, 7а, ком. 1, конт. тел. (8017) 278 81 63, 278 38 00.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, д. 8, каб. 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЕТСЯ:

1	Наименование и местонахождение предмета торгов	Изолированное помещение санитарно-бытового назначения по пр. газеты «Правда», д. 20, пом. 2
2	Инвентарный номер объекта	500/D - 708003718
3	Общая площадь (м.кв.)	128,3
4	Начальная цена предмета торгов (руб.)	92 495 517
5	Размер задатка (рублей), порядок и сроки его перечисления, реквизиты расчетного счета	9 249 550 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
6	Условия аукциона	1. Изменение функционального назначения при условии сохранения в составе нового объекта общественного туалета. 2. Оплата производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.
7	Характеристика предмета торгов	Фундамент – монолитный железобетон; стены – монолитные железобетонные, кирпичные; перегородки – кирпичные; перекрытия – железобетонные плиты; проемы дверные – деревянные; полы – плиточные, бетонные. Телефонная связь, электроосвещение, вентиляция – отсутствуют.

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Продавец, Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. Предмет торгов может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 9 ноября 2010 года.

Победителем торгов по лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона.

Победитель аукциона в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить Организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов при заключительной регистрации под роспись.

Осмотр предмета торгов на местности участниками аукциона производится Продавцом: конт. тел. **(8017) 278 81 63, 278 38 00.**

ДЗЕНЬ К*

Міністру культуры падказваюць ідэі сябры-дыпламаты

Бліжэйшую нядзелю Павел Латушка правядзе, як і належыць культурнаму чалавеку: пойдзе на балетны спектакль «Чайка» славутай Санкт-Пецярбургскай трупы пад кіраўніцтвам Эйфмана. Гэта і будзе лепшым святкаваннем Дня работнікаў культуры для міністра. І ў гэты ж дзень ён плануе сустрэцца з сябрамі па сваёй ранейшай дыпламатычнай працы, якія вельмі неабыякава ставяцца да падзей у культурнай галіне і нават дзеляцца ідэямі, як можна якасна ўзнімаць ды прасоўваць беларускую культуру. Напярэдадні прафесійнага свята работнікаў культуры Павел Паўлавіч прыадкрыў планы на тое, што рэвалюцыйна новага з'явіцца ў культурнай Беларусі ў бліжэйшы час:

Рада дзеля парадаў

— На разгляд Саўміна ўнесены праект пастановы аб стварэнні Рэспубліканскай рады па справах культуры і мастацтва, склад якой увойдзе каля 90 выбітных і маладых дзеячаў культуры нашай краіны. Важна пачуць голас тых людзей, якія працуюць у сферы культуры, кансультавацца з імі, перш чым прымаць важныя стратэгічныя рашэнні. Я ўжо нават выслухаў некалькі прапаноў. Адна з іх — змяненне нарматыўнай базы ў справе захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Другая прапанова сыходзіла ад мяне і тычылася тэатральнага мастацтва, якое мне падаецца элітнай сферай. Ці дастаткова тэатраў у краіне? Мы павінны і якасна ўзрастаць і колькасна ў тэатральным мастацтве. Таму прынята рынцыповае рашэнне аб завяршэнні рэканструкцыі на працягу бліжэйшых трох гадоў усіх 27 рэспубліканскіх і рэгіянальных тэатраў краіны.

Упершыню распрацавалі праект дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады. Вялікая ўвага надаецца пытанням далейшага развіцця матэрыяльнай базы і павышэння чалавечага капіталу сферы культуры, даступнасці культурнага дабрабыту.

Для нас вельмі важна, каб мы эканамічна пацвердзілі ўмацаванне прэферэнцый для нацыянальнай культуры. З гэтай нагоды мы пачалі распрацоўку праектаў адпаведных нарматыўна-базавых актаў, якія створаць істотныя падатковыя льготы для ўсіх, хто ўкладвае сродкі ў сферу культуры. Гэта павінна паспрыяць развіццю сістэмы мецэнацтва і спонсарства. Гэтаму будзе служыць стварэнне апякунскіх радаў пры арганізацыях культуры нашай краіны. Міністэрства будзе пашыраць фінансаванне праз праектную дзейнасць розных прыватных ініцыятыў, як гэта было пра падрыхтоўцы спектакля «Мінск, я люблю цябе» па творах маладых беларускіх драматургаў.

Скарбы і «Скарбніца»

— Мы пачалі падрыхтоўку змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» і распрацоўку новага закона аб ахове археалагічных аб'ектаў. Плануем актывізаваць узаемадзеянне з грамадскай камісіяй і грамадскімі арганізацыямі. Гэта важна, таму што спіс аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны краіны пашыраецца. У верасні статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены 472 аб'ектам. Больш чым на 100 аб'ектах спадчыны праводзяцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. Ужо сёлета адчыніцца Мірскі замак пасля рэстаўрацыі, а ў ліпені 2011 года адчынім дзверы ў палацы ў Нясвіжы. Вельмі важная акцыя па збору сродкаў на аднаўленне Навагрудскага замка. Дзякуючы грашовай латарэі «Скарбніца», заснавальнікам якой з'яўляецца Міністэрства культуры, мы закамулюем каля 100 мільёнаў рублёў, якія пералічым сёлета на распрацоўку праекта дакументацыі аднаўлення і кансервацыі гэтага аб'екта. Далейшае аднаўленне помнікаў спадчыны можа і павінна адбывацца праз наступныя крыніцы фінансавання: дзяржаўны бюджэт, грамадская падтрымка, прыватны капітал, праекты з суседнімі краінамі.

Дэкларацыя незалежнасці

— У наступным годзе будзе адкрыты новы музей — беларускай дзяржаўнасці. Выдзелена памяшканне, у якім створыцца музей, які будзе мець самае сучаснае абсталяванне, дзе будуць выкарыстоўвацца сучасныя мультымедыйныя тэхналогіі. Ён будзе працягам экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея і ахопіць перыяд ад 90-х гадоў да сённяшніх дзён. Будуць паказаны ўнікальныя дакументы, пачынаючы ад дэкларацыі аб незалежнасці Рэспублікі Беларусь, іншыя найважнейшыя дзяржаўныя дакументы, падарункі нашай краіне. Яго будуць наведваць дэлегацыі іншых краін і грамадзяне Беларусі.

Нашы класікі — у сталіцах свету

— Першы праект «Культурная сталіца СНД» будзе рэалізаваны ў адным з гарадоў Беларусі. Папярэдняя дамоўленасць была дасягнутая 4 кастрычніка на сустрэчы міністраў краін СНД. А ў верасні 2010 года Беларусь афіцыйна далучылася да культурнага праекта «Савет Еўропы. Кіеўская ініцыятыва».

Прадугледжваецца адкрыццё да 2015 года культурных цэнтраў Беларусі ў замежных краінах: у Маскве, Вільнюсе, Берліне, Празе і Вене.

Падпісаны загад аб конкурсе на стварэнне помніка Купалу і Коласу ў Варшаве — ёсць згода на ўсталяванне ад уладаў сталіцы Польшчы. Абмяркоўвалі магчымасць усталявання помніка Францішку Скарыне ў Вільні. Ужо адліты будучы помнік Уладзіміру Караткевічу, які плануем усталяваць сёлета ў Кіеве. Міністэрства сумесна з Беларускім фондам культуры рэалізуе праект выдання твора Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне каралеўскага Стаха» на беларускай, рускай, украінскай і англійскай мовах.

У наступным годзе мы будзем святкаваць 120-годдзе Багдановіча, а яшчэ праз год — 130-годдзе Купалы і Коласа. Да гадавін адновім усе музеі нашых класікаў.

Кіно і сродкі

— Будзе прадстаўлены падыход па стварэнні сістэмы падатковых ільготаў для сферы кінавытворчасці. Мы плануем стварыць дзяржаўны прадзюсарскі цэнтр кіно для павышэння якасці кінавытворчасці. Плануем стварыць канкурэнтны асяродак у кінасферы, даўшы магчымасць прэтэндаваць на сродкі дзяржбюджэта не толькі дзяржаўным, але і прыватным кінакампаніям. І спадзяёмся, што будуць з'яўляцца інвестары. Будзем спрыяць уключэнню айчынных тэлеканалаў у кінавытворчасць — яны могуць прымаць удзел у здымках беларускіх серыялаў. Сацыяльная падтрымка будзе дакументальнаму кіно. Яно найбольш складанае з пункту гледжання вяртання ўкладзеных сродкаў у сферы кінамастацтва. Мы чакаем, што кінадакументалісты будуць больш актыўнымі ў прапрацоўцы сумесных праектаў з замежнымі кінакампаніямі. Моладзь, якая хоча сказаць сваё слова ў кіно, плануем накіроўваць на стажыроўку і адукацыю ў лепшыя кінашколы Еўропы. Важна сетку кінапракату прывесці да еўрапейскага стандарту. Прэзідэнтам прынцыпова падтрымана рэформа кінасферы нашай краіны.

З лістапада ўзнаўляецца будаўніцтва і рэканструкцыя кінастудыі «Беларусьфільм» і Тэатра-студыі кінаакцёра за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Лібералізм з «жывым гукам»

— Вельмі важная ініцыятыва, якая была падтрымана кіраўніцтвам нашай краіны і ўжо ў верасні прынята адпаведная пастанова Савета Міністраў — заснаванне нацыянальнай тэатральнай прэміі ў Беларусі. Пачнём ужо сёлета, а падвядзём вынікі на Міжнародны дзень тэатра 27 сакавіка 2011 г.

Будзем распрацоўваць канцэпцыю развіцця эстраднага мастацтва краіны, дзе ўхіл робіцца на пашырэнне жывога гуку. У верасні падтрымана рашэнне Прэзідэнтам аб лібералізацыі канцэртнай дзейнасці ў Беларусі.

Ад «музейнага квартала» да Венецыі

— Падтрымана прапанова аб стварэнні «музейнага квартала» ў межах вуліц Леніна, Маркса, Кірава ў Мінску. Падтрымана заснаванне ў «музейным квартале» Рэспубліканскага рэстаўрацыйнага цэнтра. Ёсць дамоўленасці з іншымі краінамі аб абмене спецыялістамі ў галіне рэстаўрацыі, будуць стажыроўкі нашых студэнтаў-рэстаўратараў у Расіі. Міністэрства працуе над стварэннем у Мінску цэнтра сучаснага мастацтва, які стане, на нашу думку, месцам для розных напрамкаў мастацтваў. Думаем і пра саміх творцаў: майстэрні для мастакоў, асабліва для маладых, будуць прадастаўляцца па льготным кошце.

Ужо падпісана дамова аб арэндзе выставачных плошчаў на плошчы Сан-Марка ў Венецыі, дзе налета пройдзе вядомая ў свеце біенале сучаснага мастацтва. Міністэрства разам з музеем сучаснага выяўленчага мастацтва актыўна вядзе падрыхтоўку нашага вяртання на Венецыянскую біенале. Плануем прыняць удзел у біенале ў Празе. Падтрымку гэтых праектаў аказвае «Пріорбанк».

Рэспубліканская выстава выяўленчага мастацтва прайшла не толькі ў сталіцы, але ахапіла і рэгіёны: прадстаўлена каля 50 праектаў у 18 музеях і галерэях нашай краіны. Гэты праект захаваецца, але, магчыма, будзе ладзіцца не кожны год. На наступны год будзе новы праект — упершыню адбудзецца рэспубліканская выстава манументальнага мастацтва.

Інавацыі і самаахвярнасць

— У рамках дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы міністэрству выдаткавана сёлета каля 74 мільярдаў рублёў — з дапамогай гэтых сродкаў працуем на паляпшэнне матэрыяльнай базы ўстаноў культуры. Асабліва гэта актуальна ў рэгіёнах: напрыклад, сёння толькі 23 працэнты бібліятэк камп'ютарызаваныя. Таму бліжэйшы клопат — камп'ютарызаваць усе бібліятэкі нашай краіны. Мы робім стаўку на развіццё дзяржаўнага і прыватнага партнёрства і інавацый у сферы культуры.

Важным прыярытэтам для нас стала пытанне развіцця эканомікі культуры. Яна, на жаль, дыктуе ўмовы. Але дзеля новага падыходу ў фінансаванні нашых арганізацый важна павысіць зацікаўленасць з боку творчых арганізацый, каб зарабляць больш грошай, якія будуць накіроўвацца на павышэнне заробкаў людзей, якія працуюць аддана і часам самаахвярна.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Жыранделя
Наш культурны асяродак
Выпуск № 25 (111)

БАБІНА ЛЕТА З НІНАЙ МАЦЯШ

7 кастрычніка ў Белаазёрску прайшлі паэтычныя чытанні памяці Ніны Мацяш. Канферэнцыю назвалі «Бабіна лета ў Белаазёрску разам з Нінай Мацяш».

Паэтку і яе творчасць згадвалі сябры, калегі, прадстаўнікі грамадскасці ў зале Белаазёрскага Дома культуры. Зноў гучалі яе праніклівыя лірычныя радкі, згадвалі і вялікую перакладчыцкую спадчыну пісьменніцы.

Ніна Мацяш нарадзілася 20 верасня 1943 года ў вёсцы Нівы Бярозаўскага раёна. Скончыла факультэт французскай мовы Мінскага інстытута замежных моў. Першы верш надрукавала ў 1962 годзе. Выйшла некалькі зборнікаў яе паэзіі. Перакладала з польскай, нямецкай, але найбольш — з французскай мовы.

Яна СВЕТАВА.

Аркестр у джынсах на сцэне філармоніі? Чаму б і не?!.

Гэтая і іншыя рэвалюцыйныя прыдумкі завабяць публіку на канцэрты Дзяржаўнага камернага аркестра.

Кіраўнік і дырыжор аркестра, заслужаны артыст Расіі Яўген Бушкоў лічыць, што з публікай трэба працаваць па-сучаснаму. Напрыклад, з дапамогай абанементных серый, якія распрацаваныя на ўвесь канцэртны сезон калектыву. І гэтыя планы непарушныя — іх скарэктаваць можа хіба які ісландскі вулкан...

Адкрыццём сезона стане канцэрт 10 кастрычніка ў Вялікай зале філармоніі, дзе разам з беларускімі музыкантамі ўпершыню выступіць славуты аўстрыйскі піяніст Паўль Бадура-Шкода, які выступаў у лепшых канцэртных залах свету і мае найбольшую колькасць прададзеных запісаў: ён запісаў больш за 200 дыскаў, сярод якіх усе фартэпіянныя санаты Моцарта, Бетховена і Шуберта. У Мінск музыкант прыедзе па запрашэнні дырыжора беларускага аркестра перад сваім японскім турнэ.

Гэты канцэрт стане і адкрыццём абанемента № 1. Але над закрыццём яго цягам часу могуць працаваць усе прыхільнікі калектыву і гледачы. І хоць закрывацца сезон збіраюцца толькі ў чэрвені, але час пройдзе хутка і замаўляць творы можна ўжо зараз — напрыклад, пакідаць заяўкі на сайце калектыву. Аднак трэба абавязкова мець на ўвазе, што зоркай апошняга ў сезоне канцэрта Камернага аркестра будзе выдатная піяністка Элісо Вірсаладзэ, якая зараз жыве ў Германіі.

Аднак пакуль тое закрыццё, калектыў адыграе яшчэ тры абанементы. № 2: «Хіт для ўсіх», гэта добра знаёмыя тэмы. Напрыклад, музыка Мікаэла Тарывердзіева, вядомая па кінафільмах. Ці «Рэквіем» Моцарта, дырыжыраваць якім будзе кіраўнік Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Аляксандр Анісімаў. Ды і ў гэтых канцэртах будуць запрошаныя госці з-за мяжы, напрыклад, з Амерыкі. Цікавымі імёнамі завабіць і абанемент №3 «Суботнія прэм'еры». Але самым «прасунутым» абанементам будзе №4: «Класіка — гэта класна» для самай «адарванай» моладзі, які Яўген Бушкоў будзе весці сам, даючы няцяжкія ўрокі музычнай мовы. Моладзь, магчыма, прасцей завабіць джынсамі на музыкантах. Але як яе прымусіць слухаць сур'ёзныя творы? У праграме ж ёсць нават аднаактовая опера для дзяцей «Хлопчык, які вельмі хутка рос» Меноці. Пра хлопчыка, які хацеў, каб над ім не пасміхаліся з-за высокага росту, і дзеля гэтага заключыў дамову, што будзе сябе паводзіць, як усе. Аднак у школе здарыўся тэракт і менавіта гэты хлопчык, калі ўсе баяліся, здолеў аказаць супраціўленне і ўратаваў людзей. Гэтую оперу дырыжор ужо ставіў у Маскве — за тры гады да трагедыі ў Беслане...

— Абанементы для дзяцей вельмі важныя, бо з іх потым вырастуць людзі, якія будуць хадзіць на канцэрты, і, безумоўна, удзельнічаць у культурным працэсе, — гаворыць Яўген Бушкоў. — Наш абанемент прадуманы такім чынам, каб зрабіць дзяцей саўдзельнікам — не толькі забаўляць іх, але адукоўваць і выхоўваць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

КШЫШТАФ ЗАНУСІ — ГАНАРОВЫ ПРАФЕСАР ГрДУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

9 кастрычніка ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы адбудзецца цырымонія ўручэння атрыбутаў Ганаровага прафесара гэтай ВНУ польскаму рэжысёру Кшыштафу Занусі. Потым ён прачытае лекцыю на тэму «Стратэгія жыцця» і адкажа на пытанні сваіх слухачоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

5 ГАРАДОЎ, ЯКІЯ ПАВІНЕН НАВЕДАЦЬ КОЖНЫ БЕЛАРУС (5 суб'ектыўных меркаванняў)

ВОСЬ як раней было: для таго, каб пабачыць, напрыклад, партрэт Моны Лізы, трэба было выпраўляцца ў далёкае і небяспечнае падарожжа. Яно магло цягнуцца нават некалькі месяцаў, бо простыя людзі ў часы Адраджэння часцей за ўсё вандравалі пешшу... Сёння для таго, каб пабачыць што заўгодна, чалавеку не трэба нават з дому выходзіць! Усё бяспечна, зручна, інтэрактыўна. Усё ёсць у інтэрнэце. Можна нават он-лайн павандраваць па краінах, гарадах, музеях... Але гэтае «што заўгодна» страціла сёння такую значнасць, якую мела раней. Проста з-за таго, што стала так лёгка даступнае. Мне ўсё ж здаецца, што жывую вандроўку не заменяць ніякія вынаходніцтвы цывілізацыі. Кожны з гарадоў свету мае нейкую сваю атмасферу, гісторыю, душу, якія не здолеюць перадаць ні вэб-камеры, ні фотаздымкі, ні сканструяваныя ў аб'ёме макеты гарадоў, па якіх можна паблукаць он-лайн. Я звярнулася да пяці чалавек, якія займаюцца літаратурай, тэатрам, музыкай, выяўленчым мастацтвам і разам з тым вельмі любяць падарожнічаць і маюць багаты «вандроўны» досвед. Яны падзяліліся са «Звяздой» сваімі думкамі наконт таго, якія гарады кожнаму беларусу варта наведаць ужывую.

Гаўрыла ВАШЧАНКА, мастак:



1. НАВАГРУДАК. Першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, адсюль нашыя карані, як самастойнай дзяржаўнасці. Там захаваліся рэшткі замчышча Гедыміна і знаходзіцца музей Адама Міцкевіча, які павінен наведаць кожны беларус. Бо ніхто так добра не расказаў пра беларускую шляхту, як Міцкевіч. Яшчэ там захаваўся касцёл, дзе Ягайла вянчаўся з Соф'яй Гальшанскай.

2. СЛОНІМ. Адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, з якім цесна звязаны вялікі беларускі шляхецкі род Агінскіх. Побач са Слонімам знаходзяцца Жыровічы — святое беларускае мястэчка.

3. ГРОДНА. Тут абавязкова трэба пабачыць Каложскую царкву — самы старажытны помнік беларускай архітэктуры (XII ст.). Горад працяты гістарычным духам. Зусім нядаўна там усталявалі камень, дзе калісьці давалі клятву гродненскія харугвы, якія ішлі на Грунвальдскую бітву.

4. ГОМЕЛЬ. Тут унікальны для Беларусі парк, дзе сабрана больш за 500 дрэў розных парод. І палац Румянцавых-Паскевічаў — выдатны помнік нашага класіцызму.

5. МІНСК. Кожнаму беларусу трэба пабываць у гэтым горадзе перш за ўсё таму, што гэта наша сталіца. У Мінску знаходзіцца Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, з экспазіцыяй якога беларусы павінны пазнаёміцца, каб ведаць сваю культуру. Менавіта ў Мінску знаходзіцца Нацыянальная бібліятэка — новы сімвал незалежнай Беларусі.

Марыя МАРТЫСЕВІЧ, паэтка, эсэістка, перакладчыца:

— Любому чалавеку варта пабачыць за жыццё як мага больш мясцін, апроч родных. Гэта прыносіць веды пра свет і лекуе ад стэрэатыпаў. Мы з вамі жывём на вельмі зручнай адлегласці «ноч на цягніку» ад галоўных аздобаў Усходняй Еўропы — Варшавы, Кіева, Кракава, Львова, Рыгі, Масквы ды Санкт-Пецярбурга, не кажучы ўжо пра зусім блізкую Вільню. Але я намерваюся завабіць вас у менш вядомыя куты свету.

1. ЧЭШСКІ КРУМЛАЎ, Чэхія. Калі да старажытнага беларускага горада падступаў вораг, гараджане «затворяшася» ў горадзе, трымаючы гераічную абарону. Узяўшы горад, вораг зазвычай спальваў яго дашчэнту, а жанчын і дзяцей забіраў як вайсковую здабычу. Старажытныя чэхі па-іншаму расстаўлялі прыярытэты. Калі вораг падступаў да чэшскага горада, за браму выходзіў мэр з мехам золата, пытаючыся ў непрыяцеля: «Мо дамовімся?» Гэтым некаторыя гісторыкі тлумачаць неверагоднае архітэктурнае багацце гарадоў Чэхіі. Рэнесансны да апошняга закуточка Чэшскі Крумлаў у свой час уразіў мяне болей за Прагу і Карлавы Вары. Тут пэўны час працаваў мастак-экспрэсіяніст Эган Шыле.

2. ЛОДЗЬ, Польшча. Вакзал, да якога едуць усе цягнікі на Лодзь, па традыцыі абвяшчаюць у дынаміках як «Лодзь Фабрычна». Вельмі хацелася б накіраваць сюды беларусаў, якія адказваюць за лёс будынкаў старых фабрык ды заводаў. Лодзь — выдатны прыклад таго, як індустрыяльная мека XIX стагоддзя здольная стаць культурнай мекай XXI-га: колішнія цэхі з чырвонай цэглы цяпер змяшчаюць гандлёвыя цэнтры і мастацкія галерэі, служачы візітоўкай гэтага неверагодна прывабнага горада. А на знакамітай кінастудыі Лодзі амерыканскі рэжысёр Дэвід Лінч здымаў «Унутраную імперыю».

3. ЛЯЙПЦЫГ, Германія. Любы нямецкі горад варта наведаць у канцы лістапада-снежня, калі на кожнай плошчы раскінуты Калядны кірмаш. Пры ўмове лёгкай смугі ці снегападу трапляеш на старонкі казак Вільгельма Гаўфа. Але Лейпцыг уразіў мяне іншым — яго выдатна зробленыя музеі сучаснай гісторыі яскрава расказваюць пра жыццё ў ГДР і падзеі, якія папярэднічалі аб'яднанню Германіі. Гэта захапляльная сага грамадзянскай мужнасці: да падзення Берлінскага муру прывялі масавыя маніфестацыі ў Лейпцыгу, распачатыя вернікамі лютэранскай царквы святога Мікалая ўвосень 1989 года. Раю зазірнуць у музей «Штазі» і паслухаць арган у саборы святога Томаса, дзе пахаваны нямецкі кампазітар Ёган Сэбастыян Бах.

4. КОЎНА, Літва. Калі выпадкова — як я мінулым летам — трапляеш сюды, накрывае адчуванне: вось сапраўдная сталіца літоўскай дзяржавы. Коўна — гэта Тэль-Авіў пры Вільні-Ерусаліме. У гэтым горадзе ўсё рацыянальна, вытанчана, стрымана, дзелавіта і ўтульна. І пры гэтым — раптам — раскошны літоўскі канструктывізм трыццатых гадоў, унушальная готыка храмаў. Асабліва захаханаму ў родную прыроду беларусу спадабаецца поплаў у самым цэнтры Коўна, дзе ў Нёман-бацьку ўліваецца Вілія-матухна. Уразіць тое, з якой хуткасцю здольныя цячы гэтыя сціплыя беларускія рэчкі, калі ім даць волю. І не прапусціце Мастацкі музей імя Мікалоюса Чурлёніса. Яшчэ адна прычына наведаць гэтыя мясціны — ковенскі аэрапорт, самая блізкая магчымасць для жыхароў Беларусі вельмі бюджэтна злятаць у Парыж, Лондан ці Барселону.

5. САН-ФРАНЦЫСКА, ЗША. Кожнаму беларусу за жыццё варта наведаць хоць бы адзін горад з хмарачосамі, адзін горад на гары і адзін горад на акіяне. Усё гэта выдатна спалучылася, напрыклад, у Сан-Францыска, рэзідэнцыі хіпі і калысцы бітнікаў. Асабліва рэкамендую акіян: стаяць твар у твар з прыбоем — самы захапляльны з усіх магчымых атракцыёнаў для жыхара краіны без берагавой лініі.

Уладзімір ЦЭСЛЕР, дызайнер:

1. ВІЛЬНЯ, Літва. Адзін з самых прыгожых і ўтульных гарадоў свету! Калі пабываць у Вільні, можна ўявіць, як мы раней жылі. Вільня ж была сталіцай нашай прабацькаўшчыны. Заўжды, калі беларусы бываюць у Вільні, яны вяртаюцца адтуль перакананыя, што па духу, па нечым такім няўлоўнаметафізічным Вільня — выключна беларускі горад.

2. ВАРШАВА, Польшча. Гэты горад таксама звязаны з нашай гісторыяй. Прычым настолькі блізка, што, блукаючы па гістарычным цэнтры, на кожным кроку сутыкаешся з нейкімі помнікамі, якія пра гэта сведчаць.

3. КІЕЎ, Украіна. Самавіты прыгожы горад, з якім мы таксама маем гістарычныя сувязі. Адзін з нешматлікіх гарадоў на постсавецкай прасторы, які з'яўляецца буйным цэнтрам сучаснага мастацтва.

4. ВІЦЕБСК. Гэта такая беларуская культурная мека, дзе абавязкова трэба пабываць! Там сканцэнтравана столькі творчай жывільнай энергіі, якая будзе карысная не толькі мастакам, але і любому чалавеку. Адзін з нямногіх беларускіх гарадоў, які мае сусветнае культурнае значэнне.

5. ЗАСЛАЎЕ. Гэта адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі. У Заслаўі ўсё патыхае нейкай такой менавіта беларускай даўніной. Акрамя таго, тут знаходзіцца вялікая частка аўтэнтычных архітэктурных збудаванняў, помнікаў, з якімі кожны беларус абавязкова мусіць быць знаёмы, таму што яны — наша гісторыя.

Андрэй КУРЭЙЧЫК, драматург:



1. САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ, Расія. Беларусы ў большасці сваёй пазбаўленыя добрай архітэктуры. Яна была разбураная шматлікімі войнамі і гістарычнымі катаклізмамі. Яны забыліся, што значыць атрымліваць асалоду ад выгляду з акна, ад прыгажосці дамоў, панарам, плошчаў, усмоктваць вялікую культуру акурат на вуліцы. Жыхарам «малінавак, «шабаноў», «чыжовак», «уруччаў» проста неабходна даведацца, што свет складаецца не толькі з аднатыпных бетонных шматпавярховікаў...

2. ЛОС-АНДЖЭЛЕС, ЗША. Гэта самая вялікая і самая фешэнебельная вёска ў свеце! Лос-Анджэлес паказвае ідэальнае змяшэнне вясковай і гарадской эстэтыкі і жыццёвай логікі, спалучэнне найлепшых якасцяў таго і другога. Аказваецца, можна ў цэнтры горада жыць ва ўласным доме з садам, а вузенькая непрыкметная вуліца з двухпавярховымі дамкамі можа стаць марай для ўсяго свету, дзе ў кожнай другой кавярні можна сустрэць галівудскую «зорку» — я маю на ўвазе «Алею Зорак». Дэвіз гэтага горада — жыццёвая прастора кожнаму чалавеку.

3. ВІЛЬНЯ, Літва. Шмат стагоддзяў гэты горад быў цэнтрам беларускай культуры, тут выдавалі свае газеты і кнігі Янка Купала, Цётка, Якуб Колас. Вільня была цэнтрам беларускай адукацыі, беларускага нацыянальнага мыслення, беларускай вызваленчай барацьбы. Дасюль мне здаецца, што ў Вільні нашмат больш беларускага, чым у многіх уласна беларускіх гарадах. Няхай яна цяпер сталіца іншай краіны, але недзе глыбока ў душы мы адчуваем у гэтым горадзе нешта глыбока роднае.

4. ГАВАНА, Куба. Горад, дзе сацыялізм такі перамог. Вялікая канкістадорская архітэктура, дамы з пустымі аконнымі праёмамі і без прыбіральняў, імпэтныя танцы ў цыгарэтным дыме, сэкс і махіта. Хэмінгуэй ведаў толк у жыцці. Аднойчы пабываўшы ў Гаване, абавязкова закахаешся ў яе, як у дзікунку, гатовую на ўсё дзеля дармавога кактэйлю. Горад для тых, каму пляваць на грошы, камфорт, правілы, паліткарэктнасць. Шчасце жабракоў, пісьменнікаў і хіпароў.

5. НЬЮ-ЁРК, ЗША. Тут верыш, што чалавечая цывілізацыя можа ўсё. Вавілон нашых дзён, які складаецца не з адной, а з сотняў вавілонскіх вежаў. На Манхэтане, узняўшы галаву, вы не ўбачыце, дзе заканчваюцца дамы. Адчуванне, быццам яны ўпіраюцца рыхтык у неба. Гуляючы па вуліцы, вы ўбачыце людзей усіх нацыянальнасцяў, колераў скуры, веравызнанняў. На Брайтан-Біч вы апынецеся ў Адэсе 80-х, а ў Чайна-таўне пакаштуеце ўсіх жывых пачвар, якіх толькі можна злавіць на гэтай зямлі. Гэты вялікі горад — сімвал усяго чалавецтва.

Іван КІРЧУК, лідар этна-трыа «ТРОІЦА»:

1. ЛІДА. Прыгожы старажытны беларускі горад. Цікавы і сваёй гісторыяй, і тым, што шмат таленавітых беларусаў там нарадзілася альбо вучылася. Напрыклад, Люся Лушчык, Зміцер Вайцюшкевіч... Гэта і мой родны горад.

2. ВІЛЬНЯ, Літва. Тут вельмі шмат прыгожых, святых мясцін. Чароўны горад, таму што ўдала спалучае старажытнасць і сучаснасць. Гэта тычыцца і музычнай культуры.

3. ВАРШАВА, Польшча. Гэты горад — добры прыклад павагі да сваёй даўняй культуры, мовы, святаў... Мы сваё толькі шукаем, а яны гэтым жывуць.

4. БУДАПЕШТ, Венгрыя. Мова, на якой размаўляюць венгры, зусім ні на што не падобная. А яны з вялікім задавальненнем успрымаюць любую музыку, на любой мове. Там і кухня цікавая, абрады, святы, звычаі... Ёсць у Будапешце музычны фестываль Pepsi Sziget, які праходзіць цэлы тыдзень. Гэта 40 пляцовак, на якіх працуюць музыкі ў розных накірунках. Такіх фестываляў, на жаль, у Беларусі няма.

5. МАСКВА, Расія. Гэта той горад, куды я не раю ехаць беларусам! Мне здаецца, што Масква — мясарубка, якая ўмее ўсё здорава перакруціць. Нават цэрквяў, якія стаяць у горадзе, не відаць за высокімі дамамі... У мяне такое адчуванне, што Масква вельмі адкрыты горад для грошай і вельмі закрыты для творчых людзей. Ужо шмат гадоў прайшло з таго часу, як Беларусь аддзяліліся ад Савецкага Саюза, але, як я прыязджаю туды, мне кажуць, што мы ўжо не такія, як ўсе. Я кажу: як жа мы вашы? У нас свая культура, песні, фальклор!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

У ТУРАЎ — З МУЗЫКАЙ!

Імпрэза

Узгадаць Шапэна і яго беларускіх сяброў — такая магчымасць з'явілася ў рамках імпрэзы камернай і духоўнай музыкі, якую ладзіў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі ўчора.

Тураў да сустрэчы быў гатовы: на адмысловай выставе дэманстраваліся вырабы народных майстроў, спяваў аматарскі народны хор Дома культуры. Шапэна з сябрамі сустрэлі гасцінна. Дакладна кажучы, музыку Шапэна і яго сяброў, якую прывезлі і ігралі музыканты славутага калектыву. Але навошта з музыкай ездзіць так далёка?

Міхаіл Фінберг лічыць, што асветныя фестывалі, сетка якіх пакрывае пакрысе рэспубліку, дапамагаюць вярнуць беларускую культурную спадчыну ва ўжытак. Яны найперш спрыяюць, каб музыка, якая калісьці пісалася нашымі творцамі, гучала для беларусаў. Каб у іх было адчуванне, што нічога не канчаецца і не знікае на зямлі. І не бярэцца з ніадкуль. Як і творчасць генія Фрыдэрыка Шапэна, які быў вельмі паяднаны душой са сваёй роднай зямлёй. А падтрымлівалі яго ў гэтым творцы, народжаныя ў Беларусі: Адам Міцкевіч, Напалеон Орда, Мячыслаў Карловіч, Станіслаў Манюшка...

Ларыса ЦІМОШЫК.

У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯ ПРЭМІЯ Ў ГАЛІНЕ ЭСТРАДНАГА МАСТАЦТВА

Міністэрства культуры Беларусі выступіла з ініцыятывай стварыць у Беларусі музычную прэмію ў галіне эстраднага мастацтва. Пра гэта на прэс-канферэнцыі журналістам паведаміў ***старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр ЗІМОЎСКІ****. Паводле яго слоў, на сёння дакладна вядома, што такая прэмія будзе. Запланаваны музычны конкурс, пра адборачныя туры якога раскажа Белтэлерадыёкампанія.*

— Пакуль што з Міністэрствам культуры мы не вызначыліся ў аб'ёмах: яны прапанавалі 20 намінацый (і адпаведна 20 першых прэмій) у галіне эстраднага мастацтва. Мне здаецца, хапіла б і адной. Узгадненне гэтых аспектаў яшчэ ў распрацоўцы. Усе пытанні па гэтым конкурсе і тыпавыя праграмы, якія датычацца беларускага эстраднага мастацтва, будуць вырашаныя ў снежні.

На пытанне карэспандэнта «Звязды», ці плануецца задзейнічаць у падрыхтоўцы да ўручэння прэміі дадатковыя тэлеканалы, Аляксандр Зімоўскі зазначыў, што не плануецца:

— Іншыя каналы задзейнічаныя ў гэтым не будуць. Па жаданні Міністэрства культуры супрацоўнічаць з міністэрствам у гэтым пытанні будзе толькі Белтэлерадыёкампанія.

Ілья ЛАПАТО.

Выстава

НЕШТА НОВАЕ?

Мастацкія ідэі, як і сейсмалагічную абстаноўку, можна вымяраць па шкале Рыхтэра

У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» — «Шкала Рыхтэра», новы праект беларускага мастака Руслана Вашкевіча, які можна ўбачыць да 25 кастрычніка. Творы Руслана прадстаўлялі Беларусь на Венецыянскай біенале ў 2005 годзе, прадаваліся на аўкцыёне Sotheby's, дэманстраваліся ў галерэях Нью-Ёрка, Парыжа, Мадрыда... Руслана Вашкевіча можна без сумневу назваць адным з самых паспяховых беларускіх мастакоў. Як яму гэта ўдаецца?

Самая галоўная праблема сучаснага грамадства, дзе ўсё ўжо вынайдзенае, усё лічыцца вядомым, — як стварыць нешта новае. Як зрабіць кідкую рэкламу, каб спажывец заўважыў яе сярод мноства іншых такіх жа спроб? Як напісаць раман, каб ён не стаў проста адной з варыяцый вядомага ўсім сюжэта? Як стварыць уласную калекцыю моднай вопраткі, каб бамонд не вынес рукавы прысуд: нешта нам гэта вельмі нагадвае... Пераўтвараць жывапіс на палатне ў твор актуальнага мастацтва — сёння досыць папулярная тэндэнцыя. У тым ліку і ў межах беларускай мастацкай прасторы.

«Шкала Рыхтэра» — праект наскрозь канцэптуальны. Калі проста зойдзеце на выставу і паглядзіце 8 карцін, якія там змешчаныя, то вы нічога не зразумееце. «Шкала Рыхтэра» — гэта, хутчэй, праект ідэі, чым увасаблення. Таму трэба ведаць перадгісторыю. Самі карціны не ўяўляюць з сябе нічога выбітнога. Зрэшты, і ідэя здаецца высмактанай з пальцу... Зараз я вам патлумачу. «Шкала Рыхтэра» — гэта праект, які перасэнсоўвае творчую дзейнасць адразу двух чалавек: Герхарда Рыхтэра і Чарльза Ф. Рыхтэра.

Першы Рыхтэр — нямецкі мастак, заснавальнік «капіталістычнага рэалізму», які працуе на мяжы жывапісу і фатаграфіі і часта выкарыстоўвае эфект размытага фота. Адна з ягоных самых вядомых фотарэалістычных прац — «Жанчына з парасонам». Руслан Вашкевіч экс

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Рыбы могуць пачынаць новую справу, а Львы — умацоўваць уласную пазіцыю

ВАЕН. На першы план выйдуць асабістыя справы. Пытанні, звязаныя з сям'ёй, могуць заняць увесь час і думкі. Магчыма, будзе шмат мітусні, турботы, складанасцяў у прыняцці пэўных рашэнняў. У дзелавой сферы спрыяльныя арганізацыйныя мерапрыемствы, мэта якіх — абнаўленне справы. Таксама звярніце ўвагу на ўкладанне сродкаў у доўгатэрміновыя праекты. Пашырэнне круга знаёмстваў прынясе новыя магчымасці, але ўсё ж больш ад гэтага будзе праблем і блытаніны. Сваякам можа спатрэбіцца дапамога. У вас ёсць магчымасць захапіць навакольных сваімі ідэямі і знайсці падтрымку.

ЦЯЛЕЦ. У пачатку тыдня неабходны дакладны разлік, хуткае рашэнне і ўменне з'яднаць калектыў. Бліжэй да канца тыдня будзьце больш стрыманымі і асцярожнымі, не спрабуйце прабіць ілбом сцяну: адзінае, чаго вы даможацеся такімі метадамі, — разаб'еце галаву, а яна вам яшчэ спатрэбіцца. Актыўнасць і энергічнасць дазволяць ссунуць з мёртвай кропкі назапашаныя справы. Важны момант: сілы лепш накіраваць на найважнейшую мэту, а не растрачваць іх па дробязях. Вашы творчыя распачынанні на працы прынясуць аддачу, а ініцыятыва не застанецца незаўважанай. Ёсць верагоднасць узнікнення невялікіх праблем у сям'і: гэтая сітуацыя падвядзе да некаторых перамен. На выхадных займіцеся разграбаннем назапашаных хатніх спраў.

БЛІЗНЯТЫ. Можаце лёгка паддацца спакусе перайсці межы дазволенага. Памятайце, што адрэналін можна атрымаць і іншым спосабам, і не дазваляйце сабе падобных выхадак. Вы захочаце адчуць усю поўнасць жыцця — і можаце з-за гэтага здзейсніць некалькі неабдуманых крокаў. Паспрабуйце заклікаць на дапамогу ўсю сваю асцярогу. Прытрымліваючыся залатой сярэдзіны, вы наладзіце адносіны, як з начальствам так і з падначаленымі.

РАК. Паспрабуйце прывесці эмоцыі ў парадак і не кідайцеся ў крайнасці. Варта з асаблівай увагай паставіцца да сяброў, сваякоў, заступнікаў і партнёраў, бо вы ўступаеце ў складаную для адносін фазу. У аўторак адкладзіце ўсе асабістыя справы і цалкам прысвяціце сябе працы. У сераду нельга лгаць і паддавацца залішняй мітусні. Не ўхіляйцеся ад жыццёвых урокаў, каб не пракалоцца там, дзе варта разлічваць на ўласны вопыт. Ваша дапамога можа спатрэбіцца родным або сябрам.

ЛЕЎ. Надышоў час вызначыцца, якія з дзелавых кантактаў перспектыўныя, а якія — не. Добры час для падтрымання і ўмацавання ўласных пазіцый. Будзьце больш настойлівымі: тады поспех усмяхнецца і вы зможаце рэалізаваць некаторыя даўнія ідэі. Спрыяльна ўсё, што дапамагае вашаму асабістаму развіццю: адукацыя, паездкі, публічныя выступы. Надыходзіць адказны перыяд у кар'еры.

ДЗЕВА. У першай палове тыдня вас можа цягнуць на неабдуманыя ўчынкі. Паспрабуйце ўсё ж пазбегнуць рызыкі, бо яна не апраўдае вашых душэўных і матэрыяльных выдаткаў. Сярэдзіна тыдня можа прынесці змены як у настроі, так і ў становішчы, якое вы займаеце. Вырасце ваш аўтарытэт, асабліва сярод калег. У чацвер усё рашэнні варта прымаць самастойна. У пятніцу або суботу можаце атрымаць выгадную прапанову, якую не варта выпускаць. У суботу дазвольце сабе маленькае свята — можаце павесяліцца ад душы.

ШАЛІ. Спрыяльны перыяд для ўнутранай працы і самаўдасканалення. У панядзелак стане больш кантактаў з навакольнымі: завяжуцца новыя знаёмствы, узновяцца старыя сувязі. У аўторак грамадская дзейнасць можа прынесці задавальненне: паспрабуйце ў гэты дзень рэалізаваць даўно вызначаныя планы. У сераду адчуеце прыліў бадзёрасці, што станоўча адаб'ецца на працаздольнасці. У чацвер прыцішце свой запал і амбіцыі, а вольны час паспрабуйце правесці ў адзіноце — пачытайце, паслухайце музыку. У суботу не спяшаецеся прымаць сур'ёзныя рашэнні.

СКАРПІЁН. Не перагружайце сябе працай, бо зараз неабходна поўнавартасна адпачыць. Паспрабуйце кіраваць сваім эмацыйным станам, каб ён не стаў разбуральным для навакольных. Самы час для падвядзення вынікаў і рашэння старых праблем, а не для пачатку новых спраў. Калі пайсці ў адпачынак немагчыма, дазвольце сабе міні-вандраванне на выхадных. Ваша ўвага запатрабуецца бацькам або старэйшым сваякам.

СТРАЛЕЦ. З'явіцца магчымасць прадэманстраваць свае ўменні і навыкі ў прафесійнай сферы. Неспадзяваныя падзеі серады могуць радыкальна змяніць усе вашы планы. У чацвер не спяшайцеся выконваць даручэнне начальства загадзя — не выключана, што на наступны дзень дадатковыя абавязкі з вас здымуць, ды і задачы могуць змяніцца з дакладнасцю да наадварот. У суботу кантралюйце кожны свой крок, перапраўвайце паперы — толькі так вы пазбегнеце страт і памылак. У нядзелю вы зможаце знайсці агульную мову з падрастаючым пакаленнем. Абавязкова пратэстуйце свае педагагічныя здольнасці, калі знойдзеце на кім.

КАЗЯРОГ. Надайце належную ўвагу дробязям. І галоўнае — не забывайце пра пунктуальнасць. Панядзелак можа запатрабаваць засяроджанасці на галоўным. Цалкам пазбегнуць грашовых або іншых страт наўрад ці атрымаецца, але цярпенне і аналіз сітуацыі дапамогуць іх скараціць, а заадно і вырашыць пытанні кар'еры і ўзаемаадносін з дзелавымі партнёрамі. Ваша задача — захаваць дасягнутае, пазбегнуўшы пры гэтым рэзкіх змен. Калі не даваць эмоцыям выплюхнуцца пры чарговым разборы палётаў дома і не ўскладняць сітуацыю высвятленнем адносін з блізкімі, то, магчыма, атрымаецца пражыць гэты тыдзень, знаходзячыся ў прыўзнятым настроі.

ВАДАЛЕЙ. Паспрабуйце не спыняцца на дасягнутым, нягледзячы на занятасць. А спраў будзе звышдастаткова. На працы магчымыя перагрузкі і завышаныя патрабаванні начальства. Давядзецца таксама падбаць пра сваю найбліжэйшую будучыню. Могуць адбыцца змены ў прафесійнай сферы. Самыя напружаныя дні — аўторак і чацвер. Асабліва будуць дапякаць нечаканасці і паспех. У аўторак будзьце больш асцярожнымі: вас могуць абдурыць. У чацвер лепш не правакаваць канфлікт у адносінах з начальствам — паспрабуйце лепш зусім не трапляць яму на вочы. Нядзелю прысвяціце асабістым справам.

РЫБЫ. Надыходзячы тыдзень абяцае выдатныя вынікі ў самых розных абласцях жыцця. У панядзелак не варта праяўляць залішнюю актыўнасць і ініцыятыву ў дзелавой сферы — цяпер карысна ўсё прадумаць і не рызыкаваць без крайняй неабходнасці. У сераду можаце пачынаць новую справу, нават калі не ўпэўненыя ў поспеху сваіх ідэй. Варта толькі падзяліцца планамі з калегамі і блізкімі людзьмі, як вашы дзеянні сустрэнуць падтрымку і разуменне. У нядзелю бязлітасна вызваляйцеся ад старога і непатрэбнага, а потым займіцеся стварэннем чаго-небудзь новага.

А не шкодзь!

«ДАРАГАЯ» РЫБАЛКА

Два браканьеры падчас незаконнай здабычы рыбы сеткамі ў перыяд яе нерасту нанеслі прыродным рэсурсам шкоду ў асабліва буйным памеры — на суму 19 180 000 рублёў (548 базавых велічынь).

Суд Талачынскага раёна прызначыў ім за гэта пакаранне — пазбаўленне волі тэрмінам на тры гады кожнаму з адтэрміноўкай пакарання тэрмінам на два гады і спагнанне ў салідарным парадку нанесенай шкоды ў памеры 9,4 мільёна рублёў. Частку шкоды — 10 мільёнаў рублёў — парушальнікі выплацілі да суда.

За аналагічнае злачынства суд Мінскага раёна пакараў двух іншых браканьераў пазбаўленнем волі на два гады кожнаму з адбыццём пакарання ў папраўчай калоніі агульнага рэжыму з пакрыццём нанесенай шкоды ў памеры каля 6 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Падарожныя нататкі

«НАМ ПАШАНЦАВАЛА, ШТО НЕМЦЫ НЕ СТАЛІ СТРАЛЯЦЬ У НЕМЦАЎ»

Спецыяльны карэспандэнт Глеб ЛАБАДЗЕНКА павячэраў у Берліне з апошнім міністрам замежных спраў ГДР і распытаў у мэра Ляйпцыга, чаму ў 1989 годзе салдаты і паліцыя не сталі спыняць дэманстрантаў

«Калі ў тваёй краіне наступае гістарычны момант — ты мусіш рызыкаваць»

У гэтыя дні Германія святкуе 20 гадоў аб'яднання ФРГ і ГДР. Па запрашэнні ўрада Германіі я правёў тыдзень у Берліне, Патсдаме і Ляйпцыгу, каб падрабязней даведацца пра падзеі 20-гадовай даўніны. Адна з сустрэч праходзіла за вячэраю. Госцем быў легендарны чалавек — Маркус Мекель, апошні міністр замежных спраў ГДР.

— Я не заўсёды быў палітыкам, — распавядае спадар Мекель. — Да 1989 года я служыў евангелісцкім пастарам, потым кіраваў экуменічным адукацыйным цэнтрам пад Магдэбургам. Але калі ў тваёй краіне наступае гістарычны момант — ты павінен слухаць сваё сэрца, сваю генетычную памяць. Неабходна рызыкаваць, бо ведаеш, што, калі ўдасца нешта змяніць, — гэта будзе гістарычны паварот. У руху апазіцыі я браў удзел яшчэ з 1970-х гадоў. Гэта не сакрэт, што ў камуністычнай ГДР храмы былі ці не адзіным месцам, дзе людзі маглі збірацца і абмяркоўваць сітуацыю, думаць пра будучыню і спадзявацца. Таму ў пэўны час я вырашыў ісці ў палітыку, быў адным з ініцыятараў стварэння сацыял-дэмакратычнай партыі ў ГДР, потым быў яе другім спікерам, намеснікам старшыні, старшынёй. Калі рухнуў берлінскі мур, у ГДР адбыліся першыя свабодныя выбары. Яны мелі, хутчэй, фармальны характар: ужо было вырашана, што Германія аб'яднаецца, стане адной дзяржавай. Аднак для гэтага трэба мець часовы легітымны ўрад — каб ураду ФРГ было з кім дамаўляцца і падпісваць дакументы. Таму ў красавіку 1990 года прайшлі выбары — і я стаў міністрам замежных спраў ГДР. На шчасце, апошнім міністрам.

Спадар Мекель прабыў на гэтай пасадзе ўсяго 4 месяцы — да аб'яднання. Але на ягоную долю выпала цікавая гістарычная місія. Многія дзяржавы не верылі, што ГДР вызвалілася з-пад камуністычнага прыгнёту. Таму Маркус Мекель асабіста наведваў сталіцы суседніх ды не толькі дзяржаў — каб афіцыйна заявіць, што ГДР ідзе на аб'яднанне з ФРГ.

— Выканаўшы тую місію, я пайшоў у дэпутаты, — працягвае

Маркус Мекель — апошні міністр замежных спраў ГДР.

спадар Мекель. — Быў дэпутатам бундэстага ад снежня 1990 па кастрычнік 2009 года. Займаў за гэты час пасады старшыні германа-польскай парламенцкай групы ў бундэстагу, намесніка спікера сацыял-дэмакратычнай партыі, 8 гадоў быў кіраўніком нямецкай дэлегацыі намеснікам старшыні і старшынёй палітычнага камітэта Парламенцкай асамблеі НАТА.

Цяпер Маркус Мекель адышоў ад актыўнага палітычнага жыцця, але шмат выступае ў розных універсітэтах, а таксама на канферэнцыях з лекцыямі на тэму гістарычных падзей 1989-90 гадоў.

Стол, за якім сядзелі Коль і Гарбачоў

У Міністэрстве замежных спраў нас сустракае чыноўнік — барон фон Рэйбніц. У фае міністэрства якраз адбываецца выстава, прысвечаная 20-годдзю яднання. Адразу кідаецца ў вочы самы незвычайны экспанат.

— Так-так, гэта менавіта той самы стол! — спаталяе нашу недаверлівую дапытлівасць барон фон Рэйбніц. — Вось, можаце параўнаць з фотаздымкам.

Перад намі — стол, высечаны з вялізнай дубовай калоды. Абапал — два крэслы, выкрабленыя гэткім жа чынам. Побач — здымак, на якім менавіта за гэтым сталом сядзяць Ганс-Дытрых Геншэр (тагачасны міністр замежных спраў ФРГ), канцлер Гельмут Коль і генсек Міхаіл Гарбачоў. Тады, 16-17 ліпеня 1990 года, на Каўказе адбылася гістарычная сустрэча, якая канчаткова дала ход аб'яднанню. Напярэдадні Міхаіл Гарбачоў прыняў канцлера ФРГ Гельмута Коля ў Крамлі. Коль заявіў адразу: запрашэнне паляцець разам з Гарбачовым на Каўказ ён прымае толькі ў тым выпадку, калі ад аб'яднанай Германіі не запатрабуюць нейтралітэту. Маўляў, калі савецкі кіраўнік лічыць, што Германіі не месца ў НАТА, то нямецкая дэлегацыя неадкладна вылятае назад. Савецкі генсек не прымусіў чакаць з адказам: «Мы ляцім на Каўказ, спадар бундэсканцлер!».

Ужо на Каўказе нечаканы ход зрабіла жонка Гарбачова Раіса Максімаўна. Яна стала збіраць кветкі на полі, а пасля падаравала букет Гельмуту Колю. Гэта было своеасаблівым сігналам: абодва бакі настроеныя на станоўчы вынік перамоў.

— Тыя перамовы прынеслі свой плён, — кажа барон фон Рэйбніц. — Краіны дамовіліся пра шчыльнае супрацоўніцтва ў далейшым, пра колькасць нямецкага войска. Была дасягнутая і прынцыповая дамова пра вывад савецкіх войскаў з тэрыторыі Германіі. Разумеючы, што гэта патрабуе вялізных выдаткаў па адаптацыі вайскоўцаў на радзіме, ФРГ яшчэ да пачатку перамоў прапанавала Савецкаму Саюзу немалую кампенсацыю, а таксама пастаўкі харчовых прадуктаў. Пра памер той кампенсацыі гісторыкі спрачаюцца і сёння. Вядомая толькі лічба ў 300 мільёнаў нямецкіх марак, якую вылучыў Коль на прафесійную перападрыхтоўку савецкіх вайскоўцаў, якія вярнуліся на радзіму. Больш за тое, Германія паабяцала тады кампенсаваць выдаткі на будаўніцтва жылля для вайскоўцаў...

...Тагачасны дарадца Гельмута Коля Хорст Тэльчык напіша пасля ва ўспамінах: «Колькі агулам Германія заплаціла тады СССР — не мае ніякага значэння! Напрыклад, Гарбачоў мог сказаць: «Спадар бундэсканцлер, я згодны, але Федэратыўнай рэспубліцы гэта абыдзецца ў 50 ці 80 мільярдаў марак!» Ці змаглі б мы адмовіць?..»

Зялёны Пояс на месцы памежнай паласы

Нямецкі бок склаў праграму візіту журналістаў проста бліскуча! Яе галоўная асаблівасць — паказаць, як паўплывала аб'яднанне на самыя розныя сферы жыцця. У адзін з дзён візіту мы едзем на былую мяжу між Заходняй і Усходняй Германіяй. У колішняй памежнай зоне, дзе некалі патрулявалі вайскоўцы і перыядычна раздаваліся стрэлы па «парушальніках», цяпер «здымаюць вяршкі» эколагі.

Гістарычная сустрэча на Каўказе ў ліпені 1990 года. У цэнтры — Міхаіл Гарбачоў, справа — Гельмут Коль.

— На працягу чатырох дзесяцігоддзяў Германію раздзяляла вусцішная мяжа — сотні і сотні кіламетраў калючага дроту, назіральных вышак, памежнай паласы і ўзброенай аховы, — кажа эколаг Дырк Адамс, які з'яўляецца намеснікам старшыні прыродаахоўнай арганізацыі BUND у Цюрынгіі. — Але адначасова для прыроды, для расліннага і жывёльнага свету гэтыя дзесяцігоддзі сталіся своеасаблівай перадышкай, адпачынкам. У гэтай паласе не вялася гаспадарчая дзейнасць, зямлю не труцілі хімікатамі, жывёл не страляюць, чалавек не ўздзейнічаў на навакольнае асяроддзе. У выніку мы атрымалі паласу працягласцю 1393 кіламетры, якая натуральным чынам за ўсе дзесяцігоддзі мяжы пераўтварылася практычна ў запаведнік — колькасць відаў жывёл і раслін тут цяпер больш за тысячу!.. Адразу пасля падзення Берлінскага муру на ўрадавым узроўні гэтая тэрыторыя стала ахоўвацца, як унікальная прыродная зона. Дзе-нідзе здараюцца выпадкі, калі праз Зялёны Пояс пракладваюць дарогі — але інакш, бадай, нельга... Аднак разуменне важнасці гэтай зоны ёсць: урад нават выкупляе некаторыя прылеглыя да Пояса землі ў фермераў, каб такое суседства не шкодзіла экалогіі своеасаблівага запаведніка.

Сам Зялёны Пояс захаваў цікавы гістарычны экспанат — бетонныя дарожныя палосы, па якіх едзілі патрульныя машыны. Збольшага яны ўжо параслі хмызняком, але дзе-нідзе праступаюць яшчэ добра.

— У Поясе мы стараемся падтрымліваць той стан, у якім ён знаходзіўся ўвесь час існавання мяжы, — кажа Дырк Адамс. — Напрыклад, калі недзе дрэвы робяцца занадта вялікімі, мы іх ахайна прыбіраем. Бо тады парушаецца звыклы стан прыроды: на вялікіх дрэвах заводзяцца птушкі, якія ядуць меншых жыхароў хмызняку... Зялёны Пояс робіцца ўсё больш папулярным для турыстаў. У многіх месцах мы ўсталявалі інфармацыйныя дошкі. На іх падзеная кароткая інфармацыя пра канкрэтную мясцовасць, а таксама нумар тэлефона, па якім можна пачуць на аўдыяінфарматары больш глыбокія звесткі.

20 гадоў таму эколагі падчас стварэння Пояса сутыкнуліся яшчэ з адной праблемай: камуністычная ГДР пакінула ў памежнай паласе тысячы мін супраць «парушальнікаў».

— Аднак нямецкія сапёры справіліся з задачай добра, ахвяраў, дзякаваць Богу, няма.

«Чалавек уцёк з ГДР і пабудаваў тут вежу, каб назіраць за сваім мінулым жыццём»

Прыкладна такую легенду апавядае нам бургамістр (мэр) Людвігштадта Ціма Эрхард, калі мы падыходзім да Цюрынгскай назіральнай вежы. Вышка мае 26,5 метра вышыні — як 9-павярховы дом. Яна і сапраўды збудаваная ў 1963 годзе для назіранняў — але збудавала яе дзяржава.

— З вышкі, што праўда, убачыць можна было няшмат, — кажа спадар Эрхард. — У асноўным памежную паласу ды некалькі паселішчаў удалечыні. Але сам факт: паглядзець на свае вочы на той бок — гэта было цікава для многіх.

Мы падымаемся наверх. Мне думаецца, што, апроч «жыцця там», людзям было проста прыемна падзівіцца на вельмі прыгожы навакольны краявід з пагоркамі і лагчынамі. Дарэчы, былая мяжа сапраўды выглядае, як «зялёны пояс»: дрэўцы, якія параслі за мінулыя 20 гадоў, вылучаюцца на колеры ад іншых.

Непадалёк, у мястэчку Пробстцэла мы наведваем вялізны «Баўхаўз», альбо «Народны дом» — будынак 20-х гадоў мінулага стагоддзя ў асаблівым стылі ці то канструктывізму, ці то мадэрнізму. У любым выпадку будынак выглядае вельмі сучасным і цяпер. У катастрафічным стане яго выкупіў усяго за 15 тысяч еўра прыватны гаспадар, зрабіўшы тут атэль і адукацыйны цэнтр. На спецыяльным макеце нам паказваюць, як выглядала памежная паласа 20 гадоў таму (вышкі, калючы дрот, памежнікі), цяпер (вышка пакінутая як гістарычны экспанат, мяжа ўгадваецца слаба) і праз 20 гадоў (апроч вышкі — ніякіх нагадванняў).

Бургамістр Людвігштадта Ціма Эрхард паказвае Цюрынгскую назіральную вежу.

Германа-германскі музей

Гучыць як «масла маслянае», праўда? Тым не менш, на віле Шонінген у Патсдаме нас вядуць менавіта ў такое месца. Тут можна ўбачыць колішнія таблічкі-папярэджанні пра памежную зону, каваркі калючага дроту і шыпоў-вожыкаў з дарогі, форму памежнікаў. І нават табельны «макараў» гэдэраўцаў. Колькі жыццяў непавінных людзей ён забраў? Невядома, але нават паводабілі 1068 чалавек, якія спрабавалі вырвацца з гэтага «камле афіцыйных звестак за гады мяжы гэдэраўскія памежнікі зуністычнага запаведніка».

«Я ваджу экскурсіі не толькі ў дагледжаныя куточкі горада»

Для мяне асабіста фігура Міхаіла Гарбачова — спрэчная. Ягоныя заслугі ў развале Савецкага Саюза забываць нельга: дзякуючы гэтаму я ўсё свядомае жыццё з'яўляюся грамадзянінам незалежнай Рэспублікі Беларусь. Адначасова нельга забываць, што менавіта пад кіраўніцтвам Гарбачова ад мільёнаў людзей спрабавалі схаваць праўду пра Чарнобыль — у выніку на першамайскую дэманстрацыю 1986 года выйшлі сотні тысяч людзей, для многіх з якіх гэта скончылася калецтвам ці паскоранай смерцю.

Для немцаў Гарбачоў — адназначны герой. Днямі, да ўгодкаў аб'яднання, яму (разам з Гельмутам Колем і Джорджам Бушам-старэйшым) нават паставілі бюст у Берліне. Пра ролю Гарбачова згадаў і мэр (обер-бургамістр) Ляйпцыга Буркхард Юнг падчас нашай сустрэчы.

Варта нагадаць, што ў 1989 годзе ўсё пачыналася менавіта ў Ляйпцыгу. Тут, у царкве Святога Мікалая, збіраліся людзі, незадаволеныя камуністычнай уладай. І з кожным разам, кожны панядзелак, іх прыходзіла ўсё больш. Пакуль 9 кастрычніка 1989 года іх не сабралася пад 100 тысяч — людзі занялі ўвесь храм, плошчу абапал яго і прылеглыя вуліцы. Людзі са свечкамі ў руках пайшлі па горадзе — і паліцыянты, войска не спынялі іх. «Чаму?» — запытаўся я ў спадара Юнга.

— Ведаеце, асабіста я бачу тры асноўныя прычыны гэтага, — адказаў обер-бургамістр Ляйпцыга. — Па-першае, камуністычны ўрад ГДР не адчуваў больш поўнай падтрымкі СССР. Па-другое, камуністы не адважыліся зладзіць крывавую бойню пасярод Еўропы. І па-трэцяе, усе савецкія салдаты на загад Гарбачова заставаліся ў казармах, атрымаўшы ўказанне «не ўмешвацца». У выніку супраць дэманстрантаў выйшла 8000 паліцыянтаў і вайскоўцаў — але гэта былі таксама жыхары Ляйпцыга і ваколіц. І яны ўбачылі сярод дэманстрантаў сваіх сваякоў, сяброў, знаёмых, суседзяў. Дзякаваць Богу, немцы не сталі страляць у немцаў.

Апроч тэмы яднання, Буркхард Юнг распавядаў нам і пра сваю працу на пасадзе обер-бургамістра. Асабліва мне спадабалася адна ягоная фраза:

— Калі да мяне прыязджаюць дэлегацыі ці проста госці, я вяду іх паказваць не толькі ўзорна чыстыя і дагледжаныя вуліцы, але і праблемныя раёны, дзе дрэнныя дарогі, неадрамантаваныя дамы. «Паказуха» — гэта падман самі сябе. І калі ты паказваеш толькі бляск — кожны разумны чалавек адчуе, што ты падманваеш...

Напрыканцы размовы пра яднанне обер-бургамістр распавёў нам байку пра ролю Гарбачова ў тым гістарычным працэсе. Маўляў, напярэдадні 9 кастрычніка кіраўніцтва ГДР ужо ведала, што заўтра будзе шматтысячная дэманстрацыя. На пад'ездах да Ляйпцыга паліцыя перахоплівала цэлыя аўтобусы людзей, якія ехалі з іншых месцаў, каб паўдзельнічаць у ёй. І вось ноччу гэдээраўскія правадыры кінуліся тэлефанаваць Гарбачову: што рабіць?! Слухаўку нібыта зняла Раіса Максімаўна, якая тройчы патлумачыла, што Міхаіл Сяргеевіч спіць. Аднак тыя так упрошвалі, што яна пайшла будзіць мужа. Што адказаў тады Гарбачоў гэдээраўцам, гісторыя замоўчвае. Але факт застаецца фактам: калі б СССР у асобе генсека падтрымаў тады гэдээраўцаў, яднанне Германіі адклалася б яшчэ на пэўны час.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Берлін—Патсдам—Ляйпцыг—Мінск.

P.S. Аўтар выказвае шчырую падзяку амбасадзе Германіі ў Мінску за цудоўную арганізацыю паездкі.

Кавалак Берлінскай сцяны з германа-германскага музея з аўтографамі Гельмута Коля, Міхаіла Гарбачова і Джорджа Буша-старэйшага.

Колішняя бетонная дарога для гэдээраўскіх патрульных машын у Зялёным Поясе.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ И ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Лот № 1. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальные строения инв. № 420/С-31498, инв. № 420/С-31496, инв. № 420/С-31497, инв. № 420/С-32179, многолетние насаждения, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423684000013000006 площадью 2,5797 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 722 256 280 руб., сумма задатка – 72 225 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: инв. № 420/С-31498 – двухэтажное кирпичное здание общежития (казармы) 1988 г. п., общ. пл. 2 234,9 кв. м с пристройкой, двумя террасами, дымовой трубой; площадка асфальтовая 1983 г. п., 4991 кв. м; асфальтовые пешеходные дорожки 49 кв. м с бетонным дорожным бортом 906 п. м, 1983 г. п., забор-сетка металлический 1983 г. п., 1090 кв. м; ворота металлические 1983 г. п., 12 кв. м; три кабельные линии электропередачи 1988 г. п., общ. протяженностью 905,1 п. м; водопровод стальной 1988 г. п., 86,4 п. м; канализация керамическая 1988 г. п., 241,2 п. м; тепловая сеть 1988 г. п., 24,88 п. м. **Инв. № 420/С-31496 –** одноэтажное кирпичное здание склада 1988 г. п., общ. пл. 551,5 кв. м; эстакада бетонная 1988 г. п.; две кабельные линии электропередачи 1988 г. п., общ. протяженностью 485,4 п. м, канализация керамическая 1988 г. п. 43,7 п. м, тепловая сеть стальная 1988 г. п. 91,08 п. м. **Инв. № 420/С-31497 –** одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта 1988 г. п. с террасой, общ. пл. 64,5 кв. м, кабельная линия электропередачи 1988 г. п., 63,4 п. м; водопровод стальной 1988 г. п., 5,4 п. м; канализация керамическая 1988 г. п., 51,37 п. м. **Инв. № 420/С-32179 –** одноэтажное блочное здание склада 1989 г. п., общ. пл. 17,5 кв. м. Многолетние зеленые насаждения 57 единиц	
Продавец недвижимого имущества: Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», контактный телефон (8 0163) 41 25 92	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта, осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	
Лот № 2. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальные строения инв. № 411/С-6614, инв. № 411/С-6615, расположенные по адресу: Гродненская обл., Берестовицкий р-н, дер. Людвиново, и право заключения договора аренды двух земельных участков с кадастровыми номерами 420483200001000020 площадью 0,3170 га и 420483200001000022 площадью 0,0672 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 7 371 581 руб., сумма задатка – 737 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Гродненское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Гродноэнерго», контактные телефоны: (8 0152) 79 21 77, 79 21 41	
Сведения об объектах недвижимости: инв. № 411/С-6614 – одноэтажное здание конюшни 1928 г. п. общ. пл. 122,0 кв.м. **Инв. № 411/С-6615** – металлическая водонапорная башня 1966 г. п., высота 10,0 м, объем 15 куб. м	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственный оборот в течение одного года с момента заключения договора купли-продажи	
Условия использования земельных участков, ограничения по использованию: осуществление в двухмесячный срок со дня получения решения (выписки из решения) о предоставлении земельных участков государственной регистрации прав на земельные участки; получение в установленном порядке разрешения Берестовицкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией	
Лот № 3. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальное строение инв. № 410/С-2353, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Зенитчиков, д. 37, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 420850100001008561 площадью 0,0398 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 45 750 724 руб., сумма задатка – 4 575 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Гродненское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Гродноэнерго», контактные телефоны: (8 0152) 79 21 77, 79 21 41	
Сведения об объектах недвижимости: одноэтажное кирпичное нежилое здание 1964 г. п. с тремя пристройками 1979 г. п. общ. пл. 208,9 кв. м	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственный оборот в течение одного года с момента заключения договора аренды купли-продажи	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; использование земельного участка под здания административного назначения, магазины, швейные производства; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **15 ноября 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 10 ноября 2010 года до 16.00**, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

7. Аукцион по конкретному предмету торгов признается нерезультативным, если в результате торгов данный объект не был продан в порядке, установленном законодательством, кому-либо из участников торгов. Аукцион по конкретному предмету торгов признается несостоявшимся, если торги не состоялись в связи с отсутствием участников торгов либо наличием только одного участника.

8. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставл

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ВЫРАТАВАЛЬНАЯ... БАЗУКА

24-гадовы аўстралійскі вынаходнік Сэм Адэлою атрымаў адну з самых прэстыжных прэмій у свеце ў галіне інжынернага дызайну за тое, што распрацаваў Longreach — базуку, якая можа выратаваць сотні жыццяў. За вынаходства ён атрымае 32 тысячы долараў.

Праект базукі-выратавальніка быў прызнаны лепшым у 2010 годзе на конкурсе інжынернага дызайну James Dyson Award. Гэты конкурс закліканы выявіць лепшыя дызайнерскія ідэі, карысныя ў побыце. Яго дэвіз — «Стварыце штосьці прыгожае, што дапаможа вырашыць якую-небудзь праблему».

Вынайдзеная аўстралійцам базука прызначаная для выратавання людзей, якія апынуліся ў вадзе ў выніку катастроф на моры. Выратавальнікі, страляючы з Longreach, могуць даставіць чалавеку, які тоне, выратавальны круг за лічаныя секунды. Базука выстрэльвае капсуламі з гідрафобнай пены на адлегласць у 150 метраў. Пасля ўдару аб ваду ўсяго за 15 секунд выратавальны круг павялічваецца ў 40 разоў. Такім чынам, чалавек, які тоне, атрымлівае шанц нейкі час пратрымацца на вадзе. Прыстасаванне важыць усяго 3,5 кілаграма і даволі кампактнае для таго, каб размясціць яго нават у самай маленькай лодцы. Базука страляе капсуламі па тым жа прынцыпе, што і баявая зброя, пры дапамозе якой вайскоўцы запускаюць саманаводныя ракеты.

ЖЫВОЕ ДАМІНО

У Германіі пабілі новы сусветны рэкорд па «Самым доўгім жывым даміно».

У рэкордзе ўдзельнічала 769 чалавек, якія стаялі за адзін за адным і трымалі за сваімі спінамі матрацы. А потым, як па ланцужку, падалі адзін на аднаго — паводле прынцыпу даміно. Да гэтага рэкорд быў усталяваны ў Дубаі, толькі тады ўдзельнічалі 344 чалавекі.

ПАСЯДЗЕЦЬ НА МІЛЬЁНЕ

Penny Harvest Field уяўляе сабою вялікі прамавугольны кветнік, у якім насыпаныя манеткі вартасцю ў 1 цэнт. А ў суме там ляжыць (вы не паверыце!) больш за мільён долараў.

Дробязь ляжыць пад адкрытым небам паміж 5 авеню і Avenue of the Americas у Нью-Ёрку. Гэтая ўсталёўка будзе даступная для ўсіх да канца года, пасля чаго ўсе грошы адтуль паступяць на дабрачыннасць у якасці грантаў для амерыканскіх студэнтаў.

ПЛЫВІ, ШАКАЛАДКА

У брэтонскім порце Канкарно (Францыя) адбыўся спуск на ваду судна, зробленага з шакаладу і цукру.

Французскі кандытар Джордж Ларніколь, які займаецца ў Францыі вытворчасцю шакаладу, пабудаваў шакаладны ветразнік, які выйшаў у адкрытае мора. Даўжыня карабліка складае 3,5 метра, а важыць ён 1,2 тоны. Акрамя ўсяго іншага, на ім усталяваны рухавік.

ПАМЯЦЬ ПРА САЛОДКАЕ

Горад Вярмонт вядомы сваім марозівам Ben&Jerry's. Завод Waterbury, які належыць кампаніі па вытворчасці марозіва, з'яўляецца папулярнай турыстычнай знакамітасцю.

Кожны год спецыялісты распрацоўваюць новыя спалучэнні і смак, а тыя, якія сталі непапулярнымі, здымаюцца з вытворчасці. Каб ушанаваць іх памяць, Ben&Jerry's пабудавалі могілкі марозіва. Яны размешчаныя на ўзгорку за фабрыкай. Кожная надмагільная пліта мае ўласнае мастацкае афармленне, на якім напісаная назва марозіва, яго смак, інгрэдыенты і гады «жыцця».

КРЫЖАВАНКА «ЗДАРОЎЕ»

Склаў Валянцін НАЛІМАЎ.



Па гарызанталі: 5. Найпершае пажаданне адзін аднаму пры развітанні або прывітанне пры сустрэчы. **6.** Парушэнне нармальнай дзейнасці арганізма; недамаганне. **9.** Назва хваробы скуры з дробным свярбячым сыпам. **11.** Згустак крыві, які ўтвараецца ў крывяносным сасудзе. **12.** Згустак лімфатычнай тканкі на сценках глоткі. **15.** Полісахарыд, які ў выглядзе напою даюць у якасці лячэбнага харчавання работнікам са шкоднымі ўмовамі працы. **18.** Старэчы *** — стан поўнага ўпаду псіхафізічнай дзейнасці. **19.** Адзін з пачынальнікаў педыятрыі ў Расіі (XIX ст.), славуты ўрач. **20.** Паступовае разбурэнне цвёрдай тканкі косці зуба. **21.** Невялікая гнойная або запалёная ранка, язвачка, струп (разм.). **25.** Маршчынкі, адвісласці на скуры, напр., на шыі, шчоках. **26.** Багіня прыгажосці і кахання ў старажытнарымскай міфалогіі, імем якой названы небяспечныя хваробы, якія перадаюцца палавым шляхам. **27.** Блізарукасць на мове медыцыны. **31.** Стацыянарная ўстанова для лячэння, прафілактыкі захворванняў, адпачынку. **33.** Дзіцячая заразная хвароба, якая суправаджаецца высыпкамі на целе. **34.** Аўстрыйскі патолаг і педыятр ***, які прапанаваў дыягнастычную пробу (рэакцыю) на туберкулёз і названую яго імем. **35.** Узроставы *** — страта памяці і забыўчывасць. **36.** Хвароба-«спадарожніца» туберкулёзу, пнеўманіі, рэўматызму і г.д.

Па вертыкалі: 1. Вадкая лекавая форма з раслінай сыравіны — звычайна з кары або карэння. **2.** Славуты расійскі тэрапеўт XIX ст., заснавальнік буйной школы клініцыстаў. **3.** Салодкая садовая або дзікарослая ягада, варэнне з якой — цудоўны народны сродак супраць прастудных захворванняў. **4.** Лекавыя *** — сумесь раслінная сыравіны здробненай і адвараной. **7.** Сістэма мер, накіраваных на падтрыманне чысціні і здароўя. **8.** Адсутнасць памяці або няпоўная памяць на падзеі, выпадкі, здарэнні. **10.** Спецыяльны пругкі пояс для падтрымання асобных частак цела ў патрэбным становішчы. **13.** Частка рэцэпта з указаннем спосабу ўжывання лякарства. **14.** Хвароба, якая дакучае людзям, якія часта і доўга працуюць нахіліўшыся. **16.** Шкляная трубачка для дазіравання вадкіх лекаў па кроплях. **17.** Спецыяльны каўпачок, які надзяваецца на зуб для прадухілення яго псавання. **22.** Паўднёвая паўкустовая расліна, з лісця якой вырабляюць лякарствы супраць сардэчна-сасудзістых захворванняў. **23.** «*** № 6» — хрэстаматыйны твор А. П. Чэхава — пісьменніка з медыцынскай адукацыяй. **24.** Комплексная лячэбная ўстанова, у якой лячэнне спалучаецца з навукова-даследчай і вучэбнай работай. **28.** Востразаразная кішэчная хвароба — нярэдка эпідэмічная. **29.** Цукровы *** — хвароба, характэрная павелічэннем канцэнтрацыі цукру ў крыві і ў мачы. **30.** Лекавыя травы, карэнне, ягады — народны сродак лячэння. **32.** Славутая беларуская ўрач —афтальмолаг, Герой Сацыялістычнай Працы.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 7 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.26	18.27	11.01
Віцебск —	7.17	18.15	10.58
Магілёў —	7.16	18.17	11.01
Гомель —	7.11	18.15	11.04
Гродна —	7.41	18.42	11.01
Брэст —	7.40	18.45	11.05

Імяніны

Пр. *Івана, Уладзіміра, Ціхана, Яфрэма.*

К. *Анастасіі, Арнольда, Багдана, Вінцэнта, Людвіка, Яна.*

Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

9 кастрычніка

Дзве даты

1708 год — падчас Паўночнай вайны (1700-21 гг.) недалёка ад вёскі Лясная (сёння Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці) адбылася бітва паміж расійскімі войскамі (12 тыс. чалавек, 30 гармат) і шведскім корпусам А. Левенгаўпта (16 тыс. чалавек, 17 гармат). Расійскімі войскамі камандавалі Пётр I і А.Д. Меншыкаў. Шведскі корпус рухаўся з Ліфлянды і з абозам боепрыпасаў і харчавання на злучэнне з асноўнымі сіламі Карла XII. Сустрэўшыся з рускімі войскамі, шведы занялі пазіцыю на паўночным захадзе ад вёскі, збудаваўшы ў тыле ўмацаванне з вазоў. Бітва працягвалася 5 гадзін з пераменным поспехам, аднак шведы былі вымушаны пакінуць асноўную пазіцыю і адступіць пасля падыходу да рускіх войскаў 4-тысячнага атрада. Левенгаўпт, пакінуўшы параненых, артылерыю і абоз, адышоў да Прапойска, а затым уздоўж ракі Сож далей на поўдзень. Да Карла XII прабілася каля 4 тысяч чалавек. У бітве шведы страцілі больш 8 тыс. чалавек, рускія войскі — каля 4 тысяч.



1596 год — на Брэсцкім царкоўным саборы была прынята Брэсцкая царкоўная унія — акт аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай царквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Беларускія і ўкраінскія праваслаўныя ўладыкі прызналі вяршэнства папы Рымскага, але захавалі пры гэтым усе ранейшыя абрады. Галоўнай прычынай заключэння уніі было імкненне да кансалідацыі царкоўных і свецкіх феадалаў ВКЛ і Польшчы. Спыніла дзейнасць у 1839 годзе.

Цытата дня:

«Навука неабходная народу. Краіна, якая яе не развівае, непазбежна ператвараецца ў калонію».

Фрэдэрык Жаліо Кюры (1900—1958), французскі фізік і грамадскі дзеяч.

ЗАРУЧАЛЬНЫЯ ПЯРСЦЁНКІ

Пасля абраду шлюбу ці цырымоніі ў загсе яшчэ адным абярэгам маладых стануць пярсцёнкі.

- У больш ранняй царкоўнай традыцыі рытуалу шлюбу папярэднічаў (за некалькі тыдняў ці месяцаў) рытуал заручынаў. Пры гэтым жаніх заручаўся залатым пярсцёнкам, а нявеста — сярэбраным, што сімвалізавала сувязь паміж Сонцам і Месяцам.
- Паводле славянскай традыцыі, два пярсцёнкі (і сабе, і нявесце) купляў жаніх. Пажадана, каб пярсцёнкі купляліся ў адзін і той жа дзень у адным і тым жа месцы, што з'яўлялася добрым прадказаннем працяглага сумеснага пражывання. А вярнуўшыся дахаты пасля набыцця заручальных пярсцёнкаў, трэба было паціху сказаць: «На добрае жыццё, на добрую сям'ю».
- Нельга выкарыстоўваць заручальныя пярсцёнкі, выраблены з іншых пярсцёнкаў (бацькоўскіх, знойдзеных і т. п.) шляхам распілоўвання ці пераплаўкі, калі вы не ўпэўненыя ў інфармацыі, якую нясе гэты пярсцёнак. Акрамя гэтага, не бярыце на сябе адказнасць раз'ядноўваць тое, што было калісьці знакам яднання.
- Нельга браць шлюб удовіным пярсцёнкам ці пярсцёнкамі разведзеных бацькоў. Яны могуць пацягнуць за сабой паўтор нешчаслівага жыццёвага шляху.
- Аўдавелая жанчына (ці мужчына-ўдавец) захоўвае шлюбны пярсцёнак, але носіць яго на працягу наступных трох гадоў ужо не на правай, а на левай руцэ (для праваслаўных, у католікаў жа наадварот).
- Калі муж з жонкай разводзяцца, то заручальныя пярсцёнкі варта зняць і не насіць нават у якасці звычайнага ўпрыгожвання. Такі пярсцёнак не варта выкарыстоўваць у вясельным рытуале.
- Адной з найболей каштоўных рэліквій для маладых з'яўляюцца заручальныя пярсцёнкі, якія перадаюцца ў спадчыну, прычым, чым вышэй ступень роднасці (дзед або прадзед), тым мацнейшым ахавальным патэнцыялам яны валодаюць. Маладыя могуць браць шлюб пярсцёнкамі бацькоў толькі пры ўмове, што яны (бацькі) ужо адзначылі сярэбранае вяселле. Асабліва ўшанаванымі былі пярсцёнкі, якія перадаваліся маладым ад залатых юбіляраў (дзядуляў і бабуль).
- Заручальныя пярсцёнкі, як і вэлюм, сукенку, іншыя вясельныя атрыбуты, нельга нікому даваць прымяраць (нават сяброўкам, сёстрам). Інакш пазней у сям'і будуць сваркі.
- Лічылася, што дарыць адзін аднаму пярсцёнкі да замужжа непажадана: гэта сімвалізавала хуткае расстанне.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДА ДЗІЦЯЧАГА СТАЛА

Вясёлыя бутэрброды

Такая кветачка павінна спадабацца дзяўчаткам, а транспарт не пакіне абыякавымі хлопчыкаў.

Добры апетыт гарантаваны!

СВЕТ ЖЫВЁЛ

Коткі і сабачкі вярнуліся ў горад

Каб вяртанне гадаванца з дачы ў горад не выклікала праблем, прытрымлівайцеся нескладаных рэкамендацый.

На прыродзе жывёлы маглі падхапіць дробных паразітаў — глістоў, кляшчоў, блох, ад якіх цяпер самы час пазбавіцца. Пажадана яшчэ да ад'езду з дачы апрацаваць улюбёнца супрацьблышыным спрэем, каб шкоднікі не дакучалі ў дарозе. А вось глістоў ганяць лепш дома: калі зрабіць гэта за некалькі дзён да ад'езду, ваш сабака або кот паспее ізноў набраць паразітаў.

Вярнуўшыся дадому, перш за ўсё вымыйце жывёлу з супрацьблышыным шампунем. Мыць котку зручней усяго ў чатыры рукі — адзін трымае, другі мые. Каб паменшыць стрэс жывёлы, палівайце з коўшыка, а не з шумнага душа, і пастаянна ласкава супакойвайце свайго гадаванца. Старанна вытрыце котку і на час высыхання зачыніце ў доме ўсе фортачкі, каб ахаваць жывёлу ад скразнякоў. Пасля мыцця сабакі расчашыце поўсць, пачысціце вушы і вочы, падстрыжыце яму кіпцюры. Калі адмаўляецца даваць лапу для стрыжкі кіпцюроў, часцей хадзіце з ёй па асфальтаваных дарогах — кіпцюры сточацца самі.

Варта наведаць ветэрынара, хоць бы ў мэтах прафілактыкі. Толькі доктар можа выявіць захворванні, якія гаспадар самастойна распазнаць не ў стане. Бо сярод хвароб, атрыманых вашымі гадаванцамі на прыродзе, могуць быць небяспечныя для іх здароўя.

Калі на дачы вы кармілі свайго гадаванца гатовым кормам, пасля вяртання ў горад праблем з сілкаваннем не будзе. Не забудзьцеся толькі адкарэктаваць памер порцый, бо зараз жывёла будзе расходаваць куды менш энергі.

Зараз, калі зніклі вонкавыя раздражняльнікі ў выглядзе мышэй, насякомых, ветру і суседзяў па дачы, гадаванцу асабліва неабходна ваша ўвага. Першы час выгульвайце сабаку часцей, каб яна магла набегацца ўдосталь, як улетку. А вось з коткай больш складана — яна можа і ў акно выскачыць. Таму не забывайце зачыняць фортачкі або нацягніце сетку. І часцей гуляйце са сваёй муркай. Акрамя таго, у яе абавязкова павінны быць свае «трэнажоры» — цацачная мышка, вастрыльны слупок, інакш яна задзейнічае пад свае патрэбы шпалеры, шторы і мэблю.

-2694-

КУЛІНАРНЫ НАТАТНІК

Паста: якая яна бывае

Спагеці, фетучыні, пене, зіці... Паспрабуем разабрацца ў разнастайнасці макаронных вырабаў Італіі.

У Італіі пастай традыцыйна называюць усе макаронныя вырабы, прыгатаваныя на аснове пшанічнай мукі і вады, а таксама шматлікія стравы з іх.

Па складзе цеста паста дзеліцца на pasta di semola di grano duro (паста з цвёрдых гатункаў пшаніцы і вады) і pasta all' uovo (яечная паста). Паста з цвёрдых гатункаў мацнейшая, не раўтвараецца ў клейкую масу і падыходзіць для большасці страў італьянскай кухні. Яечная паста больш далікатная і часта гатуецца ў духоўцы (лазанья, канялоні).

Па спосабе прыгатавання дзеліцца на pasta fresca (свежая паста) і pasta secca (сухая паста). Свежая захоўваецца нядоўга і абавязкова ў халадзільніку. Сухая ж паста — звыклыя нам макаронныя вырабы ў пачках — не губляюць свае пажыўныя і смакавыя ўласцівасці больш за год. У якасці фарбавальнікаў для pasta colorata (каляровая паста) выкарыстоўваюць таматы, шпінат, моркву, бурак, чарнілы каракаціцаў, труфелі.



Па форме паста дзеліцца на 5 асноўных груп: доўгая, кароткая, дробная супавая, фігурная і з начыннем.

Spaghetti *(спагеці)* — адзін з самых распаўсюджаных відаў пасты. Сапраўдныя італьянскія спагеці — круглявыя, строга вызначанай даўжыні (ад 35 да 40 см), дыяметр сячэння 1,8-2,0 мм. Спагеціні больш тонкія, чым спагеці.

Penne *(пене)* — трубачкі дыяметрам да 10 мм і даўжынёй да 40 мм з дыяганальнымі зрэзанымі бакамі.

Tagliatelle *(тальятэле)* — доўгая, плоская яечная локшына ў форме стужкі. Адзін з самых любімых рэстаратарамі фарматаў пасты. Часта падаецца з соусам баланьезэ.

Linguine *(лінгуіні)* — пляскатае спагеці. Так што на зрэзе выглядае як вока. У адрозненне ад спагеці, лінгуіні часцей за ўсё падаецца з морапрадуктамі або соусам песта.

Fusilli *(фузілі)* — у перакладзе з італьянскага «верацяно». Кароткая паста ў форме спружынаў. Дзякуючы рыфленай паверхні выдатна трымае соус.

Lasagne *(лазанья)* — пласціны цеста, прызначаныя для фаршыроўкі і наступнага запякання. На іх аснове рыхтуецца традыцыйная італьянская страва з аналагічнай назвай. Звычайна лазанья складаецца з 6 пластоў цеста, паміж якімі змяшчаецца мясны фарш, грыбы, гародніна, а зверху — дзёрты сыр і некалькі кавалачкаў масла. Страва запякаецца ў духоўцы.

Ravioli *(равіолі)* — паста з начыннем, італьянскія «пельмені», круглай, квадратнай формы або ў выглядзе паўмесяца. Начынне можа быць мясным, рыбным, з птушкі, гародніны або садавіны.

Cannelloni *(канялоні)* — вельмі буйныя трубачкі дыяметрам да 3 см і даўжынёй да 10 см. Іх спачатку адварваюць у вадзе, затым запаўняюць начыннем (сыр, шпінат, мяса і г.д.), укладваюць у глыбокі посуд, заліваюць соусам (класічны таматны або бешамель) і запякаюць у духоўцы.

Vermicelli *(вермічэлі)* — яна ж звыклая нам «вермішэль». Тонкая, але не абавязкова кароткая паста, якую часцей за ўсё выкарыстоўваюць для супоў. Назва перакладаецца як «маленькія чарвячкі».

Maccheroni *(макароны)* — трубчастыя вырабы, могуць быць доўгімі, як спагеці, або кароткімі, як «ражкі» — пене. Так называюць абсалютна любую пасту. Галоўнае — каб у сярэдзіне яна была полая.

-2695-

Усміхнемся!

Муж прыходзіць увечары з працы:
— Жонка, дзе мой абед?
— У кулінарнай кнізе, старонка 33!
☺
Жыў-быў Спірт. Пра сваё сямейнае становішча адказваў проста: «Разведзены».
☺
Даішнік спыняе кіроўцу.
— Дыхні ў трубку!
— П-ф-ф-ф-ф-ф-ф.
— Яшчэ дыхні!
— П-ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф.
— Можаш ехаць.
— Што ж вы хацелі?
— Кола напампаваць...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4936 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12